Г. У. Малчанава



8

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ





## РАССЯЛЕННЕ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ ПЛЯМЁН НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ




Сучасная граніца Рэспублікі Беларусь

## ПОЛАЦКАЕ І ТУРАЎСКАЕ КНЯСТВЫ ў 11 ст.




- **Полацк** Цэнтры княстваў
- Віцебск Іншыя гарады
- Граніцы княстваў у канцы 11 ст.
- Сучасная граніца Рэспублікі Беларусь

Лічбай 1 на карце пазначана Польшча

Г. У. Малчанава

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

**Вучэбны дапаможнік для 8 класа
першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання**

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук
прафесара В. А. Фядосіка

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Мінск
Выдавецкі цэнтр БДУ
2015

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

УДК 94(476)(075.4)
ББК 63.3(4Беи)я72
М20

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра эканамічнай гісторыі Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» (доктар гістарычных навук загадчык кафедры *Ю. М. Бохан*);
настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі «Опсаўская дапаможная школа-інтэрнат» *М. М. Кіжло*

**Умоўныя абазначэнні:**

— пытанні і заданні перад чытаннем тэксту

— пытанні і заданні для паўтарэння і замацавання

* — ускладненыя пытанні і заданні

— практычная работа

— работа з картай

— краязнаўчы пошук

— гістарычныя вандроўкі

— цікава ведаць

*Папярэдняе выданне выйшла ў выдавецтве «Народная асвета» ў 2007 годзе.*

**ISBN 978-985-553-251-5**

© Малчанава Г. У., 2007
© Малчанава Г. У., 2015, са змяненнямі
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2015

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПРАДМОВА

## Дарагія вучні!

Вы трымаеце перад сабой вучэбны дапаможнік. Ён расказвае пра далёкае мінулае нашай Радзімы, якая завецца ***Беларусь***. Вы даведаецеся аб тым, адкуль і калі прыйшлі на зямлю Беларусі людзі. Высветліце, як паслядоўна змянялася іх жыццё. Атрымаеце звесткі пра тое, як выглядаў старажытны чалавек і чым ён займаўся. Вы даведаецеся і пра тое, як нашы **продкі**[1] бараніліся ад ворагаў, чым праславілі сваю зямлю.

Кожны чалавек павінен ведаць **гісторыю**[2] свайго роднага краю. Менавіта яна можа адказаць на шматлікія пытанні: дзе, калі і што адбывалася. Калі ведаеш, што было ў мінулым, можна лепш зразумець сучаснае жыццё, пазбегнуць памылак, уявіць, што будзе ў будучым.

Мінулае сваёй краіны вывучаюць не толькі па падручніку. Каб ведаць яе гісторыю, трэба самому цікавіцца нашым мінулым. Пазнаёміцца з гісторыяй сваёй краіны вам дапамогуць **музеі**[3]. Пабывайце разам з бацькамі, настаўнікамі, сябрамі ў **гістарычным музеі**[4]. Рэчы, якія знаходзяцца там, раскажуць вам шмат цікавага пра мінулае. Прыміце ўдзел у экскурсіях і падарожжах па гістарычных мясцінах. У час іх вы ўбачыце магутныя замкі, велічныя цэрквы, помнікі славутым людзям Беларусі. Гісторыю можна вывучаць па кнігах. Наведайце бібліятэку. У ёй вы знойдзеце шмат цудоўных кніг па гісторыі.

Цікаўцеся гісторыяй свайго сяла, горада, краіны! Шануйце багатую спадчыну далёкіх продкаў! А пачняце вы гэтую справу разам з вучэбным дапаможнікам «Гісторыя Беларусі».

Уважліва чытайце тэкст, разглядайце малюнкі, карты. Гэта дапаможа вам лепш зразумець і запомніць галоўнае ў прачытаным тэксце. Звяртайце ўвагу на словы, якія вылучаны **тлустым шрыфтам**. Унізе старонкі даецца іх тлумачэнне. Запомніце, як яны вымаўляюцца і што абазначаюць.

[1] **Про́дкі** — людзі, якія жылі на нашай зямлі ў мінулым.
[2] **Гісто́рыя** — навука, якая расказвае пра жыццё і заняткі нашых продкаў.
[3] **Музе́й** — установа, дзе назапашваюцца, захоўваюцца і выстаўляюцца для агляду розныя прадметы (экспанаты).
[4] **Гістары́чны музе́й** — установа, дзе захоўваюцца і выстаўляюцца для агляду розныя гістарычныя рэчы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Знайсці іх вы зможаце і ў «Гістарычным слоўніку», які размешчаны ў канцы падручніка. Калі пры чытанні тэксту апавядання вам сустрэнецца незнаёмае слова, звяртайцеся за тлумачэннем да настаўніка.

Гады́ вызначальных гістарычных падзей таксама вылучаюцца ў тэксце тлустым шрыфтам. У канцы падручніка яны змешчаны пад загалоўкам «Асноўныя гістарычныя даты».

У тэксце апавяданняў вы неаднаразова ўбачыце словы, вылучаныя ***тлустым курсівам***. На іх трэба звярнуць асаблівую ўвагу. Гэта імёны гістарычных асоб і дзеячаў культуры, геаграфічныя назвы, назвы дзяржаў, адзінкі вымярэння часу і іншыя важныя словы.

Кожны параграф пачынаецца з пытанняў і заданняў перад чытаннем тэксту. У канцы апавядання змешчаны пытанні і заданні для паўтарэння і замацавання. Абавязкова адкажыце на пытанні. Выканайце заданні і практычную работу. Каб лепш засвойваўся матэрыял, вы павінны папрацаваць з гістарычнай картай. Звяртайцеся, калі патрэбна, па дапамогу да настаўніка.

Заданні ў рубрыках «Краязнаўчы пошук» і «Гістарычныя вандроўкі» дапамогуць вам лепш пазнаёміцца з гісторыяй свайго роднага краю (вёскі, горада, вуліцы і г. д.). Выконвайце іх з дапамогай бацькоў і настаўніка.

Ёсць у падручніку матэрыялы, пададзеныя ў рубрыцы «Цікава ведаць». Тут змяшчаюцца звесткі, якія дапамогуць вам пашырыць свае веды.

Калі вы будзеце прытрымлівацца правіл працы з падручнікам, ён стане вам добрым сябрам у цікавым гістарычным падарожжы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# УВОДЗІНЫ

*Ад прадзедаў спакон вякоў*
*Мне засталася спадчына;*
*Паміж сваіх і чужакоў*
*Яна мне ласкай матчынай.*
*Я. Купала*

## 1. Гісторыя — навука пра мінулае

1. Што вывучае гісторыя?
2. Чаму трэба ведаць гісторыю свайго краю?
3. Хто такія продкі?
4. Дзе захоўваюцца і выстаўляюцца гістарычныя рэчы?

Усе падзеі, што адбываліся ў мінулым на Зямлі, — гэта і ёсць гісторыя. Гарады і вёскі, а таксама людзі, якія ў іх жылі раней і якія жывуць цяпер, маюць сваю гісторыю.

У старажытныя часы жыццё на Зямлі было не падобнае на сучаснае. Не было гарадоў, заводаў, самалётаў, чыгунак. Інакш выглядалі людзі, іх жыллё, адзенне.

Тое, што адбывалася раней, не знікае бясследна. «Сведкі» мінулага знаходзяцца побач з намі. Гэта старажытныя будынкі, касцёлы, цэрквы, рэшткі паселішчаў і могільнікаў, помнікі. Шмат старажытных рэчаў знойдзена вучонымі ў розных месцах Беларусі. Па іх вывучаюць гісторыю. У сваёй мясцовасці гэтыя рэчы мы можам убачыць, калі наведаем **краязнаўчы музей**[1]. У ім сабраны старажытныя прадметы побыту (посуд, адзенне і іншае), прылады працы (сярпы, косы, сякеры), зброя.

Звесткі пра тое, як жылі нашы продкі, мы атрымліваем і са старажытных кніг. Гэтыя кнігі называюцца **летапісамі**[2].

У старажытнасці год звалі «лета». Самым старажытным летапісам, дзе апавядаецца пра жыццё нашых продкаў, з'яўляецца «Аповесць мінулых гадоў».

[1] **Краязна́ўчы музе́й** — установа, дзе захоўваюцца і выстаўляюцца для агляду розныя гістарычныя рэчы таго краю, у якім ён знаходзіцца.
[2] **Ле́тапіс** — рукапісная кніга, у якой запісваліся звесткі пра гістарычныя падзеі па гадах.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ





Старонкі з летапісу

Пазнаёміцца з жыццём старажытных людзей нам дапамагаюць творы пісьменнікаў, вусная народная творчасць: песні, **паданні**[1], казкі, прыказкі і прымаўкі.

А ці задумваліся вы, чаму нашу зямлю называюць ***Беларуссю*** (Белая Русь), а людзей, якія на ёй жывуць, — ***беларусамі***? Меркаванняў наконт назвы нашай краіны шмат. Адно з іх — што нашы далёкія продкі мелі светлыя русыя валасы і былі апрануты ў белае палатнянае адзенне. Паводле другога меркавання, слова «белая» азначала «свабодная, незалежная». Белае для беларусаў — колер свабоды і чысціні.

Найвялікшы скарб Беларусі — гэта людзі. Вядомы беларускі пісьменнік Уладзімір Караткевіч пісаў пра іх так: «Жывы, разумны, працавіты і вольналюбівы беларускі народ! Беларус адрозніваецца шчодрасцю, гатоўнасцю заўсёды прыйсці на дапамогу ў бядзе».

Ці заўважалі вы, што калі беларусы гавораць пра Беларусь, то завуць яе **Радзімай**[2] або **Бацькаўшчынай**[3]? Радзіма — бо тут мы нарадзіліся, бо яна самая родная з усіх краін ва ўсім свеце. Бацькаўшчына — таму што тут жылі і шанавалі гэтую зямлю нашы бацькі, дзяды і больш далёкія продкі.

Прырода, якая нас акаляе, горад і вёска, у якіх мы жывём, — гэта ўсё наша Радзіма, наша Бацькаўшчына.

Гісторыю сваёй краіны трэба ведаць. Гэта дапаможа нам зразумець, як жылі людзі ў мінулым. Чым яны займаліся? Як баранілі і шанавалі сваю краіну? Як жывуць цяпер? Да чаго імкнуцца ў будучым?

[1] **Пада́нне** — апавяданне пра справы і ўчынкі старажытных людзей, пра заняткі нашых продкаў.
[2] **Радзі́ма** — месца, дзе нарадзіўся чалавек.
[3] **Ба́цькаўшчына** — краіна, дзе нарадзіўся чалавек і дзе жылі яго продкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Беларускі краявід

Мы павінны захоўваць усё, што засталося нам ад нашых продкаў. Адным словам — любіць і шанаваць нашу Беларусь.

Каб ведаць і разумець гісторыю, неабходна адказаць на пяць асноўных пытанняў.

1. Што адбылося?

Кожная ***гістарычная падзея*** мае сваю ***назву***.

2. Дзе адбылося?

Кожная падзея мае ***месца***, дзе яна адбывалася.

3. Калі адбылося?

Кожная падзея адбывалася ў пэўны ***час***.

4. Чаму адбылося?

Падзеі адбываюцца па розных прычынах. ***Галоўныя прычыны*** трэба абавязкова вызначаць.

5. Што было пасля падзеі?

Кожная падзея мае ***вынік***. Важна рабіць правільныя высновы з кожнай падзеі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Адкуль мы даведваемся пра жыццё людзей у далёкім мінулым?
2. Як называецца краіна, у якой мы жывём?
3. Адкуль пайшла такая назва?
4. Што мы маем на ўвазе, калі гаворым пра Беларусь: «Яна — наша Радзіма, Бацькаўшчына»?
5. На якія асноўныя пытанні адказвае гісторыя?
6. Чаму трэба ведаць гісторыю сваёй краіны?
7. Што вы чыталі пра гісторыю свайго краю?
8*. Ці можа быць паданне крыніцай гістарычных ведаў?

Падзяліце слова «летапіс» на дзве складовыя часткі. Як вы іх разумееце?

**1.** Знайдзіце на школьнай карце свету нашу краіну.
**2*.** Пакажыце на школьнай карце Беларусі мясціны (гарады, вёскі, рэкі, азёры), звязаныя з гістарычным мінулым нашай Радзімы.

**1.** Спытайце ў бацькоў, дзе ў вашай мясцовасці знаходзіцца гістарычны ці краязнаўчы музей.
**2.** Ці ёсць у вашай школе музей? Як ён называецца? Што ў ім захоўваецца?
**3.** Якія гістарычныя помнікі захаваліся ў вашым краі (горадзе, вёсцы, раёне)?

Разам з бацькамі ці класам зрабіце падарожжа ў бліжэйшае гістарычнае месца вашага краю. З якімі падзеямі звязана гэтае месца? Раскажыце.

Старадаўняе паданне пра тое, адкуль пайшлі беларусы, расказвае:

«Жыў на свеце чалавек, якога звалі Бай. Былі ў яго сыны. Надышоў час яму паміраць. Сабраў Бай сыноў і падзяліў паміж імі сваю маёмасць. Сярод іх не было толькі аднаго сына. Звалі яго Белаполем. Ён у гэты час быў са сваімі сабакамі на паляванні.

Вярнуўся Белаполь з палявання, а браты яму кажуць: „Бацька пакінуў табе сабак. Пусці іх у розныя бакі. Колькі сабакі за дзень аббягуць зямлі, уся яна і будзе тваёй“.

Белаполь так і зрабіў. Выпусціў ён птушак у розныя бакі, а за імі сабак наўздагон. Па іх слядах дзве рэчкі пацяклі: Дзвіна і Дня-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

про. На ўсёй зямлі між імі і пасяліўся Белапаль. Зямля, дзе ён пасяліўся, атрымала прыгожую назву Белая Русь, скарочана — Беларусь. Ад Белаполя і пайшлі беларусы».

## 2. Лічэнне гадоў у гісторыі

Якія адзінкі вымярэння часу вы ведаеце?

Кожны чалавек ведае **дату**[1] свайго нараджэння. Гэта не толькі дзень, калі ён нарадзіўся, але і месяц, і год. Даты даюць магчымасць вызначыць узрост чалавека. З дапамогай дат мы атрымліваем іншыя звесткі пра яго жыццё. Напрыклад, мы можам даведацца, калі чалавек пайшоў у школу, скончыў яе, пачаў працаваць. З самых важных дат, што тычацца чалавека, складаецца гісторыя яго жыцця — **аўтабіяграфія**[2].

Калі ж гаворка ідзе пра гістарычныя падзеі, то дата вызначае час, калі яны адбываліся. Кожная гістарычная падзея мае сваю дату. Даты асноўных падзей патрэбна ведаць.

Гістарычныя падзеі адбываліся ў розныя часы. Адны падзеі працягваюцца нядоўга, іншыя могуць доўжыцца шмат часу. Таму яны вымяраюцца не толькі ***гадамі***, але і больш буйнымі адзінкамі вымярэння часу. Гэта ***стагоддзі*** і ***тысячагоддзі***.

Адно стагоддзе = 100 гадоў.

Адно тысячагоддзе = 1000 гадоў, або 10 стагоддзяў.

Стагоддзе і тысячагоддзе — гэта вялікія адрэзкі часу, за якія адбываецца вельмі шмат падзей. Лічэнне часу ў гісторыі ажыццяўляецца часцей за ўсё стагоддзямі. На пісьме для зручнасці стагоддзе абазначаецца скарочана ***ст.***, а год — ***г.***

Стагоддзе заўсёды пачынаецца з першага года і заканчваецца нулявым. Напрыклад: 9 стагоддзе пачалося ў 801 годзе і закончылася ў 900 годзе, у 20 стагоддзе ўваходзяць гады ад 1901 да 2000 уключна. Каб вызначыць, у якім стагоддзі адбылася падзея, трэба ведаць яе дату. Калі лік даты меншы за тысячу, то дадаецца адзінка да першай яго лічбы. Напрыклад, 862 год. Да першай лічбы «8» трэба дадаць «1». Атрымаем лік «9». Значыць, 862 год належыць да 9 стагоддзя.

[1] **Да́та** — час, калі адбылася падзея.
[2] **Аўтабіягра́фія** — апісанне чалавекам свайго жыцця.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Стужка часу

Калі ж лік даты большы за тысячу, то адзінка дадаецца да першых дзвюх лічбаў. Напрыклад, 1905 год (19 + 1 = 20) належыць да 20 стагоддзя.

Для абазначэння стагоддзяў у гісторыі выкарыстоўваюцца не толькі ***арабскія***, але і ***рымскія*** лічбы. Напрыклад: ***9*** стагоддзе — ***IX*** стагоддзе, ***21*** стагоддзе — ***XXI*** стагоддзе.

Любую гістарычную падзею можна паказаць з дапамогай ***«стужкі часу»***. На «стужцы часу» паслядоўна адзначаюцца стагоддзі і тысячагоддзі і асноўныя гістарычныя падзеі. Такім чынам, кожная гістарычная падзея на «стужцы часу» мае сваё месца — дакладную дату.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **1 — I** | **6 — VI** | **11— XI** | **16 — XVI** | **21 — XXI** |
| **2 — II** | **7 — VII** | **12 — XII** | **17 — XVII** | |
| **3 — III** | **8 — VIII** | **13 — XIII** | **18 — XVIII** | |
| **4 — IV** | **9 — IX** | **14 — XIV** | **19 — XIX** | |
| **5 — V** | **10 — X** | **15 — XV** | **20 — XX** | |

Абазначэнне стагоддзяў у гісторыі арабскімі і рымскімі лічбамі

У гісторыі часта ўжываецца назва **эра**[1]. У лічэнні часу яна абазначае пачатковы (зыходны) момант вельмі працяглага адрэзка часу. Наша эра працягваецца ўжо два тысячагоддзі, або дваццаць стагоддзяў. Яе пачатак звязваюць з нараджэннем ***Ісуса Хрыста***. Першы год яго жыцця

[1] **Э́ра** — вялікі гістарычны перыяд, які карэнным чынам адрозніваецца ад папярэдняга.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




з'яўляецца першым годам ***нашай эры***. Калі падзеі адбываліся да нараджэння Хрыста, то кажуць, што гэта было ***да нашай эры***.

Мы — сучасныя людзі, жывём у пачатку 21 стагоддзя. Гэта значыць, што пасля нараджэння Хрыста прайшло ўжо 20 стагоддзяў нашай эры, ці 2 тысячагоддзі.

**1.** Чаму трэба ведаць гістарычныя даты?
**2*.** Якое пытанне звязана з датамі? Выберыце правільны адказ.
а) Што? б) Калі? в) Дзе? г) Як? д) Чаму?
**3.** Якія адзінкі вымярэння часу выкарыстоўваюцца ў гісторыі?
**4*.** Якімі лічбамі абазначаюць стагоддзі ў гісторыі?
**5.** У якім стагоддзі (эры) мы зараз жывём?
**6.** Як адным словам можна назваць:
а) 10 гадоў;
б) 100 гадоў;
в) 1000 гадоў?
**7.** Ад якой падзеі вядзецца адлік гадоў нашай эры?
**8.** Калі пачалася наша эра?

**1.** Адкажыце на пытанне з дапамогай тэксту параграфа. Якімі адзінкамі ў гісторыі вымяраюцца працяглыя адрэзкі часу?
**2.** Вызначыце працягласць.
*Адзін год — гэта … месяцаў, або … дзён.*
**3.** Пабудуйце лагічны ланцужок «Маё жыццё»:
год, у якім мы зараз жывём;
год майго нараджэння;
год, калі я пайшоў у школу;
год, калі я закончу школу.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**4.** Намалюйце ў сшытку сваю «стужку часу» «Мае продкі». Адзначце на ёй гады нараджэння сваіх родных.

Мой год нараджэння → бацька → дзед і бабка → прадзеды і прабабкі

Мой год нараджэння → маці → дзед і бабка → прадзеды і прабабкі

2015

**5.** Складзіце аўтабіяграфію на аснове найбольш важных дат свайго жыцця.

**6*.** Перапішыце табліцу ў сшытак. Запоўніце табліцу, перавядзіце даты ў стагоддзі і абазначце арабскімі і рымскімі лічбамі:

| **Даты** | **Стагоддзе** | |
|---|---|---|
| | **Арабскія лічбы** | **Рымскія лічбы** |
| 862 год | | |
| 1410 год | | |
| 1569 год | | |



Разам з бацькамі прасачыце гісторыю вашага роду па фотаздымках. Пацікаўцеся, у які час яны былі зроблены. Падлічыце, колькі часу яны існуюць.



Абазначэнне дат лічбамі вынайшлі ў Старажытнай Індыі. У Еўропе гэтыя лічбы сталі вядомы дзякуючы арабскім купцам. Таму яны называюцца арабскімі.

У Старажытным Рыме карысталіся сваімі лічбамі — рымскімі. Арабскімі і рымскімі лічбамі людзі карыстаюцца і па сённяшні час.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 3. Наша Радзіма на гістарычнай карце

1. Што адлюстравана на геаграфічнай карце?
2. Пакажыце на карце рэкі, азёры, узвышшы, нізіны і іншыя геаграфічныя аб’екты. Якімі колерамі яны адзначаны?
3. Вызначыце месцазнаходжанне нашай краіны на карце Еўропы.
4. Пакажыце на карце Рэспубліку Беларусь.
5. Пакажыце на карце тэрыторыі абласцей Беларусі і гарады, якія з’яўляюцца іх цэнтрамі.

Чалавек здаўна стаў ствараць карты. Яны дапамагалі нашым продкам арыентавацца ў падарожжах. З імі чалавек не збіваўся са шляху пры пераездзе з аднаго населенага пункта ў другі. На картах абазначаліся таксама рэкі, азёры, лясы. З цягам часу карты станавіліся больш дакладныя. На адной са старажытных картаў былі пазначаны гарады Мінск, Мазыр, Полацк, Віцебск, рэкі Прыпяць, Дняпро, Бярэзіна, Пціч. Гэтыя геаграфічныя аб’екты існуюць і сёння.

Вывучаючы гісторыю, мы павінны ведаць не толькі тое, калі адбываліся падзеі, але і дзе, у якім месцы. У гэтым нам дапамагае ***гістарычная карта***. Без яе таксама немагчыма ўявіць тэрыторыю, дзе жылі нашы продкі. З яе дапамогай мы даведваемся пра шляхі зносін паміж людзьмі, гандлёвыя шляхі, напрамкі ваенных дзеянняў. Гістарычная карта з’яўляецца вельмі важным сродкам вывучэння гісторыі.

Кожная гістарычная карта мае сваю назву. У гэтай назве адлюстраваны час, калі адбываліся падзеі. На карце паказаны розныя гістарычныя аб’екты. З дапамогай умоўных абазначэнняў мы знаходзім гарады, сталіцы і межы дзяржаў, напрамкі ваенных паходаў, месцы бітваў і іншае. Назвы краін і гарадоў адпавядаюць таму гістарычнаму перыяду, які адлюстраваны на карце. Колеры выкарыстоўваюцца для абазначэння тэрыторый розных дзяржаў.

Гістарычныя карты ствараюцца і сёння. Мы можам параўнаць даўнюю і сучасную карты. Тады заўважым, што тэрыторыя пражывання нашых продкаў, гарады і іншыя паселішчы беларусаў за доўгія стагоддзі не змяніліся. Як і ў мінулым, Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы. Нашымі суседзямі з’яўляюцца Літва, Латвія, Польшча, Расія, Украіна. Самая працяглая мяжа ў Беларусі з Расіяй. Даўжыня яе складае болей за 1000 кіламетраў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Старажытная карта

Каб навучыцца «чытаць» гістарычную карту, неабходна ведаць наступныя правілы.

1. Знаёмства з картай пачынайце з яе назвы. З назвы вы даведаецеся, калі адбываліся падзеі.

2. Звярніце ўвагу на ўмоўныя абазначэнні. Яны адпавядаюць зместу карты.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Умоўныя абазначэнні

### *Рэкі і азёры*

*Нёман* Рака і яе назва

*Назвы рэк на картах размяшчаюць уздоўж рэк.*

*воз. Нарач* Возера і яго назва

*Рэкі, азёры і іх назвы на картах паказваюць сінім або блакітным колерам.*

Назва дзяржавы




*Тэрыторыі дзяржаў на картах паказваюць рознымі колерамі.*

### *Гарады*

◉ **МІНСК** Сталіцы

◎ **Гродна** Цэнтры абласцей

○ Полацк Іншыя гарады

*Гарады на картах звычайна паказваюцца кружкамі, а іх назвы падпісваюцца чорным колерам.*

### *Граніцы*

—·—·— Граніцы дзяржаў

– – – – – Граніцы абласцей

*Граніцы на картах звычайна паказваюцца рознымі па малюнку пункціржнымі лініямі.*

### *Іншыя абазначэнні*

Напрамкі паходаў войскаў

*Процілеглыя бакі паказваюцца рознымі колерамі.*

✕ 1410
✕ 1500 Месцы і даты бітваў

*Колерам звычайна паказваецца бок, які перамог у бітве.*

Аблога гарадоў войскамі

*Колер знака адпавядае колеру боку, які абложваў горад.*

На картах некаторыя словы скарачаюцца. Найбольш часта ўжываюцца скарачэнні:

в. — востраў;
воз. — возера;
Зах. — Заходні;
Паўд. — Паўднёвы.

Прыклады ўмоўных абазначэнняў на гістарычнай карце

3. Звярніце ўвагу на колеры, якія ёсць на карце. Вы даведаецеся, на тэрыторыі якіх дзяржаў адбыліся гістарычныя падзеі.

Вывучайце гісторыю з дапамогай гістарычнай карты.

**?**

1. Для чаго чалавек пачаў ствараць карты?
2. Для чаго патрэбна гістарычная карта?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Што адлюстроўвае гістарычная карта?

**4.** Што выкарыстоўваецца для перадачы зместу карты? Выберыце правільны адказ:
а) тэкст; б) умоўныя абазначэнні; в) малюнкі.
Растлумачце свой адказ.

**5.** Працягніце сказы.
*Складаць карты людзі пачалі (калі?) … .*
*Гістарычная карта паказвае (што?) …, дзе адбываліся падзеі.*



**1*.** Параўнайце гістарычную карту з геаграфічнай.
Чым гістарычная карта адрозніваецца ад геаграфічнай?
Знайдзіце на геаграфічнай карце аб’екты (рэкі і гарады).
Пакажыце гэтыя ж аб’екты на гістарычнай карце.

Якія колеры выкарыстоўваюцца для абазначэння гістарычных і геаграфічных аб’ектаў (рэк, азёр, дзяржаў)?

Якімі ўмоўнымі знакамі паказаны гарады на гістарычнай карце?

Якімі правіламі трэба кіравацца пры паказе розных аб’ектаў на карце?

Пакажыце, у якіх напрамках цякуць рэкі Беларусі. Суправаджайце паказ выразамі: «з усходу на захад», «з поўначы на поўдзень» і г. д.

Пакажыце на школьнай карце свету, дзе размешчана наша краіна.

Вызначыце па карце, з якімі краінамі мяжуе Беларусь.

На палітыка-адміністрацыйнай карце, змешчанай на форзацы вучэбнага дапаможніка, пакажыце і назавіце беларускія гарады, якія знаходзяцца:
а) на поўначы;
б) на поўдні;
в) на захадзе;
г) на ўсходзе;
д) у цэнтральнай частцы Беларусі.

**2*.** Ці можа сучасная карта быць гістарычнай?

Знайдзіце на палітыка-адміністрацыйнай карце на форзацы ваш населены пункт.
У якой частцы Беларусі ён знаходзіцца?
Вызначыце па карце, паблізу якіх рэк і гарадоў знаходзіцца населены пункт, у якім вы жывяце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У старажытныя часы праз тэрыторыю Беларусі праходзіў гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Рэкі Нёман, Заходняя Дзвіна і Дняпро злучалі паміж сабой Балтыйскае мора на поўначы з Чор-




Шлях «з варагаў у грэкі»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ным морам на поўдні. На берагах Балтыйскага мора жылі вара-гі — продкі сучасных шведаў, нарвежцаў і датчан. А праз Чорнае мора можна было нават трапіць у Грэцыю — на радзіму Алімпій-скіх гульняў. Аднак на гэтым шляху была адна перашкода. Не існа-вала прамога воднага праходу ад Нёмана і Заходняй Дзвіны да Дняпра. Таму лодкі і караблі гандляры перацягвалі волакам па зямлі.

З цягам часу чалавек перамог гэтую перашкоду. Ён пачаў бу-даваць каналы паміж рэкамі. Яны дапамаглі стварыць адзіны вод-ны шлях ад Балтыйскага да Чорнага мора. Так, напрыклад, з'явіў-ся Аўгустоўскі канал. Ён зараз адноўлены, і многія падарожнікі маюць магчымасць захапляцца яго прыгажосцю.

Прасачыце па гістарычнай карце, праз якія рэкі праходзіў шлях «з варагаў у грэкі».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 4. Першыя паселішчы ў Беларусі

Якія буйны́я рэкі працякаюць на тэрыторыі нашай краіны? Пакажыце іх на карце.

У далёкім мінулым на Зямлі шмат разоў значна мяняўся клімат. Працяглыя пахаладанні чаргаваліся з пацяпленнямі.

У час пахаладанняў **ледавік**[1] амаль поўнасцю пакрываў тэрыторыю Беларусі. У некаторых месцах таўшчыня лёду складала амаль 2 кіламетры. Такія ўмовы не спрыялі жыццю чалавека.

У час пацяпленняў ледавік адступаў. Навакольны свет змяняўся. Ад раставання ледавіка з’явіліся рэкі і азёры. Пачала распаўсюджвацца разнастайная расліннасць. Выраставі бярозавыя, асінавыя і яловыя лясы. На гэтыя землі прыходзілі разнастайныя жывёлы. Яны прыстасоўваліся да халоднага клімату, які паступова цяплеў.

Але потым, праз шмат гадоў, з новым наступленнем ледавіка пачыналася новае пахаладанне. Зноў змяняўся раслінны і жывёльны свет. Здаралася, што холад і вечная мерзлата ахоплівалі нават поўдзень Беларусі. Ледавікі цягнулі з сабой на тэрыторыю Беларусі камяні, жвір, пясок і гліну.

***Больш за 30 тысяч гадоў таму***, калі пачалося чарговае пацяпленне, на тэрыторыю Беларусі прыйшлі людзі. Яны ішлі з поўдня ўслед за жывёламі, на якіх палявалі. Спачатку свае **стаянкі**[2] першабытныя людзі размяшчалі ўздоўж буйны́х рэк: Прыпяці, Дняпра, Сожа, на берагах азёр. У рэках і азёрах вадзілася шмат рыбы, якой старажытны чалавек харчаваўся. Паступова людзі асвойвалі новыя землі.

Найбольш старажытныя стаянкі на тэрыторыі Беларусі знойдзены каля вёсак Бердыж (на рацэ Сож) і Юравічы (на рацэ Прыпяць). Ім ***каля 25 тысяч гадоў***.

Першабытны чалавек быў моцны, дужы і вынослівы. Людзі прыстасаваліся да жыцця ў тагачасных умовах. У гэтым ім дапамагло сумеснае жыццё. Зямля, лясы і рэкі давалі людзям прытулак і ежу.

[1] **Ледаві́к** — велізарныя рухомыя масы лёду.
[2] **Стая́нка** — неўмацаванае паселішча першабытных людзей.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Першыя стаянкі на тэрыторыі Беларусі

Жыццё першабытных людзей было нялёгкае. Найперш яно залежала ад паспяховасці палявання на звяроў. Калі паляванне было няўдалым, чалавек галадаў. Акрамя таго, ён мог загінуць у час палявання, памерці ад ран і хвароб. Ад цяжкіх умоў жыцця асабліва пакутавалі дзеці. Сярэдняя працягласць жыцця першабытнага чалавека была крыху большаю за 20 гадоў.

Аднак першабытны чалавек прыкладаў вялікія намаганні, каб палепшыць умовы свайго жыцця. Паступова людзі навучыліся рабіць прылады працы з каменю. Для дадзенай справы найбольш падыходзіў ***крэмень***. Гэта вяло да змен у побыце, гаспадарчых занятках, стасунках паміж людзьмі.

1. Што такое ледавік?
2. Калі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся першыя людзі?
3. Якія месцы яны выбіралі для сваіх паселішчаў? Чаму?
4. Раскажыце пра ўмовы жыцця старажытных людзей.
5. Чаму працягласць жыцця тагачаснага чалавека была невялікая?
6. З якога каменю чалавек навучыўся рабіць прылады працы? Выберыце правільны адказ:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

а) з граніту;
б) з крэменю;
в) з мармуру.

**7*.** Паразважайце над наступнымі пытаннямі.

Чаму ледавік рухаўся з поўначы, а не з поўдня?

Чаму найстаражытнейшыя людзі прыйшлі на тэрыторыю Беларусі з поўдня, а не з поўначы?

Чаму на тэрыторыі Беларусі шмат камянёў?

Разгледзьце малюнак унізе. Як выглядаў старажытны чалавек? Раскажыце.

Разгледзьце картасхему на с. 20. Пакажыце на ёй буйны́я рэкі Беларусі, уздоўж якіх сяліліся нашы продкі (Нёман, Заходняя Дзвіна, Дняпро, Прыпяць). Знайдзіце першыя стаянкі людзей. Якія гарады знаходзяцца сёння паблізу гэтых месцаў?

Ці ёсць звесткі пра старажытныя паселішчы ў вашай мясцовасці? Што вы пра іх ведаеце? Раскажыце.



Першабытныя людзі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Напэўна, вы трымалі ў руках камень, які завецца крэмень. У Беларусі ёсць цэлыя радовішчы крэменю. Гэты камень з'яўляецца карысным выкапнем. Крэмень лёгка расшчапляецца на вострыя кавалкі. Ён вельмі моцны і цвёрды. Да нядаўняга часу ім рэзалі нават шкло. Такія карысныя якасці людзі заўважылі са старажытнасці. Менавіта з крэменю першабытны чалавек рабіў прылады працы.

Каля вёскі Абідавічы Быхаўскага раёна на Магілёўшчыне пад абрывам берага Дняпра вучоныя знайшлі вялізны адшчэп крэменю. Ён быў апрацаваны рукой чалавека і выкарыстоўваўся ім як прылада працы.

Старажытныя людзі выраблялі прылады працы пераважна з каменю. Таму час, калі гэта адбывалася, вучоныя называюць каменным векам.

## 5. Асаблівасці жыцця першабытных людзей

1. Якімі былі ўмовы жыцця старажытных людзей?
2. Што пагражала жыццю першабытных людзей?
3. Якія месцы для жылля выбіраў старажытны чалавек і чаму?
4. Што такое стаянка першабытнага чалавека?
5*. Паразважайце, чаму найбольш старажытныя стаянкі знойдзены на поўдні, а не на поўначы Беларусі.

Дзякуючы працы **археолагаў**[1] стала вядома, якім было жыллё першабытнага чалавека. Для пасялення чалавек выбіраў узвышаныя і цяжкадаступныя для дзікіх жывёл мясціны. Яго прывабліва блізкасць вады, багацце жывёльнага свету, сухое месца для жылля. У наш час рэшткі старажытнага жылля знойдзены на многіх стаянках.

Спачатку яно было падобнае на будан (шалаш). Сцены рабіліся з буйны́х касцей жывёл. Зверху жыллё пакрывалася шкурамі. У сярэдзіне яго знаходзілася абкладзенае камянямі вогнішча, дзе ўвесь час гарэў агонь. Вогнішчы для прыгатавання ежы маглі размяшчацца і знадворку. У такім збудаванні наш далёкі продак мог схавацца ад непагадзі, дзікіх звяроў, адпачыць і падсілкавацца.

У выпадку ўдалага палявання ў старажытных людзей з'яўляліся запасы ежы. Каб іх захаваць, людзі рабілі побач з жыллём ***ямы-сховішчы***.

[1] **Архео́лагі** — вучоныя, якія вывучаюць жыццё старажытных людзей па прадметах побыту, знойдзеных у час раскопак.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Жыллё старажытнага чалавека

Гэта выратоўвала тагачасных людзей у галодныя часы. Так чалавек атрымаў магчымасць больш працяглы час знаходзіцца на адным месцы.

Першабытныя людзі жылі не паасобку, а групамі. Гэтыя групы называліся **родавымі абшчынамі**[1]. Усе члены такой абшчыны былі блізкімі сваякамі. Яны складалі адзін ***род***. Людзі мелі агульнае жыллё, ежу, прылады працы. Чалавек ведаў, што ў адзіночку ён будзе бездапаможны і загіне. Таму ў родавай абшчыне ўсіх яднала пачуццё згуртаванасці і ўзаемнай дапамогі. Жыллё родавай абшчыны будавалася вялікіх памераў. Яно магло складацца з некалькіх паглыбленых у зямлю памяшканняў. Памяшканні рабіліся авальнай формы, пасярэдзіне раскладвалася вогнішча.

Спачатку стаянкі першабытных людзей былі невялікія. Яны ўключалі некалькі збудаванняў і ям для захавання запасаў ежы. Існавалі

[1] **Ро́давая абшчы́на** — група блізкіх сваякоў, якая вяла агульную гаспадарку і займала асобнае паселішча.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Прылады працы (скрэблы, скрабкі)



Зброя першабытнага чалавека: дубіна, дзіды



Каменныя сякеры, прымацаваныя да драўляных ручак

такія стаянкі да таго часу, пакуль у гэтай мясцовасці людзі маглі здабываць сабе харчаванне. З цягам часу некаторыя стаянкі ператвараліся ў сталыя паселішчы.

Нашы продкі ішлі на паляванне са зброяй. Яны палявалі на звяроў з завостранымі палкамі, камянямі і драўлянымі **дубінамі**[1]. Людзі выкарыстоўвалі таксама **востраканечнікі**[2], якія рабілі з кавалкаў крэменю. Іх завострывалі з аднаго канца, а другі канец выконваў ролю ручкі.

Часам востраканечнік прымацоўвалі да палкі. Такім чынам атрымлівалася **дзіда (кап'ё)**[3].

Востраканечнікамі таксама разразалі тоўстую шкуру жывёлы. Імі свідравалі адтуліны ў драўніне і костках.

З абабітага каменю (найчасцей крэменю) першабытныя людзі рабілі **скрэблы, скрабкі**[4] і многія іншыя прылады працы. Скрэблы і скрабкі чалавек выкарыстоўваў для апрацоўкі шкур. З апрацаваных шкур жывёл чалавек рабіў сабе адзенне, якое ахоўвала яго ад сцюжы. Імі людзі таксама пакрывалі сваё жыллё.



[1] **Дубі́на** — старажытная зброя.
[2] **Востраканéчнік** — каменная прылада працы з завостраным канцом.
[3] **Дзі́да (кап'ё)** — зброя першабытнага чалавека.
[4] **Скрэ́бла, скрабóк** — прылады працы першабытнага чалавека, якія выкарыстоўваліся для рэзання і скрабення.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Здабыванне агню з дапамогай трэння сухога дрэва. Спосабы здабывання агню:
а) скрабенне;
б) пілаванне;
в) свідраванне

Першабытны чалавек не адразу ўмеў карыстацца агнём. Доўгі час яму быў даступны толькі агонь, які ўзнікаў ад маланкі. З часам чалавек заўважыў, што, калі церці адзін кавалак сухога дрэва аб другі, з'яўляюцца іскры. Чалавек прарабіў гэта не адзін раз і нарэшце здабыў агонь. Людзі навучыліся атрымліваць агонь таксама шляхам свідравання. Яны самі вынаходзілі разнастайныя спосабы здабывання агню. Каб было зручней, чалавек зрабіў для гэтага спецыяльныя прылады.

Авалоданне агнём, паляпшэнне прылад працы дапамаглі чалавеку жыць лепей. Людзям стала прасцей выжываць у тагачасных нялёгкіх умовах. У сувязі з гэтым павялічылася і працягласць жыцця чалавека.

?

**1.** Раскажыце, як выглядала жыллё першабытнага чалавека.
**2.** Што такое родавая абшчына?
**3.** Якімі былі першыя прылады працы ў першабытнага чалавека?
**4.** З чаго выраблялiся першыя прылады працы?
**5.** З якой зброяй хадзіў на паляванне першабытны чалавек?
**6.** Раскажыце, як чалавек авалодаў агнём.
**7*.** Якую карысць прынёс агонь людзям?
**8.** З якіх матэрыялаў старажытны чалавек вырабляў прылады працы? Напішыце:
востраканечнік — …,
дзіда — …,
скрабок — …,
дубіна — … .
Чаму чалавек выкарыстоўваў гэтыя матэрыялы для іх вырабу?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

9. Для чаго выкарыстоўваўся востраканечнік, скрэблы і скрабкі, дзіда, дубіна?
10. Што дапамагло тагачаснаму чалавеку палепшыць умовы жыцця?

Разгледзьце малюнак на с. 23. Складзіце апавяданне пра асаблівасці побыту першабытнага чалавека.
Як выглядала жыллё першабытнага чалавека?
З чаго яго будавалі?
Чым накрывалі?
Што знаходзілася ўнутры жылля?

Наведайце краязнаўчы музей. Пазнаёмцеся з прыладамі працы, якія выкарыстоўваў першабытны чалавек у вашай мясцовасці. Раскажыце пра іх.

Вёска Юркавічы на Гомельшчыне стала знакамітай не толькі ў межах Беларусі. На невялікім узвышшы сярод заліўнога луга археолагі пачалі весці раскопкі. Неўзабаве даследчыкі знайшлі мноства прадметаў старажытнага часу. Гэта былі крамянёвыя нажы, скрэблы, наканечнікі стрэл і коп’яў, сякеры і вялікая колькасць чарапкоў аздобленага посуду. Даследчыкам стала вядома, што цела нябожчыка спальвалі на вялікім вогнішчы. А тыя рэчы, што былі пахаваны разам з прахам, шмат расказвалі пра жыццё сваіх былых гаспадароў. Так, у адным з пахаванняў разам з крамянёвым нажом і шасцю крамянёвымі наканечнікамі стрэл ляжала каменная булава. У ёй была прасвідравана адтуліна для ручкі. Такая булава з’яўляецца адзнакай улады. Відавочна, што гэты чалавек кіраваў у сваім родзе.

## 6. Асноўныя заняткі першабытных людзей

1. Якія месцы для жылля выбіралі першабытныя людзі?
2. Чаму першабытныя людзі сяліліся каля вады?
3. З якой прычыны першабытныя людзі жылі не паасобку, а групамі? Як называліся гэтыя групы?

Спачатку чалавек мог існаваць толькі дзякуючы прыродзе. Нашы далёкія продкі атрымлівалі ад яе ўсё неабходнае для жыцця. Чалавеку


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

патрэбны былі ежа, адзенне і жыллё. Таму асноўнымі заняткамі першабытных людзей сталі ***паляванне,*** **збіральніцтва**[1] і ***рыбалоўства***.

Паляванне на дзікіх звяроў (**маманта**[2], аленя, лася і іншых) было нялёгкай і небяспечнай справай. На яго ішлі вялікімі групамі. Людзі высочвалі звера па слядах і ўчынялі аблаву на яго. Вялікага звера заганялі ў роў, балота, лоўчыя ямы. Ямы часцей за ўсё капалі на шляху жывёлы да вады. Затым звера забівалі камянямі і дзідамі.

З часам першабытны чалавек пачаў выкарыстоўваць у паляванні на звяроў і птушак ***лук***. Стрэлы для лука былі драўляныя з каменным наканечнікам. Дзякуючы гэтаму людзі маглі цяпер паляваць невялікімі групамі і нават паасобку.

Паляванне на дзікіх звяроў давала нашым продкам не толькі ежу. Косці забітых жывёл і шкура выкарыстоўваліся ў будаўніцтве жылля. З касцей звяроў выраблялі і розныя прылады працы. Акрамя адзення са шкуры забітых звяроў рабілі абутак. Паляванне было заняткам мужчын.

Старажытныя людзі атрымлівалі ад прыроды яе шчодрыя дары ў гатовым выглядзе. У лесе людзі збіралі ягады, грыбы, арэхі, жалуды. Ужывалі ў ежу карані розных раслін. Каб іх выкапаць, выкарыстоўваліся вострыя палкі, рогі жывёл. Нашы продкі ўжывалі ў ежу таксама



Паляванне на маманта

[1] **Збіра́льніцтва** — здабыванне старажытным чалавекам гатовых дароў прыроды.
[2] **Ма́мант** — вымерлая буйна́я жывёла, падобная да сучаснага слана.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Заняткі жанчын і дзяцей

дзікае шчаўе, крапіву, цыбулю, лебяду. Збіральніцтва было заняткам жанчын і дзяцей. Акрамя таго, жанчыны вялі хатнюю гаспадарку, падтрымлівалі агонь, даглядалі дзяцей.

Дзяцей рана прывучалі дапамагаць дарослым. Гульні хлопчыкаў былі падобныя на вучобу. Хлапчукі, напрыклад, кідалі палкі накшталт дзідаў (коп’яў), стралялі з лука. Усё гэта дапамагала ім падрыхтавацца да дарослага жыцця.

Рыбалоўства было адным з надзейных спосабаў здабывання ежы. Нашы далёкія продкі ведалі розныя спосабы лоўлі рыбы. Спачатку яе лавілі ў асноўным рукамі. Рыбу і ракаў лавілі ў норах, на мелкаводдзі. Затым першабытны чалавек стаў рабіць **гарпуны**[1] з каменю і косці. Пазней людзі пачалі чапляць на вуды касцяныя кручкі. Рыбалоўныя кручкі, зробленыя з касцяных пласцінак, знойдзены пры раскопках стаянак старажытнага чалавека.

Для рыбалоўства выкарыстоўвалі лодкі (чаўны). Яны выдзёўбваліся з суцэльнага ствала дрэва — найчасцей з дубу або хвоі. З лодак старажытныя рыбаловы кідалі гарпуны або лавілі рыбу на вуды. Праз некаторы час чалавек навучыўся перагароджваць невялічкія рэчкі плятнямі і сеткамі. У сеткі трапляла рыба. Сеткі плялі з лыка — маладой кары ліпы ці лазы.

[1] **Гарпу́н** — востры зубчасты наканечнік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Першабытны чалавек ласаваўся пчаліным мёдам. Ён браў яго ў пчаліных гнёздах, што месціліся ў дуплах дрэў. Спачатку чалавек знішчаў знойдзенае гняздо з пчоламі, калі забіраў мёд. Пазней ён навучыўся ахоўваць дзікіх пчол і іх гнёзды. Так узнікла **бортніцтва**[1]. Паступова людзі прывучылі пчол насіць мёд у вуллі-борці, якія рабілі з тоўстых калод. Ставілі іх на дрэвах, каб не дастаў мядзведзь.

Справы знаходзіліся і дарослым, і малым. Дзеці пачыналі выконваць працу з трох-чатырох гадоў. Старэйшыя людзі перадавалі свой вопыт моладзі.



Лоўля рыбы гарпуном

1. Назавіце асноўныя заняткі першабытных людзей.
2. Якія прылады выкарыстоўвалі мужчыны на паляванні?
3. Пералічыце спосабы лоўлі рыбы, якія ведалі нашы продкі.
4. Якія прылады выкарыстоўвалі пры лоўлі рыбы?
5. Адкуль вучоныя даведаліся, што далёкія продкі лавілі рыбу вудамі?
6. Што такое бортніцтва?
7*. Якія з заняткаў нашых далёкіх продкаў захаваліся да нашых дзён? Чым яны адрозніваюцца цяпер? Паразважайце.
8. Чым харчаваліся першабытныя людзі? Пералічыце.
9. Чым адрозніваліся заняткі мужчын, жанчын і дзяцей?

1. Разгледзьце малюнак на с. 27 і складзіце расказ пра паляванне першабытных людзей на мамантаў. Што вы ведаеце пра мамантаў? На якую сучасную жывёлу падобны мамант? Якіх ён быў памераў?
2. З дапамогай малюнкаў на с. 28, 29 складзіце расказ пра асноўныя заняткі першабытнага чалавека.

[1] **Бо́ртніцтва** — развядзенне пчол з мэтай атрымання мёду.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вы ўжо ведаеце, што нашы далёкія продкі выраблялі з каменю розныя карысныя прылады. Каменне паўсюль шмат, але для вырабу прылад найбольш падыходзіць крэмень. Не ўсюды чалавек мог знайсці крэмень на паверхні зямлі. Да таго ж гэты камень, калі ён знаходзіцца на паверхні, часта высушаны сонцам. Яго цяжэй апрацоўваць. Таму людзі пачалі здабываць крэмень у глыбіні зямлі. Яны выявілі, што камяні высокай якасці трэба шукаць у пластах крэйды. Выкапаны з зямлі крэмень лёгка і зручна апрацоўваць.

Для здабычы крэменю капалі невялікія ямы. Затым ямы паглыбляліся і рабіліся падобнымі да калодзежаў. Гэта і былі старажытныя ***шахты***. Такія шахты былі знойдзены каля пасёлка Красасельскі на Ваўкавышчыне. Яны зусім не падобныя на сучасныя. Глыбіня шахты складала 3—5 метраў. Здабыты крэмень складвалі ў мяшок. Затым яго выцягвалі на вяроўцы наверх. Людзі, якія займаліся здабычай крэменю ў шахтах, былі першымі ***«шахцёрамі»***. Гэтую нялёгкую працу яны рабілі з дапамогай нескладаных прылад: капалак, малаткоў, кірак.

Шахты старажытных здабывальнікаў крэменю былі знойдзены пры распрацоўцы крэйдавых кар'ераў. Даследчыкі падлічылі, што тут прабіта каля тысячы шахтаў. Усе яны зараз засыпаны зямлёй ці пяском. Некаторыя шахты археолагі расчысцілі. Цяпер у іх можна спусціцца. Там засталіся сляды на крэйдзе ад касцяных кірак. Можна пабачыць і сажу ад вогнішчаў, якія палілі тут жа першабытныя «шахцёры», каб асвятляць прастору. Шахты ўзяты пад ахову дзяржавы як важныя гістарычныя помнікі.

## 7. Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі

1. Дзе знойдзены найбольш старажытныя паселішчы першабытнага чалавека на тэрыторыі Беларусі? Пакажыце на карце.
2. Якімі былі асноўныя заняткі першабытных людзей?

Карэнныя змены ў жыцці людзей пачаліся, калі яны навучыліся рабіць прылады працы і зброю з металу. Працаваць імі было значна лягчэй і хутчэй. Каб атрымаць метал, людзі навучыліся плавіць жалезную руду. Жалезная руда з'яўляецца карысным выкапнем. Радовішчы



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Выкарчоўка лесу пад раллю

яе ў Беларусі вядомы з даўняга часу. Жалезную руду плавілі ў печах-домніцах. Недалёка ад Заслаўя Мінскага раёна захаваліся рэшткі старажытнай домніцы. Печка невялікіх памераў рабілася з гліны. Калі кавалкі руды плавіліся, іх прыносілі ў ***кузню***. У кузні іх адбівалі цяжкімі молатамі. Так атрымлівалі жалеза, з якога рабілі больш зручныя прылады працы, зброю, прадметы быту.

З’явіліся і новыя заняткі — **земляробства**[1] і **жывёлагадоўля**[2].

Земляробства было цяжкаю справай. Аднаму чалавеку не пад сілу высякаць участак зямлі пад раллю, карчаваць вялізныя пні дрэў. Таму сумесная праца людзей па-ранейшаму была неабходнасцю. Нашы продкі рыхтавалі пад пасевы невялікія ўчасткі ў поймах рэк. Для гэтага яны сумесна высякалі дрэвы і выкарчоўвалі пні, а потым спальвалі іх. Пасля апрацоўвалі поле ***бараной***. Яе рабілі з сукаватага дрэва. Таму гэта прылада называлася **бараной-сукаваткай**[3]. Чалавек навучыўся араць зямлю драўляным ***ралам***.

[1] **Земляро́бства** — вырошчванне чалавекам культурных раслін.
[2] **Жывёлагадо́ўля** — развядзенне чалавекам свойскай жывёлы.
[3] **Барана́-сукава́тка** — земляробчая прылада працы для баранавання поля, выробленая з сукаватага дрэва.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Барана-сукаватка



Крамянёвыя сярпы



Саха

Пазней для ўзрыхлення (разворвання) глебы сталі выкарыстоўваць **саху**[1] і ***плуг***. Цягнуў гэтыя землябробчыя прылады бык ці конь. Ураджай жалі вострымі **сярпамі**[2]. Атрыманае зерне малолі на муку ў **каменных жорнах**[3].

Старажытныя землябробы сеялі жыта, пшаніцу, ячмень, грэчку, проса, боб, каноплі, лён, гарох, цыбулю, рэпу.

Акрамя таго, людзі пачалі прыручаць дзікіх жывёл. Паляўнічыя часам прыносілі да жылля маладых звяркоў. Яны даглядалі іх і вырошчвалі. Дзікія жывёлы станавіліся зусім свойскімі. Так разам з землябробствам стала развівацца жывёлагадоўля.

Першым прыручылі сабаку. Неўзабаве ён стаў надзейным сябрам і памочнікам паляўнічага. Сабака папярэджваў чалавека аб небяспецы і высочваў звяроў.

Потым людзі перайшлі да развядзення іншых жывёл. У гаспадарках гадавалася разнастайная жывёла: свінні, козы, каровы, авечкі, коні. Жывёлагадоўля зрабіла чалавека больш незалежным ад прыроды. Ён меў гатовыя запасы харчавання. Быкоў і коней чалавек выкарыстоўваў як цяглавую рабочую сілу.

У гэты час жыллё пачалі будаваць з дрэва. Пасяленне з некалькіх драўляных збудаванняў часта абгароджвалася тынам з высокіх жэрдак. Такое паселішча называлася **гарадзішча**[4]. У ім жыло некалькі сем’яў. Яно надзейна абараняла чалавека ад чужых людзей і дзікіх звяроў.

[1] **Саха́** — прылада для апрацоўкі зямлі.
[2] **Серп** — прылада працы для збору ўраджаю.
[3] **Каме́нныя жо́рны** — прылада з двух абчэсаных камянёў для памолу зерня.
[4] **Гарадзі́шча** — старажытнае ўмацаванае паселішча.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Гарадзішча

Нашы продкі навучыліся вырабляць тканіну. Для гэтага выкарыстоўвалі ***кросны*** — ткацкі станок. Ткацтвам займаліся жанчыны. Кашулі рабілі з лёну і воўны, абутак — са скуры ці з кары ліпы або лазы ***(лапці)***.



Прылады працы



Кросны



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Заняткі ўсходніх славян

З часам дзякуючы выкарыстанню металічных прылад працы жыццё людзей палепшылася, а іх колькасць павялічылася. Замест родавых абшчын з'явіліся **плямёны**[1]. Яны аб'ядноўвалі некалькі родаў, якія паходзілі ад аднаго продка, мелі адну мову і месца пражывання.

З цягам часу на тэрыторыі нашай краіны рассяліліся плямёны ***ўсходніх славян***. Гэтыя плямёны мелі назвы крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў.

Існуе паданне, што адно славянскае племя з правадыром Крывам пасялілася на землях ад вярхоўя Нёмана да Заходняй Дзвіны. Ад імя правадыра гэтае племя атрымала назву ***крывічы***. Аднак такая назва магла паходзіць і ад слова «крэўныя» — родныя па крыві.

Частка крывічоў будавала сваё жыллё там, дзе Заходняя Дзвіна злівалася з рэчкай Палатой. Жыхары тых мясцін сталі звацца палачанамі. Цяпер на гэтых землях знаходзяцца гарады Полацк і Віцебск.

[1] **Пле́мя** — аб'яднанне некалькіх родаў, якія жылі ў адной мясцовасці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

***Дрыгавічы*** пасяліліся на землях ад Прыпяці да Нёмана. На чале племені стаяў правадыр Дрыгавіт. Дрыгавічы займалі тэрыторыю, дзе было шмат балот — дрыгвы. Магчыма, адсюль і пайшла назва гэтага славянскага племені. Тут быў пабудаваны старажытны горад Тураў.

На рацэ Сож пасялілася племя ***радзімічаў***. Згодна з паданнем яны пачалі так звацца ад імя свайго правадыра Радзіма. Пазней на зямлі радзімічаў узнік горад Гомель.

Усходнія славяне з’яўляюцца продкамі сучасных беларусаў, рускіх, украінцаў.

**1.** Якія новыя заняткі з’явіліся ў людзей?
**2.** Што такое земляробства? Як яно ўзнікла?
**3.** Што такое жывёлагадоўля?
**4.** Як называлася першая прыручаная чалавекам жывёла? Якую карысць яна прыносіла людзям?
**5.** Дзякуючы якому занятку ўзнікла жывёлагадоўля?
**6.** Якую карысць прыносілі прыручаныя жывёлы людзям?
**7.** Што ўяўляла сабою гарадзішча?
**8.** Якую працу выконвалі з дапамогай прылад: серп, сякера, молат, каменныя жорны, цэп, каса, граблі, абцугі? Выкарыстайце малюнак на с. 33.
**9.** Што такое племя?
**10.** Якія ўсходнеславянскія плямёны жылі на тэрыторыі Беларусі? Калі яны пасяліліся ў Беларусі?
**11.** Адкуль пайшлі назвы плямён крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў?
**12*.** Дзе рассяліліся гэтыя плямёны на землях Беларусі?
**13.** Продкамі якіх сучасных народаў з’яўляюцца ўсходнія славяне?

Складзіце расказ па малюнку на с. 31, 33, 34 (на выбар).

Пакажыце тэрыторыі, занятыя плямёнамі крывічоў, радзімічаў, дрыгавічоў, на картасхеме «Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі» на форзацы.

**1.** Наведайце краязнаўчы музей. Высветліце, якое племя ўсходніх славян пражывала ў старажытнасці ў вашай мясцовасці. Назавіце гэтае племя.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Раскажыце, што вы ведаеце пра вашых бацькоў, дзядоў і прадзедаў.

Карыстаючыся школьнай картай Беларусі, здзейсніце ўяўную вандроўку па галоўных рэках Беларусі: Дняпро, Прыпяць, Бярэзіна, Сож, Нёман, Заходняя Дзвіна. Высветліце, якія сучасныя гарады знаходзяцца на берагах гэтых рэк. З дапамогай настаўніка падбярыце ў бібліятэцы ілюстрацыйны матэрыял па тэме «Рэкі Беларусі».

**1.** Крывічы мелі такі звычай. Калі юнак дасягаў паўналецця, то ён павінен быў пераплысці паўнаводную раку, раскласці вогнішча, упаляваць звера. А таксама ён мусіў пералічыць пяць пакаленняў сваіх продкаў. Толькі ў гэтым выпадку юнак мог звацца сапраўдным мужчынам. Таго, хто не мог гэтага зрабіць, лічылі здольным да здрады і нават маглі выгнаць з племені.

Увогуле, нашы продкі вылучаліся сілай, вынослівасцю, працавітасцю. Яны любілі і ўмелі прыняць гасцей. А калі было трэба, са зброяй у руках абаранялі свой родны дом, сваю зямлю.

**2.** Гісторыя не складаецца сама па сабе. Яе робяць людзі. Усе падзеі, што адбываюцца на зямлі, звязаны з дзейнасцю чалавека.

Многія людзі заўсёды цікавіліся гісторыяй сваёй сям'і. Чаму сям'я носіць такое прозвішча? Адкуль пайшоў род? Якія падзеі асабліва закранулі жыццё сям'і? Для гэтага людзі вядуць радавод. Вядома, нямногім удаецца атрымаць звесткі пра свой род з глыбінь гісторыі. Складанне радаводу — занятак вельмі займальны, карысны для чалавека, але няпросты. Дапамагаюць чалавеку ў гэтым установы, дзе захоўваюцца звесткі пра жыццё людзей ад іх нараджэння да скону. Такія ўстановы называюцца гістарычныя архівы.

Спадзяёмся, што кожны з вас жадае ведаць пра сваіх продкаў. Цікава, чым яны займаліся, удзельнікамі якіх падзей былі, як узнікла ваша прозвішча. Да гэтай справы можна далучыць усіх сваякоў. Вашы сумесныя дзеянні абавязкова атрымаюць станоўчы вынік.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 8. Старажытныя вераванні

1. Якія былі прыродныя ўмовы на землях Беларусі ў старажытны перыяд?
2. Хто такія продкі?
3*. Ці можна назваць продкамі людзей, якія жывуць у Беларусі ў наш час?

Старажытны чалавек адчуваў сябе часткай навакольнага свету. Ён верыў, што ўсё ў прыродзе з'яўляецца жывым і можа дапамагчы ў цяжкую хвіліну. Таму маланку, гром, дрэвы, жывёл ён надзяляў чалавечымі якасцямі.

Чалавек пакланяўся дрэвам, вужам, камяням, вадзе і шмат чаму іншаму. Прасіў іх аб дапамозе і заступніцтве ў цяжкі перыяд жыцця.

Старажытныя германцы, напрыклад, ушаноўвалі елку. Верылі ў яе цудадзейную моц. Зімой яны ўпрыгожвалі высокія яліны, вадзілі вакол іх карагоды, прыносілі падарункі і прасілі ў дрэў дапамогі. Іншыя народы пакланяліся быку і карове. Забойства гэтых жывёл ці прычыненне ім шкоды каралася смерцю. Напрыклад, у Індыі і сёння можна ўбачыць кароў, якія беспераШкодна ходзяць па вуліцах і дарогах. Да гэтай жывёлы ставяцца там з вялікаю пашанай. Ніхто не праганяе карову.

Нашы продкі асабліва шанавалі дуб. Каб улагодзіць дрэва, яму прыносілі падарункі, прасілі дапамагчы ў справах.

У вужах людзі бачылі добры знак. Чалавек звяртаўся да іх з просьбаю, каб хутка прайшоў дождж і каб быў добры ўраджай. У беларусаў існуе шмат легендаў пра вужоў, ваўкоў, камяні і іншае, чаму пакланяліся людзі.



Ушанаванне дуба-волата



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Чалавек не мог растлумачыць розныя з’явы прыроды. Напрыклад, чаму грыміць гром, бліскае маланка, з’яўляецца на небе вясёлка. Страх перад незразумелым спарадзіў веру ў багоў. Чалавек пачаў пакланяцца ім. Багоў было шмат. Кожны з іх адыгрываў сваю ролю ў жыцці чалавека. Адным з галоўных з’яўляўся ***Пярун*** — бог грому і маланкі. Перуна баяліся. Чалавек стараўся ўлагодзіць яго падарункамі.

Асаблівае месца ў вераваннях старажытнага чалавека займаў ***культ Сонца***. Сонца давала Зямлі цяпло і святло. Без яго тагачасны чалавек не мог бы вырошчваць культурныя расліны. Часам гарачае сонца несла і небяспеку. Яно магло выпаліць траву на пашах жывёлы або знішчыць пасевы. Таму нашы продкі і пакланяліся Сонцу.

Такім чынам, чалавек у старажытнасці ўшаноўваў навакольную прыроду і пакланяўся шматлікім багам. **Мнагабожжа**[1] існавала на працягу тысячагоддзяў.

**1.** Каму і чаму пакланяліся людзі ў старажытнасці?
**2.** Чаму ў далёкім мінулым людзі пакланяліся розным багам, жывёлам і дрэвам?
**3.** Што прасілі людзі ў дрэў, жывёл і багоў?
**4.** Растлумачце, што такое мнагабожжа.
**5*.** Паразважайце, адкуль прыйшоў звычай упрыгожваць елку на Новы год.

Разгледзьце малюнак на с. 37. Адкажыце на пытанні.
Чым адрозніваецца дрэва на малюнку ад іншых дрэў?
Для чаго на яго галінах павешаны ручнікі?

**1.** Спытайце ў старэйшых пра старадаўнія народныя традыцыі, абрады і святы, якія існуюць у вашай мясцовасці. Раскажыце.

**2.** Station Station

[1] **Мнагабо́жжа** — вера ў шматлікіх багоў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 9. Камяні і курганы — «маўклівыя сведкі мінуўшчыны»

1. Як мы даведваемся пра жыццё людзей у далёкім мінулым?
2. Што такое летапіс?
3. Як называецца самы старажытны летапіс усходніх славян (нашых продкаў)?
4. Якія «сведкі мінулага» знаходзяцца побач з намі?

Шмат звестак пра далёкае мінулае дайшло да нашых дзён не толькі праз пісьмовыя крыніцы — летапісы. Вакол нас знаходзяцца шмат прадметаў, якія былі сведкамі мінуўшчыны. Яны не могуць нам паведаміць пра тыя ці іншыя падзеі, але захавалі сляды мінулых дзён. Падобных маўклівых сведак вельмі шмат. Сярод іх і камяні.

Вялікія камяні — **валуны**[1] — засталіся на тэрыторыі Беларусі пасля сыходу апошняга ледавіка. Найбольшы з іх знаходзіцца ў Віцебскай вобласці. Яго даўжыня 11 метраў. З вялікімі камянямі звязаны розныя паданні і падзеі старажытнасці. Тагачасныя людзі іх шанавалі, давалі назвы, лічылі цудадзейнымі. Некаторыя валуны маюць надпісы, розныя выявы (сонца, зоркі, крыжы). Такім чынам старажытны чалавек імкнуўся пакінуць памяць пра сябе або пра важныя падзеі.

Прыкладам такіх камянёў з’яўляецца Барысаў камень у Полацку. Ён данёс да нашых часоў наступную гісторыю.



Барысаў камень



Рагвалодаў камень

[1] **Валу́н** — камень вялікіх памераў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У 12 стагоддзі полацкі князь Барыс загадаў выбіць на камянях крыжы і надпісы: «Божа, дапамажы рабу свайму Барысу». Князь верыў, што камяні дапамогуць яму перамагчы ворагаў, якія напалі на Полацкую зямлю. Адзін з гэтых камянёў перанеслі. Зараз ён стаіць побач з Сафійскім саборам у Полацку.

Простыя людзі лічылі гэты камень святым, прыносілі да яго кавалачкі хлеба і прасілі добрага ўраджаю. Таму Барысаў камень завуць яшчэ Барыс-Хлебнік.

Некаторыя вялікія камяні з даўніх часоў лічацца цудадзейнымі. Чалавек верыў, што вада, якая збіраецца ў паглыбленнях на камені, мае лекавыя ўласцівасці. Да гэтых камянёў і па сённяшні дзень едуць людзі, каб папрасіць дапамогі ці вылечыцца ад хваробы. У Мінскай вобласці ў Любанскім раёне такі цудадзейны камень мае назву Божы, а ў Лагойскім — Святы.

У 1985 годзе ў Мінску быў створаны незвычайны музей. Гэта музей валуноў, у якім на даволі вялікай плошчы сабрана болей за 2 тысячы рэдкіх камянёў. На паверхні некаторых з іх выбіты старажытныя знакі ў форме лука са стрэламі, крыжоў, сонца. Ёсць валуны са слядамі апрацоўкі, каменныя жорны і іншыя. Многія з камянёў маюць сваю гісторыю і паданні. Валуны лічацца помнікамі гісторыі і культуры Беларусі і ахоўваюцца дзяржавай.



Музей валуноў
у Мінску



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Курган

Засталася на беларускай зямлі і вялікая колькасць старажытных пахаванняў — **курганоў**[1]. Іх у Беларусі налічваецца больш за 15 тысяч. Звычай насыпаць курганы над магіламі ўзнік яшчэ ў першабытныя часы. Назвы многіх з іх мясцовыя жыхары звязваюць з гістарычнымі падзеямі і вядомымі імёнамі. Некаторыя называюцца курганамі-валатоўкамі. Згодна з паданнямі, у іх пахаваны **волаты**[2].

Нашы продкі лічылі, што пасля смерці чалавек працягвае жыць у іншым месцы. Таму ў магілу нябожчыку клалася ўсё тое, чым ён карыстаўся пры жыцці. Калі памерлы быў воінам, яму клалі зброю, калі гандляром — вагі. У жаночай магіле абавязкова былі ўпрыгажэнні. Ставілі каля нябожчыка таксама гаршчок з кашай або зернем, каб ён мог падсілкавацца і на тым свеце. Знатных асоб — правадыроў роду, племені — хавалі з вялікай колькасцю рэчаў. Курган над імі насыпаўся значна вышэйшы. Раскопкі такіх курганоў даюць вучоным багаты матэрыял, які дазваляе меркаваць пра жыццё нашых далёкіх продкаў.

Пасля пахавання на насыпаным кургане заўсёды рабілі памінкі. Назва гэтага абраду паходзіць ад слоў «успомніць», «помніць». І спраўляліся памінкі, каб аддаць апошнюю даніну памяці нябожчыку.

Многія традыцыі пахавання і ўшанавання памяці продкаў дайшлі і да нашых дзён. Так, беларусы ўшаноўваюць памяць сваіх продкаў на **Радаўніцу**[3] і на **Дзяды**[4].

[1] **Курга́н** — земляны насып над старажытным пахаваннем.
[2] **Во́лат** — надзвычай дужы і высокі чалавек.
[3] **Ра́даўніца** — дзень шанавання памяці продкаў, які адзначаецца вясной.
[4] **Дзяды́** — дзень шанавання памяці продкаў, які адзначаецца восенню.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Курганы і камяні, а таксама розныя старажытныя прадметы побыту з’яўляюцца помнікамі гісторыі. Яны ахоўваюцца дзяржавай. Іх вывучэнне дапамагае даведацца аб жыцці і вераваннях нашых продкаў.

1. Чаму вялікія камяні называюць «маўклівымі сведкамі мінуўшчыны»?
2. Чаму валуны лічацца помнікамі гісторыі і культуры Беларусі і ахоўваюцца дзяржавай?
3. Для чаго насыпалі курганы?
4. Чаму камяням і курганам людзі часам давалі назвы?
5. Чаму ў магілу нябожчыку клалі ежу, зброю, іншыя прадметы?
6. Якія традыцыі шанавання памяці продкаў дайшлі да нашых дзён?
7. Як курганы дапамагаюць даведацца аб жыцці і вераваннях нашых продкаў?
8*. Што вы ведаеце пра святы Радаўніца, Дзяды? Раскажыце.

**1.** Разгледзьце малюнак на с. 39. Раскажыце гісторыю Барысава каменя.
**2.** Разгледзьце малюнкі на с. 39—41. Раскажыце пра валуны і курганы ў Беларусі.

**1.** Пацікаўцеся, ці ёсць у вашай мясцовасці «маўклівыя сведкі мінуўшчыны». Раскажыце.
**2.** Раскажыце, як вы ўшаноўваеце памяць сваіх продкаў.

Пабывайце ў Музеі валуноў або здзейсніце ўяўнае падарожжа туды, карыстаючыся кнігамі ці інтэрнэтам. Раскажыце пра вашы ўражанні.

У Беларусі існуе шмат міфаў і казак. Вядомы міф пра Змееў камень. У ім расказваецца, што на адной з дарог ляжыць камень, у якім ёсць акно і дзверы. Калісьці там жыў аднагаловы змей. Ён быў добрым краўцом і заўсёды дапамагаў людзям. Многія бачылі, як змей прымаў чалавечае аблічча. Здарылася так, што ён закахаўся ў дзяўчыну. Тая стала ягонай жонкай, але аднойчы не выканала змеевай просьбы. У выніку змей больш не змог ператварацца ў чалавека і памёр. Не змог ён вярнуцца і да свайго ка-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

меннага жытла. Жыхары вёскі мо з тыдзень цягалі пясок, каб засыпаць змея. І да сённяшняга дня на змеевай магіле каля каменя стаіць курган.

Адно з паданняў распавядае, што каля вёскі Галубцова на Віцебшчыне на беразе возера ёсць гара-валатоўка. Тутэйшыя людзі называюць яе Галубец. Кажуць, што ў гэтай валатоўцы схаваны вялікі скарб. Не так даўно з яе нібыта выкапалі даволі вялікі срэбны злітак. Як сведчаць старыя людзі, валатоўка насыпана над асілкам. Ён здабыў перамогу над ворагам, а сам памёр ад цяжкіх ран. Разам з ім у глыбокую магілу паклалі і яго незлічоныя скарбы. Непадалёку ад валатоўкі цячэ ручай Красінец. Называецца ён так невыпадкова. Вада ў ручаі падчас бітвы была ажно чырвоная ад крыві. Шмат хто з мясцовых жыхароў бачыў каля Галубца сівога старога. Ён быў на белым кані. Смельчакі адважваліся наблізіцца да яго. Стары з'яўляўся на вяршыні валатоўкі, а потым невядома куды знікаў. Людзі вераць, што ён вартуе закапаны ў валатоўцы скарб.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПОЛАЦКАЕ І ТУРАЎСКАЕ КНЯСТВЫ

## 10. Першыя дзяржаўныя аб'яднанні — княствы

1. З каго складаўся род у старажытныя часы?
2. У што аб'ядноўваліся роды, якія жылі ў адной мясцовасці?
3. Як называліся ўсходнеславянскія плямёны, якія рассяліліся на тэрыторыі Беларусі?
4. Продкамі якіх сучасных народаў з'яўляюцца ўсходнеславянскія плямёны?

У першабытнасці людзі жылі родамі. Узначальвалі роды **старэйшыны**[1]. Гэта былі самыя вопытныя і паважаныя людзі ў родзе. Старэйшына не толькі кіраваў усім родам, але і працаваў разам з усімі. Ён карыстаўся агульным даверам, і ўсе выконвалі яго загады. Для вырашэння найбольш значных пытанняў старэйшына збіраў агульныя сходы дарослых мужчын.

Пазней роды, якія пражывалі ў адной мясцовасці, аб'ядноўваліся ў плямёны. Кіраваць справамі племені стаў **князь**[2]. Ён павінен быў вырашаць спрэчкі, якія ўзнікалі паміж родамі.



Княжацкі дружыннік

Князь меў сваё войска — **дружыну**[3]. Са сваёй дружынай ён абараняў ад ворагаў землі племені.

Варожасць паміж плямёнамі прымушала людзей умацоўваць свае паселішчы землянымі валамі, равамі, драўлянымі сценамі. Гэта рабілася з прычыны магчымага нападу суседніх плямён. Яны маглі захапіць статкі жывёлы і іншую маёмасць роду.

У старажытнасці вялікае паселішча, умацаванае валамі, равамі і сценамі, пачалі называць **горадам**[4].

[1] **Старэ́йшына** — кіраўнік роду.
[2] **Князь** — кіраўнік спачатку племені, а потым — княства.
[3] **Дружы́на** — асабістае войска князя.
[4] **Го́рад** — у старажытнасці вялікае паселішча, умацаванае валамі, равамі і сценамі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Збор даніны

Адзін раз на год князь разам з дружынай аб’язджаў свае землі. Ён вырашаў розныя пытанні, разбіраў скаргі, судзіў вінаватых.

Дружына князя займалася зборам **даніны**[1], якую жыхары таго ці іншага паселішча плацілі за абарону ад знешніх ворагаў.

Пазней яны сталі плаціць даніну за карыстанне зямлёй, якая належала князю. Жыхары сяла неслі сала, мяса, збожжа, мёд, палатно, грыбы, шкуры звяроў. Даніна патрабавалася князю для ўтрымання сваёй сям’і, дружыны і слуг. Нельга было не заплаціць даніны, бо за гэта чалавек мог быць сурова пакараны.

Найбольш важныя пытанні жыцця племені (вайны і міру, заключэння дагавораў і іншыя) вырашаліся на агульным сходзе дарослых мужчын. Такі сход атрымаў назву **веча**[2] (ад старажытнаславянскага

[1] **Дані́на** — падатак, які збіраўся князем з насельніцтва.
[2] **Ве́ча** — старажытны народны сход, які збіраўся для вырашэння важных пытанняў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

слова «вет» — рада). Пазней веча адыгрывала вялікую ролю ў жыцці Полацка і іншых гарадоў Беларусі. Пра збор веча жыхарам горада абвяшчаў гарадскі звон. Сход гараджан адбываўся на самай вялікай плошчы горада. Пры галасаванні людзі не падымалі руку ўгору, а на ўвесь голас крычалі. За які закон крычалі мацней, той і прымаўся. Законы спачатку не запісваліся. Князі ў гэтыя часы залежалі ад волі веча. Яно магло выгнаць князя і заклікаць на княжанне новага.

З цягам часу плямёны, што жылі на тэрыторыі Беларусі, пачалі аб’ядноўвацца. Так лепш было абараняцца ад ворагаў. У выніку аб’яднання плямён утварыліся **княствы**[1]. Яны сталі першымі ***дзяржаўнымі ўтварэннямі*** (**дзяржавамі**[2]) на нашай зямлі. Першым на беларускай зямлі ў ***9 стагоддзі*** ўзнікла ***Полацкае княства***.

Асноўная частка Полацкага княства знаходзілася на поўначы Беларусі. Заходняя Дзвіна і іншыя рэкі спрыялі развіццю дзяржавы. У 10 стагоддзі на поўдні Беларусі ўзнікла ***Тураўскае княства***.

**1.** Хто кіраваў родам?
**2.** Кім узначальвалася племя?
**3.** Якія абавязкі і правы меў старэйшына роду?
**4.** Хто дапамагаў князю абараняць землі племені?
**5.** Што такое даніна? Хто і як яе збіраў? Чым плацілі даніну?
**6.** Растлумачце, што такое веча.
**7.** Хто прымаў удзел у вечы?
**8.** Што вырашала веча?
**9.** Як узніклі княствы?
**10.** Як называліся вялікія ўмацаваныя паселішчы?
**11.** Назавіце першыя княствы, якія ўзніклі на беларускай зямлі.
**12*.** Растлумачце выраз: «Княствы — першыя дзяржаўныя ўтварэнні (дзяржавы) на нашай зямлі».
**13*.** Паразважайце, чым адрознівалася гарадзішча ад стаянкі.
**14*.** Як вы мяркуеце, чым гарадзішча адрознівалася ад горада?

Складзіце расказ па малюнку на с. 45.

[1] **Кня́ствы** — першыя дзяржаўныя ўтварэнні на чале з князем.
[2] **Дзяржа́ва** — саюз грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды, маёмасці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Разгледзьце картасхему «Полацкае і Тураўскае княствы ў 11 ст.» на форзацы вучэбнага дапаможніка. Пакажыце на ёй першыя княствы, іх межы, галоўныя гарады і рэкі, якія працякаюць праз іх тэрыторыю.

**Збор даніны**

На ўзвышаным месцы сяла сядзіць князь. Ён апрануты ў дарагое адзенне. На яго галаве футравая шапка, на нагах мяккія скураныя боты. Вакол князя стаяць узброеныя дружыннікі.

Апранутыя ў доўгія белыя кашулі, сюды сыходзяцца людзі. Яны нясуць і кладуць каля ног князя даніну. Адны прыносяць мяхі са збожжам, шкуры звяроў. Другія — сала, мяса. Трэція — мёд, воск, сушаныя грыбы, ягады і іншае. Кожны з вяскоўцаў ведае, што ён павінен здаць даніну ў пэўны тэрмін.

Старэйшына сяла прымае і падлічвае ўсё, што прыносяць. Дружыннікі складваюць набыткі на вазы і сочаць за тым, каб не было падману. Калі ўсе жыхары вёскі здалі даніну, князь і яго дружына накіроўваюцца далей.

## 11. Полацк — самы старажытны горад Беларусі

1. Якія паселішчы ператвараліся ў гарады?
2. Якімі збудаваннямі ўмацоўваўся горад?

Самым буйны́м горадам племені крывічоў быў ***Полацк***. Летапісы данеслі да нашых дзён першыя назвы горада — Полотеск, Полотьск, Полтеск. Горад узнік на месцы ўпадзення ў Заходнюю Дзвіну ракі Палаты́. Ад назвы ракі Палаты паходзяць назвы самога горада і жыхароў, што жылі на гэтых землях, — ***палачан***. Полацк — самы старажытны горад Беларусі. Упершыню ён згадваецца ў летапісе пад ***862 годам***.

Спачатку Полацк быў невялікім умацаваным паселішчам. Толькі цэнтральная частка горада была абнесена драўлянымі сценамі, акружана валам і ровам. Займала гэтая тэрыторыя невялікую плошчу — усяго 1 гектар. Вакол было неўмацаванае пасяленне, дзе жылі рамеснікі.

Полацк хутка рос і развіваўся. Умацаванні (роў, агароджа, валы) надзейна абаранялі шматлікіх багатых жыхароў. Затым горад стаў цэнтрам Полацкага княства. Гэтаму спрыяла знаходжанне на Заходняй Дзвіне. У той час галоўныя шляхі зносін паміж княствамі і гарадамі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Старажытны Полацк

праходзілі па рэках. Летапісы паведамляюць, што палачане плавалі нават у Чорнае мора. Слава Полацка разнеслася па ўсім свеце. Полацкія гандляры былі вядомы далёка за межамі княства. Яны везлі тавары ў іншыя гарады, а адтуль вярталіся з новымі. Полацк часта наведвалі і замежныя гандляры. Яны прадавалі свае тавары і куплялі тое, што выраблялі палачане. Ужо ў той час полацкія майстры славіліся сваімі вырабамі з золата і серабра, футрам, скуранымі рэчамі.

Полацк быў добра ўмацаваным горадам. Рэдка хто адважваўся пайсці на яго вайною. З ім шукалі міру і згоды. А калі ўзнікала пагроза, велічны звон трывожна склікаў палачан. На самую вялікую плошчу



Заходняя Дзвіна, што працякае праз Полацк



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

горада сыходзіліся дарослыя мужчыны, каб стаць пад княжацкія сцягі і бараніць сваю зямлю. Полацкія князі памнажалі славу горада.

Мала якія вакольныя гарады маглі паспрачацца з Полацкам сваім храством, колькасцю мураваных збудаванняў. Славу гораду надалі і славутыя людзі, якія жылі ў Полацку ў розныя часы.

1. Дзе ўзнік Полацк?
2. Адкуль пайшла назва горада Полацка?
3. Калі горад упершыню згадваецца ў летапісе?
4. Чым славіўся горад Полацк?

Знайдзіце ў бібліятэцы кнігі пра Полацк. Складзіце вусны расказ пра яго гісторыю. Падлічыце ўзрост горада Полацка.

Знайдзіце на гістарычнай і сучаснай картах горад Полацк. У якой вобласці нашай краіны ён знаходзіцца?

Зрабіце ўяўнае падарожжа па старажытным горадзе. Выкарыстайце малюнак на с. 48 (уверсе).

## 12. Прыняцце хрысціянства

1. Якім багам пакланяўся старажытны чалавек?
2. Чаму нашы продкі ў першабытнасці верылі ў мноства багоў?

З цягам часу колькасць багоў, якім пакланяліся людзі, паменшылася. Узніклі асобныя ***рэлігіі***, заснаваныя на веры ў адзінага бога.

Крыху больш за тысячу гадоў таму назад (***10 стагоддзе***) на зямлі Беларусі прыйшла новая вера — **хрысціянства**[1]. Мнагабожжа змянілася верай у аднаго Бога — ***Ісуса Хрыста***. Хрысціянства спачатку было прынята князямі, а пасля пашырылася сярод простых людзей.

Прыняцце хрысціянства садзейнічала развіццю **культуры**[2]. Пачалі будавацца цэрквы. Для гэтага выбіраліся зручныя месцы, каб храм было відаць з усіх бакоў і паўсюль чутны былі званы. Цэрквы будавалі лепшыя майстры. Таму храмы былі прыгожыя і велічныя. Больш стала пісьменных людзей, бо пры цэрквах адчыняліся школы.

[1] **Хрысціянства** — вера ў адзінага Бога Ісуса Хрыста.
[2] **Культу́ра** — матэрыяльныя і духоўныя дасягненні людзей.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Царква



Касцёл



Мячэць



Сінагога



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Побач з цэрквамі будавалі **манастыры**[1]. У іх жылі **манахі**[2] (або **манашкі**). Манастыры мелі сваю зямлю і розную маёмасць, неабходную для працы і жыцця манахаў. Манахі перапісвалі кнігі, па якіх людзі вучыліся.

Першыя манастыры на землях Беларусі ўзніклі каля Заслаўя і Полацка. Манастыры існуюць і па сённяшні дзень.

У 11 стагоддзі хрысціянства падзялілася на ***праваслаўе*** і ***каталіцызм***. Адрозненні паміж імі тычацца абрадаў і веравучэння. Праваслаўныя наведваюць царкву, а католікі — касцёл.

На тэрыторыі Беларусі з даўніх часоў жывуць прыхільнікі і іншых рэлігій. Калі хрысціяне вераць у Ісуса Хрыста, то мусульмане — у Алаха. Мусульмане ходзяць маліцца ў мячэць, іудзеі — у сінагогу. Пераважная большасць вернікаў у Беларусі — праваслаўныя.

Для жыхароў нашай зямлі заўсёды была характэрна ***верацярпімасць***. Яна выяўляецца ва ўзаемнай павазе паміж прыхільнікамі розных рэлігій.

Многім людзям вера ў Бога дапамагае ў штодзённым жыцці. Вернікі ва ўсіх справах кіруюцца запаведзямі.

1. Не забі.
2. Не крадзі.
3. Шануй бацьку свайго і маці.
4. Не асуджай іншых людзей.
5. Не зайздросць.

Гэтыя і іншыя хрысціянскія запаведзі запісаны ў **Бібліі**[3]. Гэта кніга пісалася рознымі аўтарамі на працягу 1600 гадоў.

Кожны чалавек сам выбірае сабе рэлігію або застаецца нявернікам. Але гэтых і іншых запаведзяў будзе карысна прытрымлівацца ўсім людзям.

?

**1.** Што такое хрысціянства?
**2.** Чаму прыняцце хрысціянства садзейнічала развіццю культуры?
**3.** Як называецца месца, дзе жывуць манахі або манашкі?
**4.** У чым адрозненне паміж праваслаўнымі і католікамі?
**5*.** Растлумачце выраз: «Кожны чалавек сам выбірае сабе рэлігію».

[1] **Манасты́р** — месца, дзе жывуць манахі або манашкі.
[2] **Мана́х** (або **мана́шка**) — чалавек, які служыць Богу.
[3] **Бі́блія** — кніга, якая з'яўляецца Свяшчэнным Пісаннем для хрысціян.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**1.** Як вы разумееце наступныя прыказкі?

*На бога спадзявайся, але і сам старайся.*

*Хто спадзяецца на неба, той сядзіць без хлеба.*

*Бог чакае доўга, ды б'е балюча.*

**2.** Разгледзьце малюнкі на с. 50. Чым адрозніваюцца, на ваш погляд, царква, касцёл, мячэць і сінагога?

Высветліце ў бацькоў ці настаўнікаў, прыхільнікі якіх рэлігій жывуць у вашай мясцовасці. Раскажыце.

Бадай, кожны беларус ведае Жыровіцкі манастыр. Гісторыя яго пачалася ў далёкую даўніну. У 1470 годзе цудатворны абраз Маці Божай з'явіўся на дзікай грушы ў паселішчы каля Слоніма. На месцы, дзе згодна з паданнем з'явіўся абраз, і быў пабудаваны манастыр. Гэты абраз з'яўляецца галоўнай святыняй манастыра. З усіх абразоў Божай Маці Жыровіцкі — самы маленькі. Яго памер складае 5,6 на 4,4 см. Цудатворны абраз — адна з шанаваных хрысціянскіх святынь.



Жыровіцкі манастыр



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 13. Славутыя імёны Полацкай зямлі. Князёўна Рагнеда

Назавіце галоўны горад Полацкай зямлі.

Нямала славутых імён дала свету Полацкая зямля. Адно з іх — князь ***Рагвалод***. Гэта першы гістарычна вядомы полацкі князь. Упершыню яго імя згадваецца ў летапісе пад ***980 годам***. З імем полацкага князя Рагвалода звязана ўзмацненне Полацкага княства.

Да сённяшняга часу наш народ ушаноўвае памяць аб полацкай князёўне ***Рагнедзе***. Яна нарадзілася ў сям'і Рагвалода. Калі князёўне споўнілася 14 гадоў, пасваталіся да яе князі Яраполк і Уладзімір. Кіеўскі князь Яраполк і наўгародскі князь Уладзімір былі братамі, але не ладзілі паміж сабой. Кожны хацеў ажаніцца з Рагнедай, каб мець падтрымку князя Рагвалода.

Рагнеда са згоды свайго бацькі выбрала Яраполка. Тады князь Уладзімір сабраў вялікае войска і напаў на Полацк. Рагвалод і яго сыны былі забіты, а князёўну Рагнеду Уладзімір сілай прымусіў стаць ягонай жонкай. Пасля гэтага Уладзімір са сваім войскам напаў на Кіеў. Ён перамог Яраполка і стаў кіеўскім князем. Так Рагнеда стала вялікай княгіняй у Кіеве.


Рагвалод і Рагнеда

Згодна са старадаўнім звычаем жанчына, калі выходзіла замуж, мяняла сваё імя. Рагнеда назвалася Гарыславай. Яна нарадзіла Уладзіміру чатырох сыноў і дзвюх дачок. Старэйшым дзіцем быў ***Ізяслаў***. Аднак, як кажа легенда, не забылася Рагнеда на забітых бацьку і братоў. Яна вырашыла адпомсціць за іх Уладзіміру. Аднойчы ноччу яна падышла да ложка, дзе спаў Уладзімір, з намерам яго забіць. Але замах на



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ


Рагнеда і Ізяслаў

жыццё мужа не ўдаўся. Ён прачнуўся і ў лютасці хацеў забіць Рагнеду. За маці заступіўся сын Ізяслаў. Ён засланіў маці і сказаў: «Бацька, раней забі мяне!»

Князь абвясціў наступнае. Малодшых сваіх дзяцей Рагнеда не ўбачыць ніколі. Сама ж яна з сынам Ізяславам была саслана ў невялікую крэпасць каля Мінска. Крэпасць збудаваў Уладзімір. Потым вялікі князь падараваў яе сыну Ізяславу. Ад імя старэйшага сына Уладзіміра і пайшла назва крэпасці Ізяслаўль, а пазней і горада. Сёння гэта горад ***Заслаўе***, што пад Мінскам.

Праз год у Рагнеды забралі сына. Яе адправілі ў манастыр. Стаўшы манашкай, яна атрымала імя ***Анастасія***. Яе жыццё працягвалася ў цеснай **келлі**[1].

Праз некаторы час Ізяслаў стаў полацкім князем. Гэта быў вельмі адукаваны чалавек. Ён паклаў пачатак пісьменству на Полацкай зямлі.

Рагнеда ж заснавала ў Ізяслаўлі манастыр і пражыла ў ім да канца сваіх дзён. Шматпакутнай князёўне Рагнедзе, якая пражыла сваё жыццё пад трыма імёнамі, людзі і сёння аддаюць пашану. У Заслаўі ёсць курган Рагнеды, стаіць помнік Рагнедзе і Ізяславу. А дзеці і ўнукі Рагнеды сталі пачынальнікамі многіх славутых княжацкіх родаў. Яны праславілі Полацк і іншыя гарады.

**?**

1. Пад якім годам згадваецца ў летапісе імя полацкага князя Рагвалода?
2. Пад якімі імёнамі вядома ў гісторыі князёўна Рагнеда?
3. Адкуль пайшла назва горада Заслаўе?
4. Чаму наш народ ушаноўвае памяць князёўны Рагнеды?
5*. Дзе людзі могуць і сёння пакланіцца шматпакутнай князёўне Рагнедзе?

Складзіце план і па ім раскажыце гісторыю лёсу полацкай князёўны Рагнеды. Выкарыстайце пры гэтым малюнкі на с. 53—54.

[1] **Ке́лля** — асобнае памяшканне для манаха або манашкі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Зрабіце ўяўнае падарожжа ў старажытны горад Заслаўе. Што сёння ў аблічча горада нагадвае пра яго старажытнасць?

Усходнія славяне больш за тысячу гадоў назад стварылі старажытную дзяржаву — Кіеўскую Русь. Галоўным горадам яе быў Кіеў. У ім кіравалі многія вялікія князі. Адным з самых вядомых князёў у Кіеве быў сын Рагнеды Яраслаў. За свой розум ён быў празваны Мудрым.

Спачатку Яраслаў княжыў у Ноўгарадзе. Гэты горад у той час быў буйны́м гандлёвым цэнтрам. У яго з'язджаліся купцы з розных краін. Яраслаў клапаціўся пра дабрабыт горада. Ён будаваў дарогі і масты, умацоўваў крэпасці.

Пасля смерці бацькі Яраслаў стаў вялікім князем у Кіеве. Пры княжанні Яраслава пачалі пісаць летапісы і перапісваць царкоўныя кнігі. Ён напісаў першыя агульныя для ўсіх законы. Яны былі аб'яднаны ў кнізе, якая называлася «Руская Праўда». Гэтыя законы сталі правілам жыцця для ўсяго насельніцтва Кіеўскай Русі, у тым ліку і для жыхароў беларускіх зямель. Для тых, хто парушаў закон, былі прадугледжаны пакаранні. Гэта маглі быць штрафы і нават смяротная кара.

Яраслаў Мудры быў таксама выдатным военачальнікам. Ён неаднойчы перамагаў на полі бою. У час яго кіравання ворагі баяліся нападаць на Кіеў і нават іншыя гарады княства.


Яраслаў Мудры

Па загадзе Яраслава ў Кіеве быў пабудаваны сабор у імя святой Сафіі. Гэта быў самы прыгожы і велічны храм Кіеўскай Русі ў 11 стагоддзі. З дапамогай веры ў Хрыста Яраслаў аб'ядноўваў дзяржаву. Падобныя храмы былі пабудаваны ў Полацку і Ноўгарадзе.

Час княжання Яраслава быў вяршыняй славы і велічы Кіеўскай Русі.

Памяць пра Яраслава Мудрага як разумнага і разважлівага дзяржаўнага дзеяча жыве па сённяшні дзень.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 14. Усяслаў Чарадзей

1. Хто такі князь?
2. Што вы ведаеце пра Рагвалода?
3. Які горад быў галоўным у Полацкім княстве?



Усяслаў Чарадзей

У ***11 стагоддзі*** Полацкае княства значна пашырылася. Яго межы на захадзе ўздоўж Заходняй Дзвіны даходзілі амаль да Балтыйскага мора. Княжыў у гэты час у Полацкай зямлі ***Усяслаў***, прапраўнук Рагвалода. У народзе яго празвалі ***Усяславам Чарадзеем***. Хадзілі чуткі, што Усяслаў — чараўнік і яму дапамагаюць ва ўсіх справах багі. Многія людзі таксама верылі, што ён мог ператварацца ў ваўка, сокала ці тура і нечакана з'яўляцца ў розных месцах. Руплівa даглядаў і ахоўваў ён сваё княства ад ворагаў. За гэта Усяслава і празвалі Чарадзеем. У гады яго кіравання не толькі горад Полацк, але і ўсё Полацкае княства было багатым і магутным. У Полацк прыязджалі гандляры з Кіева і розных буйны́х гарадоў. Прыходзілі воіны, каб служыць у дружыне полацкага князя.

У Полацку быў пабудаваны вялікі **дзядзінец**[1], акружаны высокай драўлянай сцяной і глыбокімі равамі. Над горадам узвышаўся **сабор**[2] у імя Святой Сафіі (Сафійскі сабор). Гэта белакаменнае дзіва будавалі палачане разам з заморскімі майстрамі. Па сваёй велічы і прыгажосці ён не саступаў іншым саборам таго часу ў Кіеве і Ноўгарадзе.

Сафійскі сабор — самая старажытная мураваная пабудова на тэрыторыі Беларусі. Асноўным аздабленнем сабора з'яўляліся купалы. Яны выглядалі быццам шлемы старажытных воінаў. За высокімі магут-

[1] **Дзядзі́нец** — умацаваны цэнтр старажытнага горада.
[2] **Сабо́р** — галоўная царква ў горадзе.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ымі сценамі сабора можна было схавацца ад ворага. Менавіта войны былі прычынай таго, што сабор неаднойчы гарэў і разбураўся. Але ён заўсёды аднаўляўся. У сённяшнім выглядзе Полацкая Сафія існуе з 1750 года.



Полацкі Сафійскі сабор

Праславіўся Усяслаў Чарадзей і тым, што быў смелы і рашучы. Народнае паданне апавядае, што сабраў малады князь аж сем тысяч воінаў. Воіны ўсе маладыя, а самому княжычу было тады пятнаццаць гадоў. Не раз Усяслаў адстойваў самастойнасць Полацкай зямлі.

Аднойчы вялікае войска ворага напала на Полацкую зямлю і падышло да Мінска. Неўзабаве сюды рушыў і Усяслаў са сваім войскам. У ***сакавіку 1067 года*** на рацэ ***Нямізе*** адбылася жудасная крывавая бітва, у якой загінула шмат воінаў. Усяслаў з рэшткамі свайго войска быў вымушаны адступіць. Але і ворагі не адважыліся ісці на Полацк. Пра гэту бітву пісаў старажытны паэт:

*На Нямізе снапы сцелюць галовамі,*
*Жалезнымі малоцяць цапамі,*
*Жыццё кладуць на таку злюцела,*
*Веюць душу ад цела...*

Пражыў Усяслаў Чарадзей больш за семдзесят гадоў. Пры яго кіраванні Полацкае княства дасягнула найбольшай велічы і магутнасці,



Бітва на Нямізе.
Карціна М. Філіповіча



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Адзенне і зброя старажытнага воіна



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

праславілася сярод іншых дзяржаў. Сваім сынам і ўсім людзям Усяслаў Чарадзей пакінуў запавет — любіць сваю родную зямлю. У Полацку ў гонар Усяслава Чарадзея пастаўлены помнік — бронзавая выява князя на кані.

**1.** Хто такі Усяслаў Чарадзей?
**2.** За што яго празвалі Чарадзеем?
**3.** Што такое сабор?
**4.** Як называўся сабор у Полацку?
**5.** У якім годзе адбылася бітва на Нямізе? Выберыце правільны адказ:
а) у 1000 годзе;
б) у 1017 годзе;
в) у 1067 годзе.
**6.** Чым слаўны Усяслаў Чарадзей і чаму мы ім ганарымся?
**7.** Колькі гадоў пражыў Усяслаў Чарадзей? Выберыце правільны адказ:
а) больш за 70 гадоў;
б) больш за 80 гадоў.

**1.** Складзіце план і раскажыце па ім пра Усяслава Чарадзея.
**2.** З дапамогай малюнка на с. 56 адкажыце, аб чым сведчаць выявы воінаў і меч у руках Усяслава Чарадзея.
**3.** Разгледзьце малюнак «Полацкі Сафійскі сабор» на с. 57. Зрабіце пераказ паводле наступнага плана.
1) Назва будынка.
2) Месца і час яго будаўніцтва.
3) Прызначэнне будынка.
4) Знешні выгляд будынка.
5) Гістарычная каштоўнасць пабудовы.
**4.** Разгледзьце малюнкак на с. 58. Апішыце з яго дапамогай адзенне і зброю старажытнага воіна.
**5.** Прачытайце.
*Пабудаваў у Полацку новы вялікі замак. А калі княству пагражала небяспека, вымаў меч і смела кідаўся ў бой. Мудра княжыў. Пражыў больш за 70 гадоў.*
Пра якога князя ідзе гаворка? Выберыце правільны адказ:
а) Рагвалод;
б) Ізяслаў;
в) Усяслаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**6.** Растлумачце значэнне кожнага слова: князь, дружына, сабор, дзядзінец, паданне. Праверце па гістарычным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка правільнасць вашых тлумачэнняў.

**1.** Зрабіце разам з аднакласнікамі ўяўнае падарожжа па сучасным Полацку. Што сёння ў абліччы горада нагадвае пра яго далёкае мінулае?
**2.** Даведайцеся, у якіх гарадах былі пабудаваны храмы ў гонар Святой Сафіі. Пакажыце на школьнай карце Кіеўскай Русі гэтыя гарады.

На тэрыторыі Беларусі больш за 20 тысяч рэк і рачулак. Самыя буйны́я з іх — Нёман, Заходняя Дзвіна, Дняпро, Прыпяць, Сож, Бярэзіна. Кожная мае сваю непаўторную гісторыю.

Але ёсць сярод рэк Беларусі адна вельмі незвычайная. Гэта старажытная рака Няміга. Спакойна і шырока яна працякала ў Мінску ў тыя часы, калі існавала Полацкае княства. Многае бачыла рака на сваім вяку. Яна практычна была адной з гарадскіх вуліц. Тагачасныя гарадскія жыхары плавалі па ёй на чаўнах. У межах горада праз Нямігу былі пракладзены шматлікія масты. У некаторых месцах узводзіліся суцэльныя драўляныя насцілы. На іх ладзілі разнастайныя кірмашы. Але найбольш славіўся рыбны кірмаш. Рыбу прадавалі вэнджаную, салёную, вяленую і, вядома, жывую. Кажуць, калі гандляры не паспявалі за дзень прадаць усю жывую рыбу, то ўвечары яе выпускалі ў Нямігу. Паступова горад пашыраўся, і ўздоўж вуліцы-ракі ўзніклі фабрыкі. Яны забруджвалі яе сваімі сцёкамі. З цягам часу рака змялела і звузілася.

Рака Няміга і сёння ёсць у Мінску, але вада яе цячэ па падземнай трубе. Тая труба праходзіць якраз пад вуліцай Нямігай.

## 15. Ефрасіння Полацкая

1. Дзе з'явіліся першыя манастыры ў Беларусі?
2. Назавіце імя князёўны, якая заснавала манастыр у Заслаўі.
3. Якую ролю адыгрывалі манастыры ў развіцці грамадства?

Падрастала ў Полацку ўнучка князя Усяслава Чарадзея ***Прадслава***. Яна была надзвычай прыгожая. З самага дзяцінства Прадслава дапа-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

магала людзям. У час абароны зямлі ад ворагаў дзяўчынка даглядала параненых воінаў. Каму вады паднясе, каму слова ласкавае скажа...

Калі прыгажуня Прадслава вырасла, бацька вырашыў аддаць яе замуж за якога-небудзь князя. Але Прадслава выбрала зусім іншы лёс. Яна прысвяціла сваё жыццё служэнню Богу і бедным людзям. Для гэтага яна сышла ў манастыр. Стаўшы манашкай, Прадслава атрымала новае імя — ***Ефрасіння***. Пачалося новае жыццё. Ефрасіння жыла пры Сафійскім саборы. Там яна шмат чытала і займалася перапісваннем кніг. Перапісаныя кнігі прадаваліся, а грошы раздаваліся бедным. Манастыры дапамагалі гаротным людзям, дзяліліся сваім прыбыткам, давалі прытулак падарожнікам.

У тыя далёкія часы дзеці вучыліся ў асноўным у школах пры манастырах і цэрквах. Ефрасіння пры манастыры заснавала школу для дзяўчынак. Яна вучыла іх чытанню і пісьму, а таксама розным жаночым рамёствам. Дзяўчынкі шылі, вышывалі, даглядалі хворых і нямоглых.

Слава пра дабрадзейнасць Ефрасінні разышлася далёка за межы Полацка. Людзі дзякавалі за дабро, якое яна рабіла для іх. Ефрасіння сама паважала людзей і вучыла іх шанаваць адзін аднаго, не дапускаць вайны. «Зброя, — казала яна, — прыносіць у хату замест хлеба горыч і слёзы». Ва ўсім свеце яе пачалі зваць Ефрасінняй Полацкай.


Ефрасіння Полацкая

У Полацку, непадалёку ад ракі Палаты́, стаіць царква. Яна была пабудавана па жаданні князёўны-манашкі. У старажытным паданні гаворыцца, што аднойчы ноччу ўбачыла Ефрасіння **анёла**[1]. Ён і параіў ёй пабудаваць гэтую царкву.

Царкву Святога Спаса пад кіраўніцтвам дойліда ***Іаана*** ўзвялі вельмі хутка — за 30 тыдняў. Такую назву далі

[1] **Анёл** — уяўны служыцель Бога, праз якога ён абвяшчае людзям сваю волю.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку



Крыж Ефрасінні Полацкай

царкве ў гонар Ісуса Хрыста. Потым царкву пачалі называць Спаса-Ефрасіннеўскай.

Прыгожая, нібыта лялечная, белакаменная царква захавалася да нашых дзён. Яна невялікая, але высокая, быццам вежа, з магутнымі сценамі. У яе адзін купал, высокія вокны. Галоўная каштоўнасць унутранай прасторы царквы — дзівосныя **фрэскі**[1]. Гэтыя роспісы былі выяўлены праз шмат стагоддзяў пад тынкоўкай. Лічаць, што на адной з фрэсак змешчаны вобраз самой Ефрасінні. Царква нагадвае белую птушачку, якая быццам апусцілася з неба адпачыць на зялёным лузе.

У ***1161 годзе*** па заказе Ефрасінні майстар ***Лазар Богша*** зрабіў ***крыж***. У паданні гаворыцца, што ён дапамагаў людзям хворым і абяздоленым. Крыж Ефрасінні Полацкай — святыня нашага народа. У гады Вялікай Айчыннай вайны крыж знік з музея ў Магілёве. Дагэтуль вядуцца яго пошукі. Сёння зроблена яго дакладная копія. Брэсцкі майстар Мікалай

[1] **Фрэ́ска** — роспіс сцен па тынкоўцы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Кузьміч аднавіў вобраз святога крыжа. Крыж урачыста ўскладзены ў Спаса-Ефрасіннеўскай царкве. Тут захоўваюцца і ***мошчы (астанкі)*** святой Ефрасінні. Да іх прыходзяць пакланіцца шмат людзей.



Выява святой Ефрасінні ў Спаса-Ефрасіннеўскай царкве

Колькі пражыла Ефрасіння Полацкая, дакладна ніхто не ведае. За сваё жыццё яна зрабіла шмат добрых спраў. Светлая памяць пра яе засталася на зямлі. Яна стала першай жанчынай сярод усходніх славян, якую царква абвясціла святой. Мы ж, беларусы, ушаноўваем памяць Ефрасінні Полацкай і лічым яе нябеснай заступніцай нашай зямлі. Каля помніка святой заўсёды кветкі ад удзячных нашчадкаў.

**1.** Унучкай якога знакамітага князя была князёўна Прадслава?
**2.** Які лёс выбрала Прадслава?
**3.** Чаму Прадслава пайшла ў манастыр?
**4.** Якое імя яна атрымала, калі стала манашкай?
**5.** Раскажыце пра дзейнасць Ефрасінні ў манастыры.
**6.** Які крыж з'яўляецца святыняй нашага народа?
**7.** Хто па заказе Ефрасінні зрабіў крыж?
**8.** У якім годзе (стагоддзі) быў зроблены гэты крыж?
**9*.** Растлумачце выразы: «Ефрасіння Полацкая — нябесная заступніца беларускай зямлі», «царква абвясціла яе святой».
**10.** Якія пачуцці выклікаў у вас расказ пра Ефрасінню Полацкую і яе жыццё?

**1.** Разгледзьце малюнак «Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку» на с. 62. Зрабіце пераказ паводле наступнага плана.
1) Назва будынка.
2) Месца і час яго будаўніцтва.
3) Прызначэнне будынка.
4) Знешні выгляд будынка.
5) Гістарычная каштоўнасць пабудовы.

Выкарыстоўвайце словы: прыгожая, нібыта лялечная, белакаменная, нагадвае птушачку, купал.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Апішыце крыж Ефрасінні Полацкай. Скарыстайцеся малюнкам на с. 62 і дадатковым тэкстам у рубрыцы «Гэта цікава», прыведзеным ніжэй.

Зрабіце ўяўнае падарожжа ў Спаса-Ефрасіннеўскую царкву з дапамогай кніг і інтэрнэту. Апішыце галоўныя каштоўнасці ўнутранай прасторы сабора.

Аснова Крыжа Ефрасінні Полацкай зроблена з кіпарысу. Вышыня крыжа — 51 сантыметр. Да драўлянай асновы крыжа былі прымацаваны залатыя пласціны, а таксама каштоўныя камяні. На залатых пласцінах змяшчаліся выявы Ісуса Хрыста, Маці Божай і святых. У спецыяльных гнёздах знаходзіліся хрысціянскія каштоўнасці. Гэта кроплі крыві Ісуса Хрыста і кавалачак ад драўлянага крыжа, на якім яго распялі. Па баках крыж быў аздоблены пазалочанымі срэбнымі пласцінамі.

Паданне сведчыць: крыж свяціўся і ў самай непрагляднай цемры. Хворым ён вяртаў здароўе, зняверaным і знясіленым — надзею на лепшае жыццё. Каб убачыць гэты цуд на свае вочы і пакланіцца яму, у горад Полацк здалёку і зблізку прыходзілі вернікі.

## 16. Асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага

1. Як называюцца старажытныя кнігі, у якіх падзеі запісваліся па гадах?
2. З якіх яшчэ твораў мы даведваемся пра мінулае?

Нашы продкі добра разумелі значэнне кнігі. Даўным-даўно адзін з летапісцаў сказаў так: «Кнігі — гэта рэкі, якія напойваюць увесь Сусвет. Ад іх зыходзіць мудрасць».

Ефрасіння Полацкая была першым **асветнікам**[1] на нашай зямлі. Усё жыццё яна клапацілася пра тое, каб стала больш пісьменных людзей. Пад кіраўніцтвам Ефрасінні ў заснаваным ёю манастыры манашкі перапісвалі кнігі. Гэта была справа няпростая. Яна займала вельмі шмат часу. Над кожнай кнігай працавалі не адзін год. Каб па-

[1] **Асвéтнік** — чалавек, які займаецца пашырэннем адукацыі, пісьменнасці, кніжнай справы ў грамадстве.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Летапісец



Пераплёт (вокладка) рукапіснай кнігі

скорыць справу, адны перапісвалі тэксты, іншыя рабілі малюнкі. Кожная літара старанна выпісвалася. Пачатковыя літары аздабляліся прыгожымі ўзорамі розных колераў. Кнігі змяшчалі мноства малюнкаў.

Рукапісныя кнігі былі вялікія і цяжкія, бо аркушы былі не з паперы, а са скуры жывёл. Для гэтага спецыяльна апрацоўвалі цялячую, авечую ці казіную скуру, каб надаць ёй асаблівую тонкасць. Вокладкі кніг рабілі з дошчачак, абцягвалі скурай, упрыгожвалі каштоўнымі камянямі. Да таго ж пераплёты зашпільваліся на металічныя за́сцежкі.



Кірыла Тураўскі

Па перапісаных кнігах вучыліся дзеці. Іх чыталі адукаваныя людзі. Кнігі разыходзіліся не толькі па Полацкай зямлі, але і за яе межамі. Галоўнымі цэнтрамі перапісвання кніг у Беларусі былі гарады Полацк і Тураў.

Пашырала пісьменнасць на нашай зямлі не адна Ефрасіння Полацкая. Другім вядомым асветнікам ***12 стагоддзя*** быў ***Кірыла Тураўскі***.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Старонка рукапіснай кнігі



Старажытныя пісалы

Ён нарадзіўся ў багатай сям'і ў горадзе Тураве. Атрымаў знакаміты асветнік выдатную для таго часу адукацыю. Калі Кірыла вырас, то стаў манахам. Каля 1160 года ён быў прызначаны на высокі царкоўны пост. У Тураве прайшло ўсё яго жыццё. Кірыла Тураўскі пісаў творы, якія ўтрымлівалі павучанні, як павінны жыць людзі.

Каб замаліць людскія грахі, Кірыла Тураўскі стаў пустэльнікам. Ён добраахвотна зачыніўся ў высокай вежы-званіцы на беразе ракі Прыпяць. Там ён доўгія месяцы знаходзіўся без людзей. Яму туды насілі толькі хлеб і ваду. У гэты час манах пісаў рэлігійныя творы і маліўся. Яго літаратурная спадчына вядома і цяпер. Ён заклікаў людзей любіць адно аднаго. Ён асуджаў паклёпніцтва, ганарлівасць, зайздрасць, скупасць і іншыя чалавечыя заганы. Кірыла быў не толькі цудоўным пісьменнікам, але і выдатным прамоўцам. Вось чаму яшчэ пры жыцці яго называлі Залатавустам. Ён, як і Ефрасіння Полацкая, прылічаны да святых.

З веку ў век перапісваліся творы Кірылы Тураўскага. Такім чынам яны дайшлі і да нашых дзён. Яны сведчаць пра тое, што зямля беларуская заўсёды была багатая на таленавітых людзей.

1. Чаму Ефрасінню Полацкую мы называем першай асветніцай на нашай зямлі?
2. Дзе і кім перапісваліся старажытныя кнігі?
3. Як рабіліся рукапісныя кнігі?
4. Чым праславіўся Кірыла Тураўскі?
5. Як называлі Кірылу Тураўскага сучаснікі? Выберыце правільны адказ:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

а) вучоным;
б) манахам;
в) Залатавустам.

**6*.** Растлумачце словы: «Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі — першыя асветнікі беларускай зямлі».

**7*.** Знайдзіце ў тэксце словы летапісца пра значэнне кнігі. Як вы разумееце іх?

Разгледзьце малюнак «Кірыла Тураўскі» на с. 65. Адкажыце, пра што сведчыць кніга, якую гартае славуты асветнік, і ягонае адзенне.

**1.** У старажытныя часы літары высякалі на камянях, выціскалі на гліняных плітках. Для пісьма людзі ў розныя часы выкарыстоўвалі зубіла і разец.

Пазней нашы продкі пачалі пісаць на бяросце. Таксама выкарыстоўваліся і дошчачкі, пакрытыя тонкім слоем воску. На бяросце літары надрапваліся, а на дошчачках яны выціскаліся на воску металічнымі ці касцянымі палачкамі. Палачкі называліся пісаламі. Адзін канец пісала быў востры, ім выводзіліся літары. Другім канцом у форме лапатачкі няцяжка было загладзіць памылкі на воску. У краінах свету выкарыстоўвалі розныя матэрыялы. Напрыклад, адмыслова апрацоўвалі скуру жывёл. У Кітаі кнігі спачатку пісалі на шоўку. Затым кітайскія майстры першымі вынайшлі паперу.

Праз шмат стагоддзяў пачалі вырабляць паперу і ў Еўропе. На паперы пісалі завостранай палачкай ці гусіным пяром. Значна пазней да нас прыйшлі ручкі, больш ці менш падобныя на сучасныя.

Берасцяныя граматы — пісьмы і дакументы на бяросце — былі знойдзены вучонымі пры раскопках у Віцебску і Мсціславе.



Берасцяная грамата з Віцебска



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Дзейнасць асветнікаў паўплывала на пашырэнне адукацыі сярод людзей, іх пісьменнасці, кніжнай справы ў грамадстве. На беларускай зямлі было шмат прыхільнікаў асветы. Напрыклад, у часы Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага жыў вядомы царкоўны дзеяч і асветнік Клімент Смаляціч. На жаль, звестак пра яго жыццё і дзейнасць захавалася вельмі мала. Ён згадваецца ў летапісе пад 1147 годам. Пра яго гаворыцца, што «ён быў кніжнікам, філосафам, якіх на Русі не было яшчэ». У сваіх творах Клімент Смаляціч імкнуўся далучыць людзей да высокіх духоўных каштоўнасцей.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 17—18. Народны каляндар і паходжанне беларускіх святаў

1. Чаму ў старажытнасці існавала мнагабожжа?
2. Што такое хрысціянства?
3. Успомніце, што такое абрад.

Клопат чалавека на працягу года пра зямлю і ўраджай прывёў да ўзнікнення ***народнага календара***. Ён утрымліваў гадавое кола народных **абрадаў**[1] і святаў. Яны спраўляліся, каб забяспечыць высокі ўраджай, дабрабыт сям'і, захаваць жывёлу.

Беларускія народныя святы маюць старажытнае паходжанне. Іх узнікненне звязана з прыроднымі з'явамі — сонцастаяннем, раўнадзенствам, а таксама з гаспадарчай дзейнасцю чалавека. Па народным календары і святах людзі размяркоўвалі час працы і адпачынку. Яны ведалі, калі можна было брацца за тую ці іншую працу, а калі весяліцца.

Некаторыя са старажытных святаў дайшлі і да нашых дзён. Напрыклад, зажынкі — пачатак збору ўраджаю. Дажынкі — свята заканчэння збору ўраджаю. Масленіца — свята праводзін зімы і пачатку вясны. Новы год у славян пачынаўся з сакавіка. Гэта было звязана з пачаткам працы ў полі.

У дні кожнага свята выконваліся асаблівыя абрады. Пазней царква дастасавала да іх свае рэлігійныя святы і абрады. Найбольш вялікімі і ўрачыстымі святамі ў нашых продкаў былі зімовыя Каляды, вясновы Вялікдзень, летняе Купалле і восеньскія Пакровы.

***Каляды*** святкаваліся з самых старажытных часоў. Яны супадалі з сонцастаяннем, калі дзень пачынаў павялічвацца, а ноч — памяншацца. У народзе казалі: «Ад Каляд сонца паварочвае на лета».

Напярэдадні і ў час Каляд выконваліся абавязковыя абрады. Прыбіралася хата, гатаваліся посныя стравы. Галоўнае месца на стале займала куцця — каша з ячных круп. Падавалі таксама селядцы з алеем, рыбу, аладкі з цёртым макам, грыбныя стравы, аўсяны кісель. Калі на

[1] **Абрáд** — дзеянні людзей, у якіх выяўляюцца іх вераванні.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

небе ўзыходзіла першая зорка, гаспадар і ўся сям'я збіраліся за сталом, які быў пакрыты белым абрусам. У калядны вечар варажылі, якім будзе ўраджай, якое будзе надвор'е, што зменіцца ў жыцці людзей. Для гэтага і скарыстоўвалася сена, якое гаспадыня рассцілала пад белым абрусам. Пасля вячэры гаспадар і іншыя члены сям'і выцягвалі з-пад абруса сухую сцяблінку. Па яе даўжыні вызначалі, які будзе ў наступным годзе ўраджай збожжа, бульбы, ільну, і іншае.

Вялікую ўвагу звярталі на надвор'е ў першы дзень Каляд. Казалі: «Калі на Каляды марозна, лета будзе гарачае і сухое».

На другі дзень свята дарослыя хлопцы і дзяўчаты, а таксама дзеці пераапраналіся ў розных жывёл, цыганоў. Пачыналася ***калядаванне***. Пераапранутыя ***калядоўнікі*** хадзілі ад адной хаты да другой, спявалі песні, гралі на скрыпцы і бубне, весела скакалі. Яны жадалі гаспадарам здароўя, шчасця, добрага ўраджаю.

У кожнай хаце калядоўнікі атрымлівалі падарункі: каўбасы, духмяныя булкі, сала. Гэты старадаўні абрад не забыты і ў наш час.

На Каляды забаранялася выконваць розную хатнюю работу: шыць, прасці, калоць дровы, прыбіраць у хаце.



Калядоўнікі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Велікодныя стравы

***Вялікдзень*** быў самым урачыстым вясновым святам. Першапачаткова ён адзначаўся нашымі продкамі ў гонар сонца і абуджэння прыроды. А з прыняццем хрысціянства Вялікдзень з'яўляецца святам ***Уваскрэсення Хрыста***. Яго першы дзень святкаваўся ў нядзелю.

Пачыналася ўсё з усяночнай. У цэрквах, касцёлах на працягу ночы адбываліся святочныя службы, свяцілі пірагі, булкі, соль, пафарбаваныя ў чырвоны колер яйкі. Напярэдадні свята выпякалі святочны пірог. Раніцай на стол ставілася святочная ежа. За сталом збіралася ўся сям'я. Пасля поўдня хадзілі ў госці.

На Вялікдзень з даўніх часоў выконваліся пэўныя абрады. Некаторыя з іх дайшлі да нашых дзён, напрыклад, гульня ў біткі. Адзін з удзельнікаў забавы трымае ў руцэ пафарбаванае яйка, а другі б'е па ім сваім яйкам. Чыё яйка разбіваецца, той прайграе. Пераможца забірае сабе разбітае яйка. З далёкага мінулага захавалася таксама традыцыя несці велікодныя яйкі і кавалачак велікоднага пірага на магілы сваіх родзічаў.

Увечары святкаванне працягвалася. Гучала музыка і спевы. Песні выконваліся пад вокнамі хат. Гаспадары за гэта шчодра адорвалі спевакоў пірагамі, булкамі, чырвонымі яйкамі. Усе радаваліся надыходу вясны, жадалі адзін аднаму ўраджаю і дабрабыту.

Самым значным летнім святам было ***Купалле***. Яно святкавалася роўна праз паўгода пасля Каляд, у самую кароткую летнюю ноч. Яна, паводле ўяўленняў людзей, была чароўнай.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Напярэдадні свята дзяўчаты збіралі кветкі на вянок. Увечары на беразе рэчкі або возера распальвалі вогнішча. Высока над вогнішчам на доўгай жэрдцы ўздымалі запаленае кола, якое сімвалізавала сонца.

Каля вогнішча юнакі і дзяўчаты вадзілі карагоды, хлопцы скакалі праз агонь. Дзяўчаты пускалі вянкі па вадзе і варажылі пра будучае замужжа. Кожная сачыла за сваім вянком — паплыве ён далека ці прыстане да берага. Людзі верылі, што ў купальскую ноч зацвітае папараць. Хто сарве папараць-кветку, той будзе шчаслівы. Заканчвалася свята купаннем у рацэ і качаннем у ранішняй расе. Людзі верылі, што раса ў гэтую ноч валодае незвычайнай сілай.

Людзі таксама верылі, што ў купальскую ноч трэба сцерагчыся нечысці, якая імкнецца нашкодзіць гаспадарцы чалавека. Таму ў гэтую ноч людзі не пускалі коней на пашу. На парогах хлявоў клалі пукі крапівы, старыя косы і сярпы. Гэта рабілася, каб туды не прабраліся ведзьмы і не адабралі малако ў кароў, не нашкодзілі коням. У жыта кідалі чорную галавешку з купальскага вогнішча. Людзі верылі, што так адгоняць ад жыта нячыстую сілу, якая можа зрабіць ніву неўрадлівай.



Купальская ноч



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Вячоркі

І сёння Купалле — адно з любімых святаў. Яго святкуюць па ўсёй Беларусі.

***Пакровы*** — старажытнае свята заканчэння палявых работ і пачатку зімовай працы. А адзначалася яно ў кастрычніку. Народная прымаўка гаворыць: «Прыйшлі Пакровы, пытаюць, ці да зімы гатовы». Пасля заканчэння свята сяляне вазілі з лесу дровы. Жывёла не выводзілася з хлява. Пачыналася пара вясковых вяселляў. У народзе казалі: «Пакровы пакрываюць траву лісцем, зямлю — снегам, ваду — лёдам, а дзяўчат — шлюбным чапцом». Вечарам перад святам дзяўчаты варажылі пра замужжа і сваіх жаніхоў.

З Пакроваў пачыналіся вячоркі. Жанчыны і дзяўчаты збіраліся доўгімі восеньскімі і зімовымі вечарамі, каб прасці, ткаць, вышываць. Яны рабілі сваю звычайную працу і спявалі розныя народныя песні. Вячоркі працягваліся аж да Вялікадня.

1. Для чаго нашы продкі склалі народны каляндар?
2. З якой мэтай у старадаўнія часы спраўляліся святы і абрады?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Назавіце найбольш вялікія і ўрачыстыя беларускія святы. З чым звязана ўзнікненне гэтых святаў?

**4.** Як нашы продкі святкавалі:

а) Каляды;
б) Вялікдзень;
в) Купалле;
г) Пакровы?

**5.** Да якіх свят маюць дачыненне:

а) пафарбаваныя яйкі;
б) абраз;
в) бубен, маска казы;
г) вянкі з кветак?

Для адказу выкарыстайце малюнкі на с. 70—73.

**6.** Якія старажытныя святы адзначаюць у вашай мясцовасці цяпер?

Раскажыце пра абрады ў час святкавання:

а) Каляд;
б) Вялікадня;
в) Купалля;
г) Пакроваў.

Выкарыстайце малюнкі ў параграфе.

**1.** Як адзначаюцца ў вашай мясцовасці беларускія народныя святы сёння? Раскажыце.

**2*.** Як адзначаліся беларускія народныя святы ў старажытнасці? Як яны святкуюцца цяпер? Вызначыце адрозненні.

**3.** Ці карыстаюцца сёння людзі народным календаром? Калі да яго звяртаюцца? Распытайце сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў.

**1.** Спрадвеку нашы продкі жылі па календары, у якім аб'ядналіся вопыт, жыццёвыя назіранні і парады. Адсюль народныя прыказкі, прымаўкі і прыкметы.

***Студзень.*** Самы халодны месяц года — студзень. Назва яго паходзіць ад слова «сцюдзёны». Каб не галадаць і не замерзнуць, кожны гаспадар загадзя назапашваў прадукты харчавання, дровы, шыў цёплую вопратку. У студзені святкуюць Каляды.

*Студзень хаты студзіць, рана гаспадыню будзіць.*
*Студзень пагодны — год будзе плодны.*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Як студзень цёплы на лік, дык завідны сакавік.*

***Люты.*** У народнай прыказцы гаворыцца: «Спытае люты, ці добра абуты». Люты — апошні месяц зімы, але яна яшчэ ў поўнай сіле — лютуе. У лютым спраўляецца Масленіца — свята праводзінаў зімы.
*Як снегу ў лютым, столькі травы ўлетку.*

***Сакавік.*** Паводле народнай прыказкі, «сакавік часамі снегам сее, а часамі — сонцам грэе». Назва месяца паходзіць ад слова «сок». У гэтую пару ён пачынае цячы з дрэў. У сакавіку спраўляецца свята Гуканне вясны.
*Люты вады пусціць, а сакавік падбярэ.*
*Як у сакавіку туман, дык у жніва дожджык — пан.*
*Сакавік зялёны — ураджай благі.*

***Красавік.*** Народная прыказка гаворыць: «У красавіку дождж праходзіць, сонца грэе — тады ўсякі не збяднее». Назва месяца паходзіць ад слова «красавацъ», бо ў гэты час з'яўляюцца першыя кветкі. У старажытныя часы гэты месяц называўся «квецень».
*У красавіку грымот — цёплым будзе год.*
*Красавік з вадою — май з травою.*
*Пчолы ў красавіку не вылецелі — чакай халадоў.*
*Зязюля пачне кукаваць на голы (не зазелянелы) лес, то год будзе неўрадлівы.*

***Май.*** Згодна з народнай прыказкай, «май — і пад кустом рай». Раней месяц называўся «травень» — ад слова «трава». У гэтым месяцы ўся зямля пакрываецца зелянінай. Сяляне выганяюць свойскую жывёлу на пашу пасля зімы.
*Мокры май — будзе жыта як гай.*
*Май халодны — год хлебародны.*

***Чэрвень.*** Паводле народнай прыказкі, «лета на зіму працуе». Магчыма, месяц называецца так таму, што ў гэты час ягады набываюць чырвоны колер. У чэрвені асноўны занятак селяніна — нарыхтоўка сена на зіму для жывёлы.
*У чэрвені ўбачыць гаспадар, што Бог дасць у дар.*

***Ліпень.*** Народная прыказка гаворыць: «Хто ў ліпені на полі пацее, таго ўзімку печка грэе». Назва месяца ўзнікла ад слова «ліпа» — дрэва якраз цвіце ў гэтую пару. Ліпень дорыць чалавеку спелыя



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

лясныя ягады, пачынаюць расці грыбы. У ліпені адзначаецца свята Купалле.

*Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.*

***Жнівень.*** Згодна з народнай прыказкай, «кожная хата ў жніўні багата». Назва месяца ўзнікла ад слова «жніво», бо ў гэты час жалі збожжа. Пасля збору ўраджаю спраўляліся дажынкі — свята канца жніва.

*Хто ў жніўні гуляе, той зімой галадае.*

***Верасень.*** У народнай прымаўцы гаворыцца: «Халодны верасень, але сыты». Назва месяца паходзіць ад назвы вераса — расліны, якая якраз цвіце гэтай парой. Спраўляецца свята Багач. Гэта старажытнае земляробчае свята. У верасні на сяле заканчваліся асноўныя палявыя работы.

*У верасні ліст на дрэве не трымаецца.*

***Кастрычнік.*** Паводле народнай прыказкі, «у кастрычніку і хата з дрывамі, і мужык з лапцямі». У гэтым месяцы ўсе перадзімовыя работы ў полі завяршаліся.

*Кастрычнік ходзіць па краю і гоніць птушак з гаю.*

***Лістапад.*** Народная прымаўка гаворыць: «Прыйшоў лістапад — кармі скацінку, брат». Месяц так называецца, бо ў гэты час лісце ападае з дрэў.

*У лістападзе гола ў садзе.*

*Лістапад снегу навее — хлеба прыбудзе, а вадою разальецца — сена набярэцца.*

***Снежань.*** Паводле народнай прыказкі, «мароз у снежні і снег вышэй хаты — будзе год тады багаты». Назва месяца паходзіць ад слова «снег».

*Снежань зіму пачынае, а год канчае.*

**2.** Галоўныя народныя святы звязаны з земляробчымі працамі. З даўніх часоў на нашай зямлі існавала свята ***жніво***. Яно было звязана са зборам ураджаю. Падчас свята спраўляліся разнастайныя абрады. Сярод іх вылучаліся ***дажынкі***, калі на полі зжыналіся апошнія снапы збожжа. Самы апошні сноп перавязваўся чырвонай і белай стужкамі. З самых буйных каласоў звівалі вянок і ўсклад-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Дажынкі

валі на галаву жнейкі. Пасля ішлі ў вёску і спявалі радасныя песні. Сёння свята дажынкі святкуецца на дзяржаўным узроўні. З усёй Беларусі ў адзін з гарадоў з’язджаюцца лепшыя працаўнікі сельскай гаспадаркі. Ім аддаецца пашана і ўручаюцца разнастайныя ўзнагароды за іх працу. На свяце прысутнічае шмат людзей. Ладзяцца выступленні лепшых мастацкіх калектываў, ярмаркі народных рамёстваў. Беларускія гарады спаборнічаюць паміж сабой за ганаровае права святкаваць рэспубліканскае свята «Дажынкі».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 19. Узнікненне старажытных гарадоў, іх выгляд

1. Які горад самы старажытны на тэрыторыі Беларусі? Пакажыце яго на карце.
2. Чаму старажытныя паселішчы абгароджваліся з усіх бакоў?
3. Што такое гарадзішча?

Варожасць паміж плямёнамі ў многім стала прычынай узнікнення вялікіх умацаваных паселішчаў. Яны атрымалі назву ***«гарады»***.

Назва «горад», як і «гарадзішча», паходзіць ад словаў «гарадзіць», «абгароджваць». Паселішчы, якія знаходзіліся ў месцах, зручных для заняткаў рамяством і гандлем, таксама ператвараліся ў гарады. Такія паселішчы ўзнікалі на скрыжаванні дарог, на берагах рэк, каля перапраў.

Годам заснавання горада прынята лічыць дату, пад якой ён упершыню згадваецца ў старажытным летапісе.

Амаль кожны старажытны горад меў умацаваны цэнтр. Яго спачатку называлі ***дзядзінцам***, пазней — ***замкам***. У ім жыў князь, які кі-



Старажытны горад



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

раваў у гэтай зямлі. Вакол дзядзінца размяшчаліся дамы дружыннікаў князя і іншых багатых людзей. На ўскраінах горада жылі простыя людзі.

Дзядзінец быў акружаны з усіх бакоў высокім насыпным ***валам***. Вал меў абарончае значэнне. На ім будаваліся магутныя драўляныя сцены. Абарончы вал апяразваў глыбокі ***роў***, праз які быў перакінуты ***мост***. Праз мост з дзядзінца ў горад можна было прайсці толькі ўдзень, з вечара на ўсю ноч яго падымалі.

Вакол усяго горада часта таксама будаваліся абарончыя сцены (спачатку драўляныя, пазней мураваныя). Над сценамі ўзвышаліся **вежы**[1]. Яны знаходзіліся на пэўнай адлегласці адна ад адной. Іх узводзілі ў кутах абарончых сцен. Таксама вежы абавязкова ставіліся над брамаю і там, дзе ворагу лягчэй было ўварвацца ў горад. З іх жыхары горада маглі ліць на ворагаў расплаўленую смалу, кіпень, кідаць камяні.

У сцяне рабілася ***гарадская брама (вароты)***. Яна абабівалася жалезам. Вароты і дзядзінца, і горада на ноч зачыняліся. За імі пільна сачылі вартавыя. Калі чалавек спазняўся ў горад, ён заставаўся начаваць у полі. Ад варот у розных напрамках пачыналіся ***вуліцы*** горада. Уздоўж гэтых вуліц і жыла асноўная частка простых гараджан. Іх дамы былі невялікія. Гаспадарчыя пабудовы знаходзіліся побач з домам ці на процілеглым баку вуліцы. Калі ў доме запальвалі печ, то дым выходзіў праз вокны і дзверы.

Самымі прыгожымі збудаваннямі ў старажытным горадзе былі ***палац*** князя, дамы дружыннікаў і багатых гараджан, а таксама ***цэрквы***. Ужо ў тыя часы дзверы і вокны дамоў заможных людзей аздаблялі разьбой па дрэве. Каб яны не былі падобныя адзін да аднаго, іх фарбавалі ў розныя колеры. Яркія фарбы зіхацелі на сонцы.

Цэрквы ў горадзе былі драўляныя і мураваныя. Ужо здалёк былі відаць іх пазалочаныя купалы. Званы цэркваў збіралі людзей як на службу, так і на народнае веча.

**1.** Якія ўмацаванні меў старажытны горад? Якую асаблівасць мелі старажытныя гарады?

[1] **Ве́жа** — высокае і вузкае абарончае збудаванне з дрэва ці цэглы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

2. Ад якіх слоў паходзіць назва «горад»?
3. Для чаго служылі ўмацаванні?
4. Як называўся ўмацаваны цэнтр старажытнага горада?
5. Хто жыў у дзядзінцы?
6. Якія збудаванні былі самымі прыгожымі ў старажытным горадзе?
7. Апішыце дамы багатых гараджан.
8. Як выглядалі дамы простых гараджан?

Разгледзьце малюнак на с. 78 і адкажыце на наступныя пытанні.
1) Якія абарончыя збудаванні адлюстраваны на малюнку?
2*) Якія заняткі гараджан паказаны на малюнку?

Даведайцеся, ці былі паблізу вашай мясцовасці старажытныя гарады. Як яны называліся? Чым вылучаліся?

## 20. Жыццё і заняткі гараджан

1. Дзе ў старажытным горадзе знаходзіліся дамы простых гараджан?
2. Назавіце галоўныя збудаванні горада.

Жыццё ў старажытным горадзе было разнастайным. Асноўную частку яго насельніцтва складалі **рамеснікі**[1] і **гандляры**[2].

Сярод рамеснікаў асабліва паважалі ***кавалёў***. Яны выраблялі з жалеза зброю, рэчы хатняга ўжытку, прылады працы: сякеры, косы, сярпы. Нават такія рэчы, як іголкі, гузікі і іншыя неабходныя дробныя прадметы, рабіліся кавалямі.

Цанілася і майстэрства ***ганчароў***. У кожнай хаце быў разнастайны гліняны посуд, зроблены ганчарамі.

***Шаўцы*** і ***краўцы*** рабілі для гараджан адзенне і абутак. Адзенне шылася з палатняных, суконных і дарагіх шаўковых тканін. Шапкі выраблялі з футра звяроў. Кажухі, пашытыя з авечай шкуры, засцерагалі ад моцных маразоў.

Жылі ў старажытным горадзе і ***бондары***. Яны выраблялі бочкі, вёдры, дзежкі і разнастайны драўляны посуд.

[1] **Раме́снік** — чалавек, які ўручную займаўся вырабам прылад працы, посуду, зброі і іншага.
[2] **Гандля́р** — прадавец розных рэчаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Гербы рамеснікаў: кавалёў, муляроў, шаўцоў, мяснікоў, ганчароў, бондараў, цырульнікаў, краўцоў

На вялікай плошчы горада вёўся ажыўлены гандаль. Галоўнымі людзьмі тут былі гандляры. Якія толькі тавары яны не прапаноўвалі! І пакупнікоў было шмат. Князь, дружыннікі і багатыя гараджане куплялі дарагія шаўковыя тканіны, залаты і сярэбраны посуд, упрыгажэнні з каштоўнымі камянямі.

Простыя гараджане, а таксама сяляне, якія прыязджалі ў горад з найбліжэйшых вёсак, таксама спяшаліся на гандлёвую плошчу. Яны цікавіліся найперш рознымі гаспадарчымі прыладамі, таргаваліся з прадаўцамі сярпоў, кос, сякер.



У майстэрні каваля



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Прывозіліся на гарадскі рынак і замежныя тавары. Іх дастаўлялі сюды **купцы**[1] з суседніх краін. Цаніліся духмяныя прыправы для ежы, дарагія тканіны, упрыгажэнні, вырабы з металу і многае іншае. Дастаўлялі ўсё гэта па сушы на конях і па рэках на караблях.

Старажытныя гарады Беларусі гандлявалі паміж сабой і з замежнымі краінамі.

Найбольш багатыя і вядомыя рамеснікі мелі свае **гербы**[2]. Выява на іх часцей за ўсё адлюстроўвала занятак таго ці іншага рамесніка — напрыклад, бондара, муляра, ганчара, краўца, каваля.

Акрамя рамёстваў жыхары старажытнага горада займаліся таксама земляробствам, жывёлагадоўляй, рыбалоўствам.

1. Хто складаў асноўную частку насельніцтва старажытнага горада?
2. Чым займаліся рамеснікі і гандляры?
3. Што выраблялі тагачасныя рамеснікі?
4. Чым гандлявалі на гарадскім рынку?
5. Што такое герб?

**1.** Разгледзьце гербы рамеснікаў на с. 81. Паразважайце, якія выявы на гербах рамеснікаў сведчаць аб іх прафесіі:
   а) каваля;
   б) муляра;
   в) шаўца;
   г) мясніка;
   д) ганчара;
   е) бондара;
   ж) цырульніка;
   з) краўца.

**2*.** Параўнайце гербы і адкажыце, у чым асаблівасць кожнага з іх.

**3*.** Якія распазнавальныя знакі прадстаўнікоў сучасных прафесій вы ведаеце?

**4.** Складзіце расказ па малюнку «У майстэрні каваля» на с. 81.

**1.** Пакажыце на школьнай карце свету, з якімі краінамі маглі гандляваць беларускія гарады ў старажытнасці.

[1] **Купе́ц** — чалавек, які займаўся перапродажам розных тавараў.
[2] **Герб** — распазнавальны знак дзяржавы, горада, роду або асобы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Вызначыце па палітыка-адміністрацыйнай карце на форзацы вучэбнага дапаможніка, з якімі гарадамі маглі гандляваць жыхары вашага населенага пункта.

Даведайцеся, чым займаліся жыхары вашага населенага пункта ў далёкім мінулым. Якія сённяшнія заняткі людзей у вашай мясцовасці вядомы са старажытнага часу?

## 21. Адкуль пайшлі назвы беларускіх гарадоў

1. Адкуль пайшла назва горада Полацка?
2. Як узнік горад Заслаўе?
3. Які шлях зносін паміж вёскамі, гарадамі ў далёкім мінулым быў найбольш зручны?

Ужо ў 9—13 стагоддзях на тэрыторыі Беларусі існавалі буйныя гарады. У кожнага з іх свая гісторыя і свой лёс.

Назвы паселішчаў, гарадоў і вёсачак Беларусі маюць рознае паходжанне. Яны звязаны з заняткамі насельніцтва ў мінулым, імёнамі выдатных людзей, назвамі раслін і жывёл, месцазнаходжаннем паселішчаў і іншым.

Многія гарады атрымалі свае назвы ад імён князёў. Напрыклад, ***Барысаў*** названы ў гонар яго заснавальніка — полацкага князя Барыса, ***Заслаўе*** — у гонар сына Рагнеды Ізяслава.

У той час найбольш зручным шляхам зносін паміж рознымі тэрыторыямі былі рэкі. Зразумела, што і паселішчы найчасцей будаваліся на іх берагах. Таму многія назвы гарадоў Беларусі пайшлі ад назваў рэк. ***Пінск*** узнік на рацэ Піна, ***Слуцк*** — на Случы, ***Друцк*** — на Друці. Горад ***Віцебск*** вырас на Віцьбе, ***Чачэрск*** — на Чачоры, ***Бабруйск*** — на Бабруйцы.

***Тураў.*** Там, дзе вольна нясе свае воды Прыпяць, у краі палескіх лясоў стаіць горад Тураў. Упершыню ён згадваецца ў летапісе пад ***980 годам***. Потым ён стаў галоўным горадам Тураўскага княства. Паводле падання, сваю назву горад атрымаў ад імя князя Тура. Ён кіраваў у землях дрыгавічоў.

Жыхары горада Турава расказваюць такое паданне пра ўзнікненне горада.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Даўным-даўно на месцы Турава былі густыя непраходныя лясы. Тут вадзілася шмат звяроў і птушак. У рэках плавала розная рыба. Завітаў сюды са сваім войскам князь Тур. Аднойчы, вельмі стомлены, прылёг ён адпачыць. І сніць князь, што ляжыць ён на высокім возе, а вакол — шмат гарадоў. Прачнуўшыся, князь Тур загадаў пабудаваць тут горад.

***Мінск.*** Горад Мінск — сталіца нашай краіны. Упершыню ён згадваецца ў летапісе пад ***1067 годам***, калі адбылася бітва на рацэ Нямізе. Наконт узнікнення назвы горада ёсць розныя меркаванні.

Даўняе паданне гаворыць, што некалі на тым месцы, дзе пазней вырас горад, пасяліўся млынар. Да яго вазілі людзі збожжа, каб перамалоць яго на муку. Некаторыя сталі сяліцца паблізу. Так і ўзнікла паселішча. А таго млынара звалі Менеск. Адсюль нібыта і назва пайшла. Спачатку Менеск, потым — Менск, а яшчэ пазней — Мінск.

Некаторыя даследчыкі сцвярджаюць, быццам некалі заезджыя купцы мянялі тут свае тавары на вырабы мясцовых майстроў. Таму пачатковая назва горада паходзіць ад слова «мена» — мяняць.



Адноўленая Мінская ратуша



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Ёсць і іншае меркаванне. Згодна з ім назву сваю наша сталіца атрымала ад рэчкі Менкі, на берагах якой і ўзнік горад. Зараз гэта рэчка амаль высахла. А ў далёкім мінулым яна была багатая на рыбу мень. Ад слова «мена» або ад ракі Менкі наша сталіца доўгі час называлася Менскам.



Касцёл Святой Барбары ў Віцебску

***Віцебск.*** Горад Віцебск размяшчаецца на берагах вялікай ракі, якая завецца Заходняя Дзвіна. Але сваю назву горад атрымаў ад невялікай ракі Віцьбы, якая ўпадае ў Заходнюю Дзвіну. Упершыню горад Віцебск згадваецца ў летапісе пад ***974 годам***. Зручнае месцазнаходжанне на гандлёвым шляху «з варагаў у грэкі» спрыяла хуткаму развіццю горада.

***Магілёў.*** Праз горад Магілёў таксама працягнулася сіняя стужка вялікай ракі. Гэта — Дняпро. Воды Дняпра, узяўшы пачатак у Расіі, цякуць па тэрыторыі Беларусі, Украіны аж да Чорнага мора.

Магілёў быў заснаваны ў ***1267 годзе***. З даўніх часоў існуе паданне пра ўзнікненне горада. У даўнія часы там, дзе стаіць цяперашні Магілёў, шумела векавая пушча. У самым яе гушчары жыў разбойнік Машэка. Ён вельмі кахаў сваю нявесту. Але прыгажуню сілком забраў князь у свой замак. Праз нейкі час Машэку ўдалося вызваліць нявесту і прывезці яе да сябе. Аднак дзяўчына ўжо прызвычаілася да багатага жыцця. Калі Машэка заснуў, яна забіла яго. Сябрыразбойнікі насыпалі над яго магілаю вялікі курган і назвалі «магілаю льва». На месцы пахавання Машэкі ўзнік горад. Адсюль і пайшла яго назва. Так было ці не — ніхто не ведае. Але адну з прыбярэжных гор магілёўцы і цяпер называюць Машэкаўкай.



Сабор Святога Станіслава ў Магілёве



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Гомельскі палацава-паркавы ансамбль

За сваю гісторыю горад меў 3 гербы. Сучасны герб Магілёва мае выгляд, які быў нададзены яму ў 1661 годзе.

***Гомель.*** На высокім беразе ракі Сож знаходзілася некалі адно з самых старажытных паселішчаў радзімічаў. Паступова яно разраслося і ператварылася ў горад.

Існуе паданне пра тое, што насупраць горада на рацэ была вялікая мель. І людзі, сплаўляючы па Сажы лес у Дняпро, голасна папярэджвалі адзін аднаго: «Го-го, мель!» Гэта нібыта і дало назву гораду — Гомель.

У летапісе горад згадваецца ўпершыню пад ***1142 годам*** і называецца крыху інакш — Гомей, Гомій.

***Брэст.*** Ёсць у сучасным Брэсце археалагічны музей. Ён створаны на тым месцы, дзе існаваў старажытны горад. Вучоныя раскапалі тут цэлую старадаўнюю вуліцу, на якой дамы і гаспадарчыя пабудовы стаяць вельмі шчыльна.

Захавалася паданне пра ўзнікненне горада. Багаты купец вёз свае тавары і трапіў у непраходнае балота. Загадаў тады купец абдзіраць бяросту з бяроз і ўсцілаць ёю шлях. Так і выратаваўся. У гонар бярostы-ўратавальніцы гэтае месца і назвалі Берасцем (Бярэсцем). А сучасная назва горада — Брэст.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Брэсцкі валун-помнік
з датай першай згадкі
горада ў летапісе



Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне

У летапісе горад упершыню згадваецца пад ***1019 годам***. Месца, дзе паўстаў старажытны горад, незвычайнае: з усіх бакоў яго абмывалі воды рэк Заходні Буг і Мухавец. У тыя часы гэта быў важны гандлёвы цэнтр і моцная крэпасць.

***Гродна.*** Горад Гродна раней называўся па-рознаму: Горадзен, Гародня. Гэтыя назвы азначаюць «агароджанае месца».

Упершыню Гродна згадваецца ў летапісе пад ***1127 годам***. Тут былі развіты рамёствы. Горад меў гандлёвыя сувязі з іншымі гарадамі. Гэтаму спрыяла тое, што заснаваны ён быў на беразе Нёмана, які нясе свае воды ў Балтыйскае мора. Да нашых дзён у Гродне захаваліся многія помнікі мінуўшчыны: будынкі манастыроў, касцёлаў, цэркваў. Помнікам культуры 12 стагоддзя з'яўляецца ***Барысаглебская (Каложская) царква***. Адна яе сцяна абвалілася, але тое, што захавалася, здзіўляе і сёння.

**?**

1. З чым звязаны назвы гарадоў Беларусі?
2. Назвы якіх гарадоў утвораны ад назваў рэк?
3. Якія гарады атрымалі назвы ў гонар сваіх заснавальнікаў, іншых вядомых людзей?



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Перапішыце ў сшытак і выканайце заданні.

**1.** Злучыце лініямі назвы гарадоў з датамі першых паведамленняў пра іх у летапісе.

| | |
|---|---|
| Мінск | 862 год |
| Тураў | 980 год |
| Полацк | 1067 год |
| Віцебск | 974 год |
| Гродна | 1267 год |
| Брэст | 1142 год |
| Гомель | 1019 год |
| Магілёў | 1127 год |

**2.** Перавядзіце гады ў стагоддзі.

Полацк — 862 год — … стагоддзе
Мінск — 1067 год — … стагоддзе
Віцебск — 974 год — … стагоддзе
Гродна — 1127 год — … стагоддзе
Тураў — 980 год — … стагоддзе
Гомель — 1142 год — … стагоддзе
Брэст — 1019 год — … стагоддзе
Магілёў — 1267 год — … стагоддзе

**3.** Злучыце лініямі назвы гарадоў з версіямі іх паходжання.

| | |
|---|---|
| Назвы рэк | Мінск |
| Паданне пра «магілу льва» | Тураў |
| | Брэст |
| Імя князя | Полацк |
| | Магілёў |
| Назва кары дрэва | Віцебск |
| Абарончае прызначэнне | Гродна |

**4.** Злучыце лініямі гістарычныя назвы гарадоў з іх сучаснымі назвамі.

| | |
|---|---|
| Менск | Полацк |
| Полотеск | Мінск |
| Гомій | Брэст |
| Берасце | Гродна |
| Гародня | Гомель |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Бабруйск



Віцебск



Пінск



Барысаў



Полацк

Гербы беларускіх гарадоў

**5.** Адзначце на «стужцы часу» назвы гарадоў і даты іх першага ўпамінання ў летапісе.
**6.** Падрыхтуйце расказ пра назвы гарадоў з дапамогай малюнкаў у параграфе.
**7.** Параўнайце гербы гарадоў. У чым асаблівасць кожнага з іх? Ці падобны старадаўнія гербы гарадоў на сучасныя?

**1.** Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце на форзацы вучэбнага дапаможніка старажытныя гарады, якія з'яўляюцца абласнымі цэнтрамі.
**2.** Пакажыце на гэтай жа карце старажытныя гарады вашай вобласці.

**1.** Даведайцеся пра старадаўнія гарады ў вашай мясцовасці. Як яны называліся? Чым вылучаліся? Якім быў іх герб? Як выглядае сучасны герб вашага горада? Чым ён адрозніваецца ад старадаўняга?
**2.** Падрыхтуйце расказ пра найбліжэйшы да вас старажытны горад. Адкуль паходзіць яго назва?

Часта паселішчу давалі назву па прозвішчы ці нават мянушцы таго, хто першы паставіў тут хату. У Беларусі шмат такіх назваў: Адамаўка, Аляксееўка, Антонаўка, Васілевічы, Валодзькі, Якімовічы і іншыя.

Нярэдка жыхары аднаго населенага пункта маюць аднолькавыя прозвішчы. Напрыклад, у дзвюх палескіх вёсках Грамыкі амаль усе носяць адно прозвішча — Грамыка.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Відаць, у кожным раёне Беларусі маюцца вёскі і мястэчкі, у назвах якіх ёсць слова «буда». «Будай» называлі часовае жыллё. Пайшла гэтая назва ад слоў «будынак», «будаваць». У будзе жылі людзі, якія збіралі з дрэў смалу, выпальвалі вугаль. Прыклады такіх назваў — Буда, Высокая Буда, Старая Буда, Зімовая Буда, Буда-Кашалёва, Кісялёва Буда, Будча.

У Беларусі няма гор, затое шмат розных узвышшаў — горак. Адсюль узніклі назвы многіх паселішчаў: Чырвоная Горка, Мар'іна Горка, Казіныя Горкі. Горы-Горкі — так калісьці называўся горад Горкі, што ў Магілёўскай вобласці.

З даўніх часоў паселішчы агароджвалі ад ворагаў высокімі сценамі. Адсюль і назвы: Гародня, Гарадзішча, Гарадзея.

Многія найменні вёсак і гарадоў паходзяць ад назваў рамёстваў і заняткаў людзей.

Там, дзе рабілі ў старажытнасці зброю (лукі, стрэлы, сякеры), узніклі паселішчы Лучнікі, Стрэльнікі, Сякерычы.

Паселішча Бондары славілася майстрамі, якія рабілі бочкі, вёдры і разнастайны драўляны посуд. У Сітніках выраблялі сіты і рашоты, у Судніках — драўляны посуд: лыжкі, міскі, каўшы.

У Бортніках жылі знаўцы, якія ведалі, дзе, у якіх лясах поўна ў дуплах дзікіх пчол. Жыхары Бортнікаў таксама рабілі вуллі-борці з тоўстых калод і збіралі мёд.

Многія назвы паселішчаў звязаны са словам «руда»: Рудня, Руднае, Рудзенск, Рудаўляны. У далёкім мінулым гэта былі паселішчы людзей, якія з балотнай руды выплаўлялі жалеза.

З даўніх часоў у Беларусі вырабляюць шкло. Такіх майстроў называюць гутнікі. Яны жылі ў паселішчах з назвамі Гута, Гутніца, Гута Замошская, Новая Гута, Старая Гута.

Назвы паселішчаў Ляды, Лядзішчы, Лядавічы, Лядцы паходзяць ад слова «ля́да». Так называлася месца ў лесе, якое старажытныя людзі расчышчалі ад дрэваў і хмызняку пад пасевы збожжа ці сенажаці.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## 22. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага

1. Якое княства было першым дзяржаўным утварэннем на беларускай зямлі?
2. Дзе знаходзілася Полацкае княства? Пакажыце на палітыка-адміністрацыйнай карце, змешчанай на форзацы вучэбнага дапаможніка.
3. Хто кіраваў у княстве?

На працягу 12 стагоддзя Полацкае, Тураўскае княствы страцілі сваю былую моц. Яны распаліся. На тэрыторыі Беларусі ўзніклі дробныя княствы: Полацкае, Менскае, Новагародскае, Гарадзенскае і іншыя. Гэтым скарысталіся ворагі з захаду. Амаль кожны год на ўсходнеславянскія княствы рабілі напады цяжкаўзброеныя конныя воіны — ***рыцары-крыжакі***. Так іх называлі за крыжы на рыцарскіх плашчах і шчытах. **Рыцары**[1] рабавалі гарады і вёскі, забіралі людзей у палон. Супрацьстаяць нападам крыжакоў дробныя княствы самастойна не маглі. Дзеля захавання зямель і насельніцтва патрэбна было іх аб'яднанне.

У гэты час пачалося ўзмацненне ***Новагародскага (Навагрудскага) княства***. Яго цэнтрам быў горад ***Новагародак (Навагрудак)***. Навагрудская зямля ў пачатку 13 стагоддзя была спакойным краем, бо доўгі час не ведала войнаў. Тут склаліся спрыяльныя ўмовы для жыцця і гаспадарчай дзейнасці людзей. Урадлівыя землі давалі добры ўраджай. Развіваліся сельская гаспадарка, шматлікія рамёствы. З балотнай руды выплаўлялі жалеза, апрацоўвалі метал. Вырабамі рамеснікаў гандлявалі ў суседніх княствах.

Хутка раслі і мацнелі гарады Навагрудскай зямлі: Слонім, Ваўкавыск, Свіслач. Кожны горад меў свой асабісты знак — ***герб***. Як **сімвал**[2] горада ён змяшчаўся на гарадской браме. Таксама кожны горад меў свой ***сцяг***, які развяваўся над замкам. Свае гербы былі і ў знатных родаў.

Пад ***1237 годам*** у летапісах узгадваецца першы гістарычна вядомы навагрудскі князь ***Ізяслаў***. Пасля яго смерці князем Навагрудскай зямлі

[1] **Ры́цар** — чалавек, які валодаў зямлёй і займаўся ваеннай справай.
[2] **Сі́мвал** — выява, якая служыць абазначэннем чаго-небудзь.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Князь Міндоўг



Князь Гедымін

са згоды яе жыхароў стаў ***Міндоўг***. Да гэтага ён быў адным з літоўскіх князёў. З ім звязаны найбольш важныя падзеі беларускай гісторыі таго часу.

Міндоўг распачаў вайну з суседнімі літоўскімі князямі. У выніку ён далучыў да свайго княства частку літоўскіх зямель.

Супраць крыжацкай пагрозы аб’ядналіся многія славянскія і балтыйскія народы. (Балты — гэта продкі сучасных літоўцаў і латышоў.) Так, у ***13 стагоддзі*** быў пакладзены пачатак аб’яднанню беларускіх і літоўскіх зямель у адну дзяржаву. Яе сталіцай першапачаткова стаў горад Навагрудак.

У ***1323 годзе*** князь ***Гедымін*** перанёс сталіцу княства з Навагрудка ў Вільню. Існуе паданне пра тое, як сталіцай княства стаў горад Вільня. Аднойчы пасля палявання князь Гедымін прылёг адпачыць. У сне ён убачыў вялікага жалезнага ваўка. Воўк выў так моцна, што было чутна далёка. Пасля гэтага было прынята рашэнне: пабудаваць на той гары, дзе стаяў воўк, горад-крэпасць. Ён будзе непрыступным, як той жалезны воўк. А слава пра яго распаўсюдзіцца далёка, як выццё ваўка, якое было чутна ўсім людзям у наваколлі. Назва новага горада звязана з ракой Віліяй, каля якой ён узнік.

Пры Гедыміне дзяржаву пачалі называць ***Вялікім Княствам Літоўскім***. Уся дзейнасць вялікага князя была накіравана на далейшае ўмацаванне новай дзяржавы і пашырэнне яе абшараў. Тэрыторыя павялічылася прыкладна ў 3 разы. Яна ўключала каля 80 % сучаснай тэрыторыі Беларусі.

Вялікае Княства Літоўскае ўтварылася як Беларуска-Літоўская дзяржава. Большасць яе насельніцтва складалі беларусы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Вялікае Княства Літоўскае ў 13—15 стагоддзях



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Князь Альгерд

У ***1345 годзе*** княства ўзначаліў князь ***Альгерд*** — старэйшы сын Гедыміна. Ён працягнуў справу пашырэння межаў Вялікага Княства Літоўскага. У выніку паспяховай барацьбы з крыжакамі і іншымі захопнікамі Альгерд далучыў да княства значныя тэрыторыі. Пад камандаваннем гэтага князя было разбіта войска татара-мангольскіх ханаў, якія рабілі спусташальныя набегі на нашу зямлю. Вялікае Княства Літоўскае ператварылася ў магутную дзяржаву. Аб’яднанне выратавала беларускія і літоўскія народы ад небяспекі заняволення ворагамі.

**1.** Хто скарыстаўся распадам Полацкага і Тураўскага княстваў?
**2.** Што спрыяла ўзмацненню Навагародскага княства?
**3.** Назавіце імя першага вядомага навагародскага князя.
**4.** Як называлася дзяржава, якая аб’яднала беларускія і літоўскія землі?
**5.** Які горад стаў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага?
**6.** Назавіце імёны першых вялікіх літоўскіх князёў. Чым яны слаўныя?
**7.** Якое паданне распавядае пра ўзнікненне Вільні?

Пакажыце на картасхеме на с. 93 межы Вялікага Княства Літоўскага пры Міндоўгу, пры Гедыміне. Адшукайце на карце горад Новагародак (Навагрудак).

Пацікаўцеся, ці ёсць на карце Вялікага Княства Літоўскага населены пункт, у якім вы жывяце.

Разам з бацькамі ці класам наведайце старажытны Навагрудак ці зрабіце ў гэты горад уяўнае падарожжа. Раскажыце пра свае ўражанні.

**1.** З зямлі беларускай паходзіў князь Вячаслаў. У народзе яго з любоўю звалі — князь Вячка. Ён, як і ўвесь беларускі народ у тыя часы, бясконца ваяваў. На ўдар ворага адказваў ударам, не скарыўся нікому, ні перад кім не схіляў галавы. Апошні бой князь Вяч-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

ка са сваёй дружынаю прыняў, абараняючы ад рыцараў-крыжакоў горад Юр’еў (цяпер Тарту ў Эстоніі).

Князь цэлымі суткамі не пакідаў баявога сядла, спаў каля паходных вогнішчаў, разам са сваёй дружынай штурмаваў варожыя крэпасці. Ён выдатна валодаў мячом, кап’ём, трапна страляў з лука. У час аблогі горада рыцары падаслалі да князя манаха. Той угаворваў Вячку здаць горад. За гэта князю абяцалася захаваць жыццё. Але Вячка не кінуў сваю дружыну, не пайшоў на здраду. Ён загінуў. Было гэта ў далёкім жніўні 1224 года.

**2.** Дзяржава татара-манголаў называлася Залатая Арда. Кіраўніком у ёй быў хан. Яна мела вялікія абшары. Добра арганізаванае войска заваёўвала значныя тэрыторыі. На працягу некалькіх стагоддзяў мангола-татарскія ханы ўціскалі рускія землі, рабавалі іх, паланілі людзей. Рускія князі абавязаны былі плаціць непамерную даніну. Пакутавалі ад спусташальных набегаў мангола-татараў і беларускія землі.

## 23. Вялікі князь Вітаўт. Грунвальдская бітва

1. Хто такія нямецкія рыцары?
2. Чаму іх называлі крыжакамі?
3. Адкуль яны нападалі на беларускія землі?
4. Як называлася дзяржава, у якую аб’ядналіся беларускія і літоўскія землі?
5. Чаму яна ўзнікла?

Беларускія землі зведалі нацiск рыцараў-крыжакоў яшчэ да ўтварэння Вялікага Княства Літоўскага. На працягу ўсяго 14 стагоддзя рыцары-крыжакі рабілі спусташальныя набегі на землі Беларуска-Літоўскай дзяржавы. Яны палілі гарады і вёскі, адбіралі маёмасць, забівалі людзей. Мясцовае насельніцтва, што супраціўлялася, нямецкія рыцары знішчалі, забіралі ў палон. Паходы рыцараў працягваліся амаль дзвесце гадоў. Здаралася, што нападаў было па некалькі на год. Пяць разоў крыжакі спрабавалі захапіць Полацк. Чатыры разы яны беспаспяхова акружалі Навагрудак. Напады рыцараў зведалі многія беларускія гарады: Гродна, Брэст, Камянец, Ваўкавыск і іншыя. Пры такіх абставінах жыццё Беларуска-Літоўскай дзяржавы не было спа-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Князь Вітаўт

койным. Таму галоўнай задачай Вялікага Княства Літоўскага стаў разгром рыцараў-крыжакоў.

У ***1392 годзе*** вялікім князем літоўскім стаў князь ***Вітаўт***. З юнацтва ён вучыўся трымаць у руках зброю, скакаць на кані. Гэта вельмі яму спатрэбілася ў далейшым. У гады княжання Вітаўта Вялікае Княства Літоўскае дасягнула найбольшай магутнасці. Яго межы значна пашырыліся. Яно распасціралася ад Балтыйскага да Чорнага мора. Агульнадзяржаўным гербам Вялікага Княства Літоўскага стала «Пагоня». Выява рыцара на кані з мячом сімвалізавала імкненне да незалежнасці.

Князь Вітаўт і яго стрыечны брат, польскі кароль Ягайла, аб'ядналіся ў саюз, каб разбіць крыжакоў. Для гэтага яны таемна сустракаліся ў Брэсце. На нарадзе яны абмяркоўвалі план паходу на рыцараў, неабходную для гэтага колькасць воінаў, месца збору і іншае.

У канцы мая 1410 года ў Гродна былі сцягнуты беларускія і літоўскія войскі. Затым да іх далучыліся польскія атрады. Аб'яднаныя войскі рушылі да мяжы дзяржавы рыцараў.

На поле бітвы прыйшлі палкі з усіх беларускіх і літоўскіх зямель. Усяго Вялікае Княства Літоўскае вывела 40 **харугваў**[1]. Гэта каля сарака тысяч чалавек. Рыцараў-крыжакоў было крыху менш, але яны былі лепш узброены. Вырашальная бітва адбылася ***15 ліпеня 1410 года*** каля ***вёскі Грунвальд*** (што азначае «зялёны лес»). Цяпер гэта тэрыторыя Польшчы. У смяротнай схватцы сутыкнуліся нямецкія рыцары і аб'яднанае войска Вялікага Княства Літоўскага і **Каралеўства**[2] Польскага. Вялікі князь Вітаўт разам з польскім каралём Ягайлам пачалі бітву з крыжакамі.

Нямецкія рыцары стаялі моцнымі клінамі. За баявымі радамі крыжакоў чакалі сігналу арбалетнікі і бамбардзіры. Кіраўнік крыжакоў чакаў, калі войскі Вітаўта і Ягайлы пойдуць у наступ.

Беларуска-літоўскія і польскія войскі стаялі паміж пагоркамі і лясамі. За першай і другой паласой войскаў выстраіліся палкі запасу.

[1] **Хару́гва** — падраздзяленне войска ў Вялікім Княстве Літоўскім.
[2] **Карале́ўства** — дзяржава на чале з каралём.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Праціўнікі сышліся ў смяротнай бітве. Зямля была чырвоная ад крыві. Іскры сыпаліся наўкол ад мячоў і шчытоў. Ламаліся коп'і. Пад капыты коней падалі забітыя і параненыя воіны.

Быў час, калі здавалася, што рыцары перамогуць войскі Вітаўта. Але насустрач ім рынуліся польскія войскі. Бітва працягвалася ўвесь дзень. Пад вечар крыжакі не вытрымалі. Яны пачалі адыходзіць. А неўзабаве пабеглі, каб не быць забітымі або паланёнымі.

Дружыны Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага перамаглі нямецкіх рыцараў. Пасля гэтай бітвы напады нямецкіх рыцараў на нашу зямлю спыніліся. Перамога ў Грунвальдскай бітве ўмацавала незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага. Яна дала магчымасць жыхарам вялікай дзяржавы спакойна жыць, садзейнічала ўзмацненню краіны.



Грунвальдская бітва



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Шмат гадоў мінула з таго часу. Аднак і дагэтуль мы ўшаноўваем памяць мужных воінаў, якія змагаліся за незалежнасць Радзімы ў цяжкай бітве пад Грунвальдам.

1. Хто такі князь Вітаўт?
2. Якім стала Вялікае Княства Літоўскае пры Вітаўце?
3. Якая падзея адбылася 15 ліпеня 1410 года?
4. Які князь узначаліў барацьбу з рыцарамі-крыжакамі?
5. Чаму аб'яднанне войска Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага прывяло да перамогі ў бітве пад Грунвальдам?
6. Якое значэнне мела перамога ў бітве пад Грунвальдам?

**1.** Разгледзьце малюнак на с. 96. Складзіце расказ пра князя Вітаўта.

**2.** Разгледзьце малюнак на с. 97. Складзіце расказ пра Грунвальдскую бітву. Выкарыстайце дадатковую літаратуру са школьнай бібліятэкі.

**3.** Падлічыце, колькі часу аддзяляе нас ад гістарычнай бітвы пад Грунвальдам.

**4.** Чаму нямецкіх рыцараў называюць крыжакамі? Знайдзіце адказ на малюнку на с. 97.

Пакажыце на картасхеме на с. 93:

1) межы Вялікага Княства Літоўскага пры князю Вітаўце;
2) дзяржавы, якія былі суседзямі Вялікага Княства Літоўскага.

Шэсць стагоддзяў аддзяляюць нас ад Грунвальдскай бітвы. Пра яе засталося нямала звестак. Але шмат што знікла за гэты час з памяці, забыліся многія імёны. І ўсё ж слава Грунвальдскай бітвы жыве і сёння. Найбольш вылучыўся ў бітве сам вялікі князь Вітаўт. Ён увесь час знаходзіўся на полі бою і кіраваў палкамі.

Мужна змагаўся ў бітве і мсціслаўскі князь Сымон Лугвен Альгердавіч. Ён даводзіўся родным братам Ягайлу і стрыечным — Вітаўту. Гэта яго палкі ў самы небяспечны час стрымалі націск крыжаносцаў, уступілі ў рукапашны бой. Тым самым яны далі магчымасць князю Вітаўту аднавіць баявы парадак і вырашылі зыход бітвы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У самай гушчы бою знаходзіўся разам са сваімі палкамі намеснік вялікага князя ў Гродне Міхаіл Мантвід. Там жа змагаліся брат Вітаўта Жыгімонт, заслаўскі князь Юрый Міхайлавіч і іншыя героі.

Удзельнікамі бітвы пад Грунвальдам былі і войскі татарскага хана. Татарскі хан Тахтамыш сябраваў з Вітаўтам. Ён нават з дазволу Вітаўта жыў у горадзе Лідзе, што належаў князю. З тых часоў татары пасяліліся ў Беларусі. Смелыя і хуткія татарскія коннікі дапамаглі беларускім, літоўскім, польскім ваярам атрымаць такую чаканую перамогу.

## 24. Статуты Вялікага Княства Літоўскага

1. Як называўся сход гараджан у Полацку?
2. Якія пытанні вырашала веча?

Ужо ў старажытнасці адносіны паміж людзьмі рэгуляваліся рознымі правіламі, звычаямі. Спачатку галоўнае значэнне мелі правілы штодзённага жыцця. Напрыклад, чалавек заўсёды ведаў, што трэба паважаць старэйшых, любіць і шанаваць сваіх бацькоў, бабуль і дзядуляў, дапамагаць ім.

У часы Полацкага княства важнае для ўсіх рашэнне ці закон прымаліся разам людзьмі, якія сыходзіліся на веча. На аснове правіл дзейнасці чалавека склаліся **законы**[1], якія былі запісаны ў кнігі (зборнікі). У старажытных усходніх славян такім зборнікам законаў з'яўлялася Руская Праўда. Яна абараняла інтарэсы князя і яго дружыны.

Калі ўзніклі княствы (дзяржавы), пытанняў вялікай важнасці стала яшчэ больш. Трэба было прымаць новыя законы. Яны павінны былі рэгуляваць адносіны паміж князем і рознымі групамі насельніцтва княства, вырашаць іншыя пытанні жыцця дзяржавы.

У Вялікім Княстве Літоўскім кіраўніком дзяржавы з'яўляўся ***вялікі князь***. Але ўсе важныя пытанні ён вырашаў не адзін, а з удзелам рады і сойма. У ***раду*** ўваходзілі найбольш паважаныя і багатыя людзі. Яны займалі найвышэйшыя пасады ў княстве. Рада кантралявала дзейнасць вялікага князя.

[1] **Зако́ны** — дакументы, якія рэгулююць адносіны паміж дзяржавай і грамадзянамі або людзей паміж сабою.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Пасяджэнне сойма

***Сойм*** быў другім вышэйшым дзяржаўным органам улады. У яго склад уваходзілі прадстаўнікі рады і іншыя найвышэйшыя службовыя асобы дзяржавы. На пасяджэннях сойма прысутнічалі прадстаўнікі **шляхты**[1] Вялікага Княства Літоўскага.



Тытульны ліст Статута 1588 года

У ***1468 годзе*** вялікі князь Казімір выдаў ***Судзебнік***. Гэта быў зборнік першых пісаных законаў Вялікага Княства Літоўскага.

У ***1529 годзе*** ў Вялікім Княстве Літоўскім з'явіўся новы зборнік законаў — ***Статут Вялікага Княства Літоўскага***. Ён быў напісаны на беларускай мове. У Статуце былі вызначаны правы і абавязкі жыхароў княства. Выконваць іх мусілі ўсе грамадзяне — ад вялікага князя да селяніна. Згодна са Статутам усе дзяржаўныя органы і службовыя асобы павінны былі дзейнічаць адпаведна закону. Статут дапамагаў людзям жыць у міры і згодзе, а дзяржаўным установам — дзейнічаць у адпаведнасці з законам.

[1] **Шля́хта** — частка заможнага насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Статут забараняў іншаземцам купляць зямлю ў княстве, ахоўваў малых дзяцей-сірот. Законы, запісаныя ў Статуце, тычыліся не толькі людзей. Яны прадугледжвалі таксама меры па ахове птушак, звяроў, лясоў і іншых багаццяў прыроды.




Леў Сапега

Статут Вялікага Княства Літоўскага некалькі разоў удакладняўся. У ***1566 годзе*** быў выдадзены Другі Статут. Найбольш дасканалым стаў Трэці Статут, які выйшаў у свет у ***1588 годзе***. Ён дзейнічаў болей за 250 гадоў. Адзін са складальнікаў Статута 1588 года — выдатны дзяржаўны дзеяч ***Леў Сапега***.

Старажытны беларускі род князёў Сапегаў даў шмат вядомых людзей. Але найбольш праславіў яго Леў Сапега. Ён пражыў доўгае жыццё і сваімі справамі заслужыў удзячную памяць беларусаў.

Нарадзіўся Леў Сапега ў 1557 годзе на Віцебшчыне. Калі хлопчыку споўнілася сем гадоў, бацькі адправілі яго вучыцца ў Нясвіж. У тыя часы тут была самая лепшая школа ў Вялікім Княстве Літоўскім. У Нясвіжы жыло шмат вучоных людзей. Мелася вялікая бібліятэка з кнігамі на розных мовах. Працавала друкарня. Ужо ў дзяцінстве Леў Сапега ўмеў гаварыць і пісаць на некалькіх мовах: беларускай, польскай, нямецкай і іншых. Затым ён вучыўся за мяжой — у Германіі. Там ён вывучаў гісторыю і права — навуку пра законы, па якіх жывуць людзі.

Вярнуўшыся на радзіму, Леў Сапега займаў самыя высокія дзяржаўныя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім. Больш за трыццаць гадоў ён быў вялікім канцлерам — другім чалавекам у дзяржаве пасля караля і вялікага князя. У канцы жыцця некалькі гадоў займаў пасаду вялікага гетмана — галоўнакамандуючага беларуска-літоўскім войскам. Леў Сапега паказаў сябе добрым ваяводам і чалавекам, які нічога не шкадаваў для Бацькаўшчыны. У час вайны вялікі гетман і яго сын Ян Станіслаў не шкадавалі свайго багацця на барацьбу з ворагам.

Леў Сапега дапамагаў мастакам і пісьменнікам. Ён сабраў вялікую бібліятэку. Загадваў перапісваць для нашчадкаў усе галоўныя даку-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

менты Вялікага Княства Літоўскага. У сваім жыцці Леў Сапега заўсёды ставіў дзяржаўныя інтарэсы вышэй за асабістыя.

1. На чым былі заснаваны законы нашых продкаў? Знайдзіце адказ у тэксце падручніка.
2. Як ажыццяўлялася кіраванне ў Вялікім Княстве Літоўскім?
3. Як называюцца абавязковыя правілы, якія ўстаноўлены ў дзяржаве? Выберыце адказ: а) загады; б) законы.
4. Як называлася кніга (зборнік) першых пісаных законаў Вялікага Княства Літоўскага?
5. Калі выдадзены Першы Статут Вялікага Княства Літоўскага? На якой мове ён быў напісаны?
6. У якіх яшчэ гадах выдаваліся Статуты?
7. Хто быў складальнікам Статутаў?
8*. Для чаго патрэбны законы ў жыцці чалавека і дзяржавы?
9*. Ці існуюць у сучасным жыцці законы? Як называецца галоўны закон нашай краіны?

1. Разгледзьце малюнак на с. 100. Раскажыце, што такое сойм.
2*. Разгледзьце малюнак на с. 101. Складзіце расказ пра жыццё і дзейнасць Льва Сапегі.

Блізкім па поглядах да Льва Сапегі быў дзяржаўны дзеяч Андрэй Волан. Ён таксама атрымаў добрую адукацыю спачатку на радзіме, а потым за мяжою. Выбіраўся ў сойм. Андрэй Волан напісаў каля 50 прац. У іх ён разважаў пра свабоду, роўнасць і справядлівасць. Дзейнасць такіх людзей, як Леў Сапега і Андрэй Волан, спрыяла развіццю грамадства ў Вялікім Княстве Літоўскім.

## 25. Утварэнне Рэчы Паспалітай

1. Калі адбылася Грунвальдская бітва?
2. Якія войскі ўдзельнічалі ў Грунвальдскай бітве? Хто перамог у ёй?

Знешняя небяспека вымушала Вялікае Княства Літоўскае шукаць падтрымкі ў суседзяў. Яшчэ да Грунвальдскай бітвы, у ***1385 годзе***, Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае заключылі дагавор.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З гэтага часу ў іх быў агульны кіраўнік. Дагавор насіў назву ***Крэўская унія*** (інакш кажучы — саюз). Аднак прынятыя пагадненні не заўсёды выконваліся.

Польшча імкнулася падпарадкаваць сабе Вялікае Княства Літоўскае. Супраць гэтага выступалі беларуска-літоўскія **патрыёты**[1]. Іх дзейнасць узначальваў князь Вітаўт. Такім чынам Вялікае Княства Літоўскае заставалася самастойным, мела свой урад, свае законы, войска. Акрамя таго, захаваліся герб, Статут Вялікага Княства Літоўскага, а таксама беларуская мова як дзяржаўная.



Пешы воін Вялікага Княства Літоўскага

У ***1558 годзе*** пачалася вайна паміж Расійскім **царствам**[2] і дзяржавай нямецкіх рыцараў у ***Лівоніі — Лівонскім ордэнам***. Таму вайну назвалі ***Лівонскай***. Адной з прычын вайны стала адмова плаціць даніну маскоўскім царам. Акрамя таго, маскоўскі цар праз беларускія і польскія землі імкнуўся выйсці да Балтыйскага мора.

У гэтай вайне на баку Лівонскага ордэна прыняло ўдзел Вялікае Княства Літоўскае. Вайна працягвалася 25 гадоў. Баявыя дзеянні змяняліся кароткімі перамір'ямі. Маскоўскаму войску ўдалося нанесці некалькі паражэнняў войску княства. Была захоплена самая магутная крэпасць Беларусі — Полацк. Узнікла пагроза і для сталіцы княства — Вільні. Гэта прымусіла Вялікае Княства Літоўскае пайсці на новы саюз з Каралеўствам Польскім.



Коннік Вялікага Княства Літоўскага

У ***1569 годзе*** ў польскім горадзе Любліне была заключана ***Люблінская унія*** (саюз). У выніку уніі Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства

[1] **Патрыёт** — чалавек, які любіць сваю Радзіму.
[2] **Ца́рства** — дзяржава на чале з царом.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Рэч Паспалітая ў 16 стагоддзі

Польскае аб’ядналіся ў адзіную дзяржаву — ***Рэч Паспалітую***. Не ўсе ўмовы аб’яднання былі выгаднымі для княства. Яно страціла частку багатых земляў, што адышлі да Польшчы. Польская шляхта імкнулася да поўнага валадарства ў Вялікім Княстве Літоўскім.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Аднак Вялікае Княства Літоўскае, увайшоўшы ў склад Рэчы Паспалітай, не страціла сваёй самастойнасці. Дзяржаўным дзеячам на чале з Львом Сапегам удалося аслабіць уплыў Польшчы на княства. Былі захаваны ўласнае заканадаўства, войска, грошы. Працягвала заставацца дзяржаўнай беларуская мова. Беларуска-Літоўская дзяржава жыла па законах, якія былі замацаваны ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага.

Аб'яднанне дзвюх дзяржаў садзейнічала паспяховаму для іх заканчэнню Лівонскай вайны. Для Рэчы Паспалітай яна скончылася ў 1582 годзе.

1. Як называлася вайна, у якой прыняло ўдзел Вялікае Княства Літоўскае?
2. Колькі гадоў яна працягвалася?
3. Чаму Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае аб'ядналіся ў адзіную дзяржаву?
4. Як называлася гэтая дзяржава?
5. Калі і дзе была ўтворана Рэч Паспалітая?

Разгледзьце малюнкі на с. 103. Раскажыце, як выглядалі воіны Вялікага Княства Літоўскага, якая ў іх была зброя.

Пакажыце на картасхеме на с. 104:
1) тэрыторыю Рэчы Паспалітай;
2) мяжу паміж ёю і Расійскай дзяржавай;
3) мяжу паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Каралеўствам Польскім.

## 26. Жыццё прыгонных сялян

1. Хто такі князь?
2. Як называўся падатак, што збіраў князь з падуладнага насельніцтва ў старажытнасці?

Галоўным багаццем чалавека ва ўсе часы з'яўлялася зямля. У Вялікім Княстве Літоўскім большасць зямлі належала вялікаму князю, царкве і багатым людзям. Зямельныя надзелы сялян былі невялікія. Не заўсёды сялянская сям'я мела магчымасць пракарміцца са сваёй зямлі. Часта здараліся неўраджаі, паводкі, засухі, пажары і іншыя



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Прыгонныя сяляне на паншчыне

бедствы. У выніку іх надыходзіў голад. Таму сяляне вымушаны былі прасіць дапамогі ў багатых людзей, якія мелі запасы збожжа.

Каб засеяць сваю зямлю, селянін браў у багатых людзей збожжа ў пазыку. За гэта ён павінен быў у пэўныя дні працаваць у гаспадарцы заможнага чалавека. Калі селяніну не ўдавалася вярнуць пазыку, яму прыходзілася аддаваць ва ўласнасць багатаму чалавеку сваю зямлю. У выніку беззямельныя сяляне станавіліся цалкам залежнымі ад багатага чалавека. Ён цяпер з'яўляўся для іх гаспадаром (панам). Такія людзі зваліся **прыгоннымі сялянамі**[1]. Колькасць іх паступова павялічвалася. У другой палове 16 стагоддзя беларускія сяляне былі канчаткова запрыгонены.

Багатыя людзі валодалі ўсёй зямлёй. Частку яе яны перадавалі сялянам у карыстанне. За гэта сяляне павінны былі выконваць на карысць пана розныя абавязкі — **павіннасці**[2]. Гэта праца ў панскай гаспадарцы на сяўбе, касьбе, жніве, ворыве. Праца на панскім полі атрымала назву **паншчына**[3]. Сяляне таксама будавалі, рамантавалі панскія палацы, гаспадарчыя пабудовы, дарогі.

[1] **Прыго́нны селяні́н** — чалавек, які трапіў у залежнасць ад гаспадара (пана).
[2] **Паві́ннасці** — праца ў панскай гаспадарцы за карыстанне зямлёй.
[3] **Па́ншчына** — праца селяніна на панскім полі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Акрамя выканання паншчыны сяляне плацілі ***падатак*** прадуктамі харчавання або грашыма. Яны прыносілі свайму гаспадару зерне, яйкі, мёд, сала, арэхі, грыбы і іншае. Таксама сяляне прыносілі воск, вырабленыя імі палатно, скуры. Хто не меў гаспадаркі, працаваў у якасці панскіх слуг. За самую невялікую правіннасць прыгонных сялян жорстка каралі.

Сяляне плацілі яшчэ і падатак на ўтрыманне цэркваў. Паны мелі права распараджацца сваімі прыгоннымі, прадаваць іх іншым панам, дарыць.

Такое цяжкае жыццё вымушала сялян уцякаць ад сваіх гаспадароў. Але гаспадар на працягу 20 гадоў мог весці пошук селяніна. Калі селяніна за гэты час знаходзілі, яго вярталі гаспадару. Калі не, то селянін рабіўся асабіста вольным. Аб сялянах, якія ўцяклі ад сваіх паноў, абвяшчалася на рынкавых плошчах. Людзям не дазвалялася дапамагаць уцекачам, карміць іх, даваць прытулак.

У такіх умовах часам успыхвалі **сялянскія паўстанні**[1]. Сяляне не хацелі цярпець здзек і плаціць непасільныя падаткі. Атрады паўстанцаў



Сялянскае паўстанне

[1] **Ся́лянскае паўста́нне** — узброенае выступленне сялян супраць прыгнёту землеўладальнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

нападалі на дамы гаспадароў, палілі кнігі, дзе былі запісаны іх даўгі. У гэтых выпадках улады накіроўвалі войска. Сялянскія паўстанні задушаліся, а іх ўдзельнікі жорстка караліся.

**1.** Як сяляне станавіліся прыгоннымі?
**2.** Пералічыце павіннасці сялян.
**3.** Што такое паншчына?
**4.** Якія падаткі плацілі сяляне?
**5.** Раскажыце, як сяляне змагаліся супраць прыгнёту.
**6.** Чым заканчваліся ўцёкі і паўстанні сялян?

Складзіце план пераказу тэксту. Выкарыстайце малюнкі на с. 106, 107.

Працавітыя і таленавітыя людзі жылі ў Крычаве. Хлебаробы, ганчары, цесляры, гутнікі. Асабліва славіліся крычаўскія гарматнікі. Але жылі яны вельмі бедна. З года ў год усё больш прыгняталі іх жорсткія і сквапныя гаспадары. Валодаў гэтай зямлёю Геранім Фларыян Радзівіл, разумны, ды прагны і бязлітасны князь. Надышоў дзень, калі людзі ўзяліся за косы, цапы і стрэльбы. У 1743 годзе пачалося сялянскае паўстанне. На чале яго стаялі крычаўцы Васіль Вашчыла і Іван Карпач. Паўстанцы марылі зрабіцца гаспадарамі на сваёй зямлі. Яны болей не хацелі цярпець такі жорсткі прыгнёт.

Сяляне нападалі на дамы сваіх ворагаў, палілі судовыя і даўгавыя кнігі. Разам з гараджанамі яны паспрабавалі ўварвацца ў Крычаўскі замак, але адступілі. Сілы былі няроўныя. Супраць паўстанцаў выступіла абучанае і добра ўзброенае войска князя. Паўстанне скончылася разгромам. Многіх паўстанцаў пакаралі смерцю. Але памяць пра народных герояў жыве і сёння.

## 27. Войны на зямлі Беларусі, іх вынікі

1. Якая вайна на тэрыторыі Беларусі працягвалася 25 гадоў?
2. Назавіце значную падзею, што адбылася ў гады Лівонскай вайны.

У 17—18 стагоддзях беларускія землі неаднаразова станавіліся арэнай працяглых войнаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

З ***1654*** па ***1667 год*** доўжылася вайна паміж ***Расіяй*** і ***Рэччу Паспалітай***. Ваенныя дзеянні праходзілі ў асноўным на тэрыторыі Беларусі.

Вайна прынесла нашай зямлі вялікія разбурэнні. Каля паловы жыхароў загінула або памерла ад хвароб. Шмат людзей пагналі ў палон. Заняпалі беларускія гарады і вёскі. Іх не ўдалося аднавіць і за стагоддзе. Вялікія страты панеслі гаспадарка і культура. Не было каму і чым засяваць сялянскія надзелы. Яны параслі бур'янам. Касцёлы і цэрквы былі разрабаваны.

Не паспелі гарады і вёскі аднавіцца, як тэрыторыя Беларусі стала месцам чарговай працяглай вайны. Гэтым разам вайна вялася паміж Швецыяй і Расіяй за землі Прыбалтыкі, таму атрымала назву ***Паўночнай***. Яна пачалася ў ***1700 годзе*** і працягвалася 21 год. Рэч Паспалітая ў гэтай вайне была саюзніцай Расійскай дзяржавы. Рускія войскі спыніліся ў Гродне. Сюды падышла і шведская армія.

На зямлі Беларусі шведская і руская арміі паводзілі сябе як гаспадары. Іншаземныя войскі рабавалі жыхароў, палілі гарады.

Шведская армія прайшла ў напрамку Мінск — Магілёў праз усю Беларусь ва Украіну. Каля вёскі Лясной на Магілёўшчыне на шведскую армію нечакана напала рускае войска. Раптоўнасць нападу спрыяла перамозе рускіх воінаў.



Бітва каля вёскі Лясная



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Беларускае насельніцтва сустрэла шведаў як захопнікаў — са зброяй у руках. Людзі хаваліся ў лясах, стваралі партызанскія атрады і нападалі на няпрошаных гасцей.

І зноў ад ваенных дзеянняў, голаду і хвароб загінула значная частка насельніцтва Беларусі. Гарады і вёскі амаль што абязлюдзелі. Прыпынілася развіццё сельскай гаспадаркі. Гарады, разбураныя ў час папярэдняй вайны, прыйшлі да яшчэ большага заняпаду. У Мінску засталося ўсяго некалькі тысяч жыхароў.

Рэч Паспалітая пачала слабець. Яе суседзі былі больш моцныя. Яны сталі ўмешвацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Краіна апынулася ў вельмі цяжкім становішчы.

1. Колькі гадоў доўжылася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай?
2. Што прынесла гэтая вайна жыхарам і гаспадарцы Беларусі?
3. Якая вайна працягвалася 21 год?
4. Якія страты Беларусі прынесла Паўночная вайна?

**1.** Вызначыце:

1) у якім стагоддзі адбылася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай;

2) колькі гадоў доўжылася Паўночная вайна.

**2.** Раскажыце пра бітву, якая адлюстравана на с. 109.

Шведская вайна скончылася перамогай Расійскай дзяржавы. Адбылася вялікая бітва каля горада Палтавы ва Украіне. У выніку бітвы шведы былі разбіты рускімі войскамі. Узначальваў рускае войска ў гэтай бітве цар Пётр I. І сёння ў напамін пра тыя падзеі людзі кажуць: «Уцякаюць, як шведы пад Палтавай».


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПЕРШЫЯ ДРУКАВАНЫЯ КНІГІ ЯК ПОМНІКІ БЕЛАРУСІ

## 28. Пачатак кнігадрукавання ў Беларусі. Францыск Скарына і Сымон Будны

1. Якімі былі першыя старажытныя кнігі?
2. Як выглядалі рукапісныя кнігі?
3. Што такое летапіс? Чаму ён так называецца?
4. Які з летапісаў усходніх славян з'яўляецца самым старажытным?
5. Хто ствараў рукапісныя кнігі?
6. На чым пісалі пісьмы нашы продкі?
7. Якога чалавека можна назваць патрыётам?
8. Якія беларускія гарады з'яўляліся галоўнымі цэнтрамі перапісвання кніг?

У старажытнасці нашы продкі карысталіся рукапіснымі кнігамі. Толькі ў 16 стагоддзі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся першыя друкаваныя кнігі. Распачаць кнігавыданне мог толькі вельмі адукаваны і таленавіты чалавек. Пачынальнікам гэтай няпростай справы ў Беларусі стаў ***Францыск Скарына***.


Францыск Скарына

Нарадзіўся Францыск Скарына каля ***1490 года*** ў старажытным горадзе Полацку. Спачатку ён навучаўся ў сваім родным горадзе, дзе атрымаў добрыя веды. Потым Францыск вучыўся ў польскім горадзе Кракаве і італьянскім горадзе Падуі.

Францыск Скарына, стаўшы выдатным вучоным, вырашыў заняцца кнігадрукаваннем. На Радзіме ўмоў для друкавання кніг на старабеларус-



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Тытульны ліст «Бібліі» Францыска Скарыны

кай мове не было. Таму Скарына адчыніў ***друкарню*** ў чэшскім горадзе ***Празе***. Тут ***6 жніўня 1517 года*** выйшла яго першая друкаваная кніга. Гэта была адна з частак Бібліі — ***«Псалтыр»***. У той час Біблія была адной з самых важных кніг. Па ёй тады вучыліся. Кнігі Скарыны пачалі выходзіць адна за адной. Кожная з іх на той час уяўляла сабой дзіва. Малюнкі да кніг былі зроблены з вялікім уменнем.

Біблія ўключае расказ пра жыццё і звычаі старадаўніх народаў, разумныя павучанні. Францыск Скарына марыў аб тым, каб зрабіць яе даступнай для ўсіх простых людзей. Таму ён друкаваў свае кнігі зразумелай для іх мовай. Скарына выдаў 23 кнігі Бібліі на роднай мове.

Пазней Францыск Скарына пераехаў у Вялікае Княства Літоўскае, у горад Вільню. Перавёз ён на Радзіму і сваю друкарню. Тут ён працягваў друкаваць кнігі. У кнігах Скарыны было шмат ілюстрацый. Літары, з якіх пачынаўся тэкст, упрыгожваліся малюнкамі. Каб яны лягчэй запаміналіся, каля літары «К», напрыклад, малявалася казлянятка, каля «З» — звер, каля «Л» — лён. А каля літары «Я» Скарына намаляваў свой партрэт.

Францыску Скарыне часта даводзілася пераязджаць з краіны ў краіну, з горада ў горад. Але ён ніколі не забываўся пра сваю Радзіму. У адной з кніг Скарына пісаў: «Звяры, якія жывуць у пустынях, ад нараджэння ведаюць свае норы. Птушкі, якія лятаюць у паветры, ведаюць свае гнёзды. Рыбы, якія плаваюць у морах і рэках, чуюць свае віры. Пчолы і ім падобныя бароняць свае вуллі. Так і людзі да таго месца, дзе нарадзіліся і выраслі, вялікую любоў маюць».

Кнігі Скарыны былі шырока вядомы ў Беларусі, Расіі, ва Украіне. Дзякуючы ім больш людзей змаглі стаць адукаванымі. Прыкладам уласнага жыцця Францыск Скарына паказаў, як трэба любіць свой народ і шанаваць родную мову. Ён быў патрыётам сваёй Радзімы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Помнік выдатнаму беларускаму першадрукару стаіць у яго родным горадзе Полацку. Яго імем названы вуліцы, плошчы, друкарні, бібліятэкі ў Беларусі і ў іншых краінах.

Прадоўжыў справу Францыска Скарыны вядомы беларускі друкар і вучоны ***Сымон Будны***.

Сымон Будны атрымаў выдатную адукацыю. Ён валодаў многімі мовамі, вучыўся ў розных краінах. Ён быў не толькі паслядоўнікам Скарыны, друкаром, але і выдатным мысліцелем. Адначасова ён займаўся справамі паляпшэння дзейнасці царквы ў Вялікім Княстве Літоўскім. Сымон Будны стаў адным з заснавальнікаў друкарні ў Нясвіжы. Тут ён у ***1562 годзе*** надрукаваў знакамітую кнігу на беларускай мове «***Катэхізіс***». Яна была напісана ў форме пытанняў і адказаў на рэлігійныя тэмы. Сымон Будны лічыў, што ўсе людзі, багатыя і бедныя, павінны быць роўнымі перад законам і жыць у міры. А калі неабходна, то трэба бараніць сваю Радзіму. У нясвіжскай друкарні былі выдадзены і іншыя кнігі Сымона Буднага. Некаторыя з іх дайшлі да нашага часу.



У старажытнай друкарні



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Помнік Сымону Буднаму

Кнігі Сымона Буднага вучылі людзей любіць сваю Радзіму, паважаць законы.

Зараз у Нясвіжы каля старажытнага касцёла стаіць помнік Сымону Буднаму. У адной руцэ ён трымае кнігу. Другой рукой нібы перагортвае яе старонкі і запрашае пачытаць. У Нясвіж часта прыязджаюць людзі з розных краін. І ўсе яны прыходзяць пакланіцца Сымону Буднаму за тое, што ён зрабіў для людзей.

Кнігавыдавецкая дзейнасць Францыска Скарыны і Сымона Буднага садзейнічала развіццю нашай роднай мовы, спрыяла пашырэнню адукаванасці тагачаснага грамадства.

**1.** Калі на тэрыторыі Беларусі з’явіліся першыя друкаваныя кнігі?
**2.** Растлумачце слова «першадрукар».
**3.** Хто быў першым беларускім друкаром?
**4.** У якім горадзе Францыск Скарына надрукаваў сваю першую кнігу?
**5.** Што пісаў Францыск Скарына пра сваю Радзіму?
**6*.** Чым адрознівалася друкаваная кніга ад рукапіснай?
**7.** Якія славутыя людзі мінуўшчыны нарадзіліся ў Полацку?
**8.** Хто працягнуў справу Францыска Скарыны?
**9.** У якім годзе Сымон Будны выдаў сваю знакамітую кнігу на беларускай мове? Як яна называлася?
**10.** Да чаго Сымон Будны заклікаў людзей у сваіх творах?
**11.** У якім горадзе стаіць помнік Сымону Буднаму?
**12*.** Чаму зараз людзей, якія займаюцца выданнем кніг, не называюць першадрукарамі?
**13*.** Якую мову беларусы называюць «матчынай мовай»?
**14*.** Чаму беларускую мову можна назваць «матчынай мовай»?

**1.** Ефрасіння Полацкая займалася перапісваннем кніг. Падлічыце, колькі стагоддзяў прайшло з таго часу да выдання першай друкаванай кнігі Францыскам Скарынам.

**2.** Прадоўжыце сказ.

*У цэнтры сучаснага горада Полацка ўзвышаецца помнік знакамітаму беларускаму першадрукару (…).*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Прадоўжыце сказ.

*Сёння ў Нясвіжы побач з касцёлам стаіць помнік (…).*

**4.** Растлумачце сэнс слоў Францыска Скарыны: «Звяры… ад нараджэння ведаюць свае норы. Птушкі… ведаюць свае гнёзды… Пчолы… бароняць свае вуллі. Так і людзі да таго месца, дзе нарадзіліся і выраслі, вялікую любоў маюць».

**5*.** Растлумачце сэнс выразаў:

а) патрыёт сваёй радзімы;

б) валодаў многімі мовамі.

**6.** Разгледзьце ўважліва малюнак на с. 112 і адкажыце на пытанне. Ці ёсць на тытульным лісце «Бібліі» Ф. Скарыны літары, не падобныя на сучасныя?

**7.** Паводле тэксту складзіце план расказу пра жыццё і дзейнасць Сымона Буднага.



**1.** Пакажыце на картасхеме на с. 104 гарады Полацк, Вільню.

**2.** На тэрыторыі якой сучаснай вобласці размяшчаецца горад Полацк?

**3.** Пакажыце на гэтай жа картасхеме горад, у якім нарадзіўся Францыск Скарына.



Наведайце разам з бацькамі ці класам горад Полацк. Пабывайце ў Музеі беларускага кнігадрукавання. Што вы там убачылі? Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.



Друкаванне кніг дало магчымасць значна большай колькасці людзей стаць адукаванымі.

Кнігі, выдадзеныя Францыскам Скарынам, былі добра вядомы не толькі ў Беларусі. Яны сталі прыкладам для далейшага развіцця друкарства ў Маскве і ва Украіне. У Маскве гэтую справу прадоўжылі друкары Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец. Першую друкаваную кнігу яны выдалі ў 1564 годзе. Дарэчы, Пётр Мсціславец быў родам з беларускага горада Мсціслава. Ва Украіне першая друкаваная кніга з'явілася ў 1574 годзе. Такім чынам, Францыск Скарына паклаў пачатак кнігавыданню не толькі ў Беларусі, але і сярод усходніх славян.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 29. Развіццё адукацыі і мастацтва. Вучоны і асветнік Сімяон Полацкі

1. Хто такая Ефрасіння Полацкая?
2. Хто такі Францыск Скарына?
3. Чым яны праславіліся?
4. Хто такія асветнікі?

Нягледзячы на значныя страты ў час войнаў, у Беларусі развіваліся асветніцтва і мастацтва.

На нашай зямлі распаўсюджваліся кнігі. Іх чыталі пісьменныя людзі. Па кнігах вучыліся дзеці.

Відаць, няма ў Беларусі іншага горада, які даў бы нашай Радзіме столькі знакамітых людзей мінуўшчыны, як старажытны Полацк. Вы ўжо ведаеце, што ў Полацку нарадзіліся, потым сталі сусветна вядомымі Ефрасіння Полацкая і Францыск Скарына. Яны сваёй дзейнасцю праславілі нашу Радзіму на ўвесь свет.

У ***1629 годзе*** ў Полацку ў заможнай сям'і нарадзіўся хлопчык, які таксама праславіў Беларусь. Гэта ***Сімяон Полацкі***.

Такое імя ён атрымаў значна пазней, калі стаў манахам і славутым пісьменнікам. А ў дзяцінстве хлопчык хадзіў у школу ў Полацку і ва ўсім паказваў сябе здольным і працавітым. Затым ён працягваў вучобу ў іншых гарадах. Спачатку паехаў у Кіеў, а адтуль — у Вільню. Там ён вучыўся ў акадэміі. Малады палачанін вывучаў розныя мовы, граматыку, матэматыку, музыку і навуку пра тое, як пісаць вершы.



Сімяон Полацкі

Вільня тады была сталіцай Вялікага Княства Літоўскага — калісьці багатай і магутнай Беларуска-Літоўскай дзяржавы. У той час пачалася вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Тады наш зямляк вярнуўся ў родны горад Полацк. Там ён вырашыў стаць манахам і атрымаў імя Сімяон. Пры манастыры ў Полацку была невялікая школа. У ёй малады манах пэўны час працаваў настаўнікам. Дзеці вельмі любілі свайго



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

настаўніка за цікавыя ўрокі. Ён часта чытаў ім уласныя вершы. Акрамя гэтага, Сімяон стварыў школьны тэатр. Настаўнік разам з вучнямі выступаў у спектаклях.

Неўзабаве Полацк быў заняты рускім войскам. Прыбыў у горад і сам расійскі цар. Вучоны манах выступіў перад ім са сваімі вершамі.

Праз некаторы час Сімяон пераехаў у Маскву па запрашэнні маскоўскага цара. Вялікі асветнік, ён заўсёды імкнуўся дзяліцца з людзьмі сваімі ведамі. У Маскве Сімяон напісаў шмат кніг. У царскім палацы адчыніў друкарню. Першай надрукаванай там кнігай стаў складзены ім самім ***«Буквар»***. Вучоны палачанін заснаваў першую ў Маскве вышэйшую навучальную ўстанову — акадэмію. Сімяон, якога ў Маскве пачалі называць Полацкім, перакладаў кнігі на розныя мовы. З удзелам Сімяона Полацкага пры двары рускага цара быў створаны прыдворны тэатр. Ён напісаў многа вершаў і п'ес для спектакляў. Акцёрамі ў тэатр ён запрасіў таленавітых землякоў. Расійскі цар даверыў Сімяону выхаванне сваіх дзяцей. Сярод іх быў і васьмігадовы хлопчык Пётр, які ў будучым стаў царом Расійскай дзяржавы.

Жывучы ў Маскве, Сімяон Полацкі часта ўспамінаў Беларусь. Ён шмат пісаў на роднай мове, у творах зычыў роднай зямлі міру, шчаслівага і заможнага жыцця. Ён пажадаў, каб частка яго бібліятэкі была пасля яго смерці перавезена на радзіму, у Полацк. Рознабаковая дзейнасць нашага земляка стала падставай для таго, каб яго ўшаноўвалі людзі і ў Беларусі, і ў Расіі.

**?**

1. Чым праславіўся Сімяон Полацкі?
2. Назавіце асноўныя перыяды жыцця Сімяона Полацкага.



**1.** Суаднясіце дзейнасць з імёнамі:

| | |
|---|---|
| Францыск Скарына | прадаўжальнік друкарскай справы |
| Сымон Будны | манах і настаўнік |
| Сімяон Полацкі | першадрукар |

**2.** Паводле тэксту складзіце план апавядання пра жыццё і дзейнасць Сімяона Полацкага. Выкарыстайце малюнак на с. 116.



**1.** Пакажыце на картасхеме на с. 104 гарады Полацк, Нясвіж, Вільню.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** На тэрыторыі якіх сучасных абласцей размяшчаюцца гарады Полацк і Нясвіж?
**3.** Пакажыце на гэтай жа картасхеме горад, у якім нарадзіўся Сімяон Полацкі.

Наведайце разам з бацькамі ці класам гарады Полацк і Нясвіж. У Полацку пабывайце ў Музеі беларускага кнігадрукавання. Агледзьце помнікі знакамітым людзям Полацка і Нясвіжа. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі.

Шмат знакамітых людзей жылі і працавалі на беларускай зямлі. Адным з іх з’яўляецца Мікола Гусоўскі. Нарадзіўся ён ва Усе (Усаве). Гэта адно з беларускіх паселішчаў Вялікага Княства Літоўскага. Мяркуюць, што бацька яго быў паляўнічым. Адукацыю Мікола Гусоўскі атрымаў у адной з мясцовых школ пры царкве. Затым здольны малады чалавек вучыўся ў Вільні, Польшчы і Італіі.

Мікола Гусоўскі быў чалавекам высокай адукаванасці і культуры. Ён выконваў важныя дзяржаўныя даручэнні. Быў паслом у іншаземных дзяржавах. Так ён апынуўся ў Італіі, дзе вывучаў мову і культуру гэтай краіны. Там Мікола Гусоўскі напісаў самы вядомы са сваіх твораў — «Песню пра зубра». Ён заклікаў людзей да згоды паміж сабой. Паэт лічыў, што чалавек не павінен брацца за зброю дзеля захопніцтва і насілля. Між тым Мікола Гусоўскі прызнаваў высакароднай справай абарону сваёй зямлі. З гэтай прычыны ён высока ацэньваў дзейнасць Вітаўта. Паэт называў час праўлення гэтага князя ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве залатым векам.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# ПАСЕЛІШЧЫ І ЖЫЦЦЁ СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСАЎ

## 30. Гарады і вёскі Беларусі

1. Як выглядалі гарады Беларусі ў старажытнасці?
2. Для чаго ўзводзіліся абарончыя збудаванні вакол старажытных гарадоў?
3. Назавіце даты заснавання гарадоў. Скарыстайцеся для гэтага «стужкай часу», падрыхтаванай, калі вы працавалі над параграфам 21.
4. Раскажыце, адкуль узяліся назвы нашай сталіцы і абласных гарадоў.

Развіццё беларускіх гарадоў у 18 стагоддзі пасля працяглых войнаў ішло марудна. На той час яны былі невялікімі. Многія з іх мелі вельмі мала жыхароў. Частыя войны прымушалі гараджан будаваць магутныя ўмацаванні. Найбольш умацаванымі былі такія гарады, як Нясвіж, Слуцк, Шклоў, Быхаў і іншыя. Абарончыя збудаванні гарадоў — земляныя валы, глыбокія равы, запоўненыя вадой, і перакідныя масты праз іх — страцілі сваё значэнне. Яны пакрыху разбураліся.

Вуліцы і плошчы гарадоў забудоўваліся па новых планах. Цяпер у цэнтры горада размяшчалася плошча. Ад плошчы ў розныя бакі разыходзіліся вуліцы.



Мураваны дом рамесніка ў Нясвіжы



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Ратуша ў Віцебску.
Сучасны выгляд

На рыначнай плошчы ўзводзілася **ратуша**[1]. Але не кожны горад меў на гэта права. Ратушу будавалі, калі гораду надавалася права на самакіраванне. Першым з сучасных беларускіх гарадоў яго атрымаў Брэст яшчэ ў ***1390 годзе***. Пазней права на самакіраванне атрымалі Гродна, Слуцк, Полацк, Мінск, Віцебск і іншыя гарады. Ратуша была галоўным будынкам горада. У ёй вырашаліся ўсе справы гарадскога жыцця. Вежа ратушы высока ўздымалася над іншымі збудаваннямі. Некаторыя ратушы мелі вежы з гадзіннікам. Частка іх захавалася да нашага часу — напрыклад, Віцебская ратуша. Сёння гэта помнік гісторыі і культуры, які з’яўляецца каштоўнасцю нашага народа і ахоўваецца дзяржавай.

У гарадах будаваліся таксама цэрквы, касцёлы, школы, тэатры, друкарні, **корчмы**[2], іншыя будынкі. У корчмах можна было паесці, таму яны меліся не толькі ў гарадах. Яны адчыняліся і ў вёсках, на скрыжаваннях вялікіх дарог. Дамы і гаспадарчыя пабудовы ў гарадах былі ў асноўным драўляныя. Мураваныя будынкі сустракаліся рэдка. Гэта былі дамы самых багатых гараджан, ратуша ці замак. Многія гарады мелі свае асабістыя знакі — гербы.

Цэрквы і касцёлы былі ўпрыгожаны іканапіснымі творамі, фрэскамі, скульптурамі. Для іх будаўніцтва і афармлення запрашаліся лепшыя майстры з беларускіх зямель, а таксама з замежжа.

Тыя старадаўнія будынкі, якія дайшлі да нашых дзён, з’яўляюцца архітэктурнай спадчынай Беларусі. Яны ахоўваюцца законам. Напрыклад, збудаваныя ў 16 стагоддзі касцёл у Нясвіжы, царква ў Заслаўі, царква-крэпасць у вёсцы Мураванка (Гродзеншчына) і іншыя.

[1] **Ра́туша** — будынак, дзе размяшчаліся органы гарадскога самакіравання.
[2] **Карчма́** — дом, прызначаны для харчавання, адпачынку і начлегу падарожнікаў.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Вёскі ў Беларусі ў тыя часы мелі ў асноўным адну вуліцу, паабапал якой ставіліся хаты. У некаторых вёсках на адным баку вуліцы будавалі толькі жыллё, а на другім — гаспадарчыя пабудовы. Усе будынкі ў вёсках былі драўляныя. Толькі дзе-нідзе можна было ўбачыць мураваную царкву ці касцёл.

Не толькі ў гарадах, але і ў буйны́х вёсках меліся абарончыя збудаванні.

Буйны́я вёскі, дзе развіваліся рамёствы, атрымалі назву **мястэчак**[1]. Яны былі нечым сярэднім паміж вёскай і горадам.

1. Як выглядалі гарады Беларусі ў 18 стагоддзі?
2. У якіх гарадах Беларусі ўзводзіліся ратушы?



Гандаль у мястэчку

[1] **Мястэ́чка** — вялікая вёска з рысамі горада.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3.** Якую ролю ратуша адыгрывала ў жыцці горада?
**4.** Які з сучасных беларускіх гарадоў першым атрымаў права на самакіраванне?
**5.** Што такое мястэчка?
**6*.** Чаму ў 18 стагоддзі абарончыя збудаванні, якія былі ўзведзены ў гарадах у старажытнасці, страцілі сваё значэнне і разбураліся?

Складзіце расказ па малюнку на с. 121.

Звярніцеся да картасхемы на с. 17. Адкажыце на пытанні. Пацвердзіце свае адказы паказам на картасхеме. Успомніце, як называецца водны шлях, па якім плавалі купцы ў іншыя краіны. Адкуль і куды ён вёў? З якімі морамі і рэкамі ён быў звязаны? Якія беларускія гарады знаходзіліся на гэтым шляху?

Даведайцеся ў старэйшых:
1) калі ўзнік ваш населены пункт;
2) што вядома аб даце яго ўзнікнення;
3) адкуль пайшла назва вашага населенага пункта;
4) як выглядаў ваш горад ці вёска ў мінулым;
5) ці існавала ў вашым населеным пункце ратуша.

**1.** Пачынаючы з 14 стагоддзя беларускія гарады атрымалі права на самакіраванне. Гэта права называлася «магдэбургскае». Яно склалася ў нямецкім горадзе Магдэбург. Згодна з гэтым правам у межах горада ўсе жыхары мелі асаблівыя правы і абавязкі. Напрыклад, рыцары ў горадзе вызваляліся ад розных павіннасцей, ад суда і ўлады ваяводаў і іншых службовых асоб. Гараджанам дазвалялася ўзводзіць гандлёвыя і заезныя дамы, грамадскія лазні і іншыя неабходныя гораду пабудовы, атрымліваць з іх даходы. Усталяваліся правілы гандлю і рамяства. Вызначаліся пакаранні за розныя віды правапарушэнняў. Ствараліся органы гарадскога самакіравання. Прымаліся мясцовыя законы.

Магдэбургскае права мелі каля 60 гарадоў і мястэчак сучаснай Беларусі. Першым такім горадам стаў Брэст, а потым Гродна, Полацк, Мінск, Магілёў, Гомель, Віцебск. Кожны з гэтых гарадоў набыў свой герб.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Больш за пяць стагоддзяў існуе горад Хойнікі ў Гомельскай вобласці. З сярэдзіны 16 стагоддзя ён уяўляў сабой мястэчка. Праз пэўны час у мястэчку налічвалася амаль 3 тысячы жыхароў. Працавалі 2 школы, 26 крам, паштовая станцыя. Існавалі некалькі прадпрыемстваў, царква і іншае. Насельніцтва здаўна займалася ткацтвам, вышыўкай, пляценнем.

**3.** Гандаль ва ўсім свеце садзейнічаў развіццю зносін паміж людзьмі і дзяржавамі. Мы прызвычаіліся да таго, што без грошай нельга абысціся. Між тым грошы існавалі не заўсёды. У розных краінах людзі, гандлюючы, разлічваліся па-рознаму. Мерай разліку былі, напрыклад, марскія ракавіны, соль, жалезныя пруты, шкуры жывёл і многае іншае. У нашых далёкіх продкаў грошай таксама не было. Яны проста абменьвалі адны рэчы на другія. Жывёлу, футры, мёд, воск мянялі на зброю з Заходняй Еўропы, упрыгажэнні, прывезеныя арабскімі купцамі. Першыя грошы з'явіліся ў Грэцыі і Рыме. Праз Беларусь праходзілі важныя гандлёвыя шляхі. Такім чынам на беларускіх землях і з'явіліся першыя грошы ў выглядзе сярэбраных манет. Яны вырабляліся ў арабскіх дзяржавах і мелі назву ***дырхемы***. Пад Полацкам школьнікі знайшлі сапраўдны скарб. Гэта былі восем тысяч арабскіх дырхемаў. Важыў скарб амаль 20 кілаграмаў.

Пад уплывам часу змяняліся і грашовыя адзінкі. На Беларусі выкарыстоўвалі ***грыўну***, затым — ***грош***. Пазней шырокае распаўсюджанне ў Еўропе атрымаў ***талер***. Ужываць яго пачалі і на нашых землях. Для вырабу грошай ствараліся прадпрыемствы. Іх называлі манетнымі дварамі. Талер чаканілі на галоўным манетным двары ў Вільні.

Уладары зямлі беларускай імкнуліся ўводзіць і свае грошы. З цягам часу пачалі выкарыстоўваць срэбны рубель, медныя капейкі. Былі спробы выпускаць і залатыя манеты. Але паступова сталі ўжываць папяровыя грошы. Як на старадаўніх манетах, так і на папяровых грашах адлюстраваны гербы. Ёсць на іх партрэты знакамітых асоб таго часу, адзначаны і гады выпуску. Вось чаму грошы таксама з'яўляюцца крыніцай ведаў па гісторыі.

Навука, якая вывучае гісторыю грошай, называецца ***нумізматыкай***. Людзі, што захапляюцца збіраннем старадаўніх манет і папяровых грошай, — ***нумізматы***. Трымаючы ў руках такую манету, мы быццам пераносімся на многія стагоддзі ў глыбіню гісторыі.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# 31. Сядзібы сялян, шляхты і гараджан

1. Хто такія прыгонныя сяляне?
2. Якім было жыццё сялян?
3. Якія вынікі мелі войны на зямлі Беларусі?
4. Каго называлі шляхтай?
5. Назавіце прадстаўнікоў простых гараджан.

Жыццё тагачасных сялян было вельмі цяжкім. Развіццю іх гаспадаркі перашкаджалі прыгнёт з боку землеўласнікаў і частыя войны.

Сядзіба селяніна была вельмі беднай. Яна складалася з ***курнай хаты*** і некалькіх гаспадарчых пабудоў. Дым з печы ў жытле селяніна выходзіў праз адтуліну над нізкімі дзвярыма або ў столі. Вокны не мелі шкла. У холад іх затыкалі анучамі і саломай. Падлогай служыла ўтрамбаваная гліна.

Галоўнае месца ў хаце займала ***печ***. Уздоўж сцен знаходзіліся ***лавы*** для сядзення. Яны рабіліся з шырокіх дошак. У куце хаты стаяў ***стол***. У гэтым куце абавязкова віселі **абразы (іконы)**[1]. Сяляне спалі на ***палацях*** і на печы. Палаці рабіліся як насціл з дошак паміж печчу і процілеглай сцяной. Асвятляліся хаты ***лучынай***. У самых бедных сялян гаспадарчых пабудоў не было. Для жывёлы адгароджваўся куток у хаце.

Хаты больш багатых сялян мелі сенцы, якія прыбудоўваліся да жылой часткі. У іх адгароджвалася ***кладоўка*** для захоўвання хатніх рэчаў. Сцены ў хаце бялілі ***вапнай***. Але ад густога дыму яны хутка чарнелі. Вокны ў такіх хатах таксама не мелі шкла. Шыбы ў сялянскіх хатах з'явіліся значна пазней. Стол, лавы, палаці былі зроблены з больш якасных дошак. Адзенне і іншыя вырабы з тканіны сяляне захоўвалі ў драўляных скрынях. Іх называлі ***куфрамі***.



Курная сялянская хата

Наводдаль ад хаты селяніна стаяў ***хлеў*** для жывёлы. ***Гумно***, куды склада-

[1] **Абра́з (іко́на)** — выява Бога, Маці Божай ці святых, якая служыць прадметам пакланення хрысціян.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



У сялянскай хаце

ліся збажына і сена, будавалі побач з хатай. Больш багатыя гаспадары ставілі яшчэ ***клеці*** для захоўвання прадуктаў. Сваё месца на падвор'і мелі дровы і земляробчыя прылады. Іх складалі пад ***павець***.

Шляхецкія сядзібы значна адрозніваліся ад сялянскіх. Вакол дома шляхты звычайна ўзводзілася агароджа з ***варотамі***. Зверху яны былі пакрыты невялічкай стрэшкай. Шляхецкі дом меў высокі ганак і вялікія дзверы. Яны вялі ў прасторныя сенцы. У дамах мелася некалькі жылых памяшканняў. З аднаго боку ад сенцаў былі пакоі для прыёму гасцей і спальні. З другога — дзіцячыя і рабочыя пакоі. Кухні будаваліся асобна. Дым з печаў выходзіў праз ***коміны***.

Пры шляхецкіх сядзібах было больш гаспадарчых пабудоў. Для ўтрымання свойскай жывёлы будаваліся кароўнікі, канюшні, свінарнікі. Для дроў майстравалі павеці.

Найбольш багатая шляхта (магнаты) будавала вялікія і шыкоўныя ***палацы***. Каля кожнага такога будынка абавязкова высаджваўся ***парк***. Якіх толькі раслін там не было! Іх прывозілі з розных куткоў свету.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Палац ў Гомелі

У палацах магнатаў на сценах віселі дываны, карціны, паляўнічая і вайсковая зброя. Пакоі асвятляліся ***свечкамі***. З цягам часу з'явілася мяккая мэбля: канапы, крэслы, ложкі.

Дамы простых гараджан былі амаль падобныя на сялянскія хаты. Многія гараджане займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй. Таму побач з іх дамамі знаходзіліся гаспадарчыя пабудовы.

Жыллё заможных жыхароў горада значна адрознівалася сваім вонкавым выглядам. У іх дамах можна было ўбачыць ***балконы, лесвіцы, вастраверхія дахі***.

Шматпавярховыя будынкі сустракаліся тады вельмі рэдка.



1. Як выглядалі вёскі Беларусі ў мінулым?
2. Назавіце асноўныя часткі тагачаснай сялянскай сядзібы.
3. Раскажыце, якую ролю выконвала кожная з іх.
4. Што такое курная хата?
5. Назавіце асноўныя часткі шляхецкай сядзібы.
6. Якімі былі дамы простых і заможных гараджан?



**1.** Апішыце знешні выгляд курнай хаты з дапамогай малюнка на с. 124.

**2.** З дапамогай малюнка на с. 125 і тэксту раскажыце, што знаходзілася ў хаце селяніна.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**3*.** Параўнайце тагачасную сядзібу селяніна з сучаснай.
**4.** Параўнайце сядзібы шляхты і сялян з дапамогай плана:
1) асноўныя часткі сядзібы шляхты;
2) роля кожнай часткі сядзібы шляхты;
3) асноўныя часткі сядзібы сялян;
4) роля кожнай часткі сядзібы сялян.

**1.** Спытайце ў сваіх бабуль і дзядуляў, што яны ведаюць пра тое, як жылі іх продкі. Раскажыце.
**2.** Даведайцеся, ці ёсць у вашай мясцовасці былая магнацкая сядзіба. Раскажыце.

Наведайцеся з бацькамі ці класам у бліжэйшы музей сялянскага побыту, магнацкую сядзібу або палац, якія захаваліся. Раскажыце, што вы там убачылі.

## 32. Ежа, посуд і адзенне беларусаў у даўнія часы

1. Якія войны адбыліся на тэрыторыі Беларусі ў 17—18 стагоддзях?
2. Як гэтыя войны адбіліся на развіцці сялянскай гаспадаркі?
3. Як апранаўся старажытны чалавек?
4. Калі нашы продкі пачалі выкарыстоўваць ткацкі станок?
5. З чаго ў старажытнасці рабілі адзенне, абутак?

Пасля Паўночнай вайны жыццё сялян было цяжкім. Многія з іх загінулі, іншыя вельмі збяднелі. Таму значна зменшыліся плошчы пасеваў і колькасць жывёлы. Сяляне жылі надгаладзь.

Галоўнае месца ў харчаванні селяніна займаў хлеб. Яго вельмі шанавалі. Хлеба не заўсёды хапала да новага ўраджаю. А такой расліны, як бульба, сяляне ў 18 стагоддзі яшчэ не ведалі. Яна стала штодзённай ежай сялян значна пазней.

Сяляне звычайна спажывалі тое, што вырошчвалі на сваёй зямлі. Стравы гатаваліся з буракоў, капусты і іншай гародніны. У галодныя часы елі шчаўе, крапіву, лебяду.

Сала і мяса падаваліся на стол толькі ў святы, часам у нядзелю. Калі паблізу мелася рака ці возера, добрай дапамогай сялянам была рыба. Яе сушылі або вэндзілі ў запас.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Драўляны і гліняны посуд

На працягу ўсяго года ўжывалі і тое, што давала прырода. Лясы былі багатыя на арэхі, ягады і грыбы.

Уся сялянская сям'я ела з адной вялікай міскі драўлянымі лыжкамі. Часам на стол замест міскі ставіўся гаршчок з ежай. Увесь сялянскі ***посуд*** быў ***драўляны*** ці ***гліняны***. Першым за стол заўсёды садзіўся гаспадар. Малыя дзеці елі асобна, асабліва ў вялікіх сем'ях.

Ежа багатай шляхты ў адрозненне ад сялянскай была разнастайнай. Гатаваліся стравы з прадуктаў, якія прывозіліся з далёкіх краін. Ужываліся дарагая рыба, чай і кава. На стол падаваліся адразу некалькі страў.

Багатая шляхта мела і зусім іншы посуд, чым сяляне. На сталы багатых людзей ставіўся ***алавяны, срэбны*** і ***залаты посуд***. Заможныя шляхціцы карысталіся не толькі лыжкамі, але і відэльцамі і нажамі. Для напояў былі кубкі, шклянкі, чаркі.



Срэбны посуд шляхты



Фарфоравы посуд шляхты



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

У гэты час з’явіўся ***фарфоравы посуд***. Выраблялі яго з белай гліны. Ён быў распісаны прыгожымі малюнкамі, рознакаляровымі фарбамі.

Сялянская вопратка ў 17—18 стагоддзях, як і раней, у асноўным рабілася ўласнымі рукамі. Выраблялася яна з ільну, воўны і аўчыны. Паўсядзённае адзенне было з палатна. З яго шылі верхняе адзенне і бялізну. Зімой сяляне насілі ***кажухі*** або суконныя ***світкі***.

На святы сяляне надзявалі святочную вопратку. Жаночыя ***кашулі*** і ***фартухі*** былі ўпрыгожаны вышыўкай. Мужчыны па святах таксама насілі вышываныя кашулі. На свята мужчыны абувалі ***боты***, а жанчыны — ***чаравікі***. На кожны дзень сяляне плялі з лазовай ці ліпавай кары ***лапці***.

Беларускі селянін летам насіў пераважна ***саламяны капялюш***. Сяляне насілі таксама зваленыя з воўны ***шапкі*** і капелюшы.

Жыхары вёскі амаль не набывалі прывазных вырабаў. Выключэннем былі хусткі, шапкі, зрэдку чаравікі і боты.



Адзенне сялян: злева — штодзённае, справа — святочнае



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Адзенне шляхты значна адрознівалася ад сялянскага. Асноўнай мужчынскай вопраткай шляхты былі ***кунтушы***. Гэта доўгае верхняе адзенне ў выглядзе кафтана з разрэзанымі рукавамі. Кунтуш звычайна завязваўся поясам.

Апраналася шляхта і ў ***жупаны***. Гэтае верхняе адзенне з каляровага сукна мела вузкія рукавы і стаячыя каўняры.

Са шкур звяроў на зіму шыліся футры і шапкі. Для гэтага ўжываліся дарагія шкуры лісы, бабра, гарнастая і іншых звяроў.

Паказчыкам заможнасці шляхціца былі боты. Абутак чорнага колеру насіла збяднелая шляхта. Жоўтыя і чырвоныя боты шыла сабе багатая частка шляхты.

З замежжа прыйшла мода на ***фракі*** і ***камізэлькі***. Шляхціцы апраналі фракі ў святы.

Шляхцянкі хадзілі ў ***кафтанах*** і шырокіх ***спадніцах***. Доўгія ***сукенкі*** без рукавоў яны надзявалі ў свята. Яны ж у гэты час пачалі выкарыстоўваць парфуму, мазі і пудру. Іх прывозілі з іншых краін.



Адзенне шляхты: злева — святочнае, справа — штодзённае



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1. Чаму ў 18 стагоддзі сяляне жылі надгаладзь?
2. Якія прадукты ўжывалі сяляне?
3. Што займала галоўнае месца ў харчаванні сялян?
4*. Чаму сала і мяса ўжываліся сялянамі толькі ў святы?
5. Якім посудам карысталіся сяляне?
6. Як харчавалася шляхта?
7. Якія прадукты выкарыстоўвала шляхта?
8. Апішыце посуд на сталах у шляхты.
9. З чаго вырабляўся посуд шляхты?
10*. Чым адрознівалася харчаванне сялян і шляхты?
11. Як апраналіся беларускія сяляне?
12. Якое адзенне было ў шляхты?
13. Чым адрознівалася адзенне сялян і шляхты?

**1.** Разгледзьце малюнкі на с. 128. Параўнайце посуд сялян і шляхты.
**2.** Назавіце, хто апранаў фартух, саламяны капялюш, кунтуш, жупан. Пакажыце гэтае адзенне на малюнках.
**3.** Параўнайце беларускае народнае адзенне з касцюмамі шляхты (выкарыстайце малюнкі на с. 129—130) паводле наступнага плана:
а) галаўныя ўборы жанчын;
б) галаўныя ўборы мужчын;
в) жаночае адзенне;
г) мужчынскае адзенне;
д) зручнасць адзення ў паўсядзённым жыцці.

Пацікаўцеся ў старэйшых, як сёння выкарыстоўваецца саламяны капялюш. Ці даводзілася вам дзе-небудзь бачыць людзей у старадаўнім адзенні сялян і шляхты? Раскажыце пра гэта.

## 33. Замкі Беларусі — дзівосныя помнікі мінуўшчыны

1. Што такое дзядзінец?
2. Цэнтрам якога паселішча ён з’яўляўся?
3. Што ўяўляў сабою дзядзінец? Раскажыце.

Нашым продкам не раз даводзілася адбіваць напады ворагаў. Каб абараніць сябе і сваю зямлю, яны будавалі замкі. ***Замак*** — гэта старадаўняе добра ўмацаванае збудаванне. Мяркуюць, што слова «замак»


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

утварылася ад слова «замок». Старажытныя ўмацаваныя збудаванні былі сапраўднымі «замка́мі» для ворагаў.

Самымі высокімі пабудовамі замка былі ***вежы***. З іх адкрываўся добры агляд навокал. Вежы ўзводзіліся звычайна на вуглах абарончых ***сцен***. На вежах замка ўдзень і ўначы стаялі вартавыя. Яны сачылі за наваколлем. Калі на горад нападалі ворагі, з вежаў і сцен на іх лілася расплаўленая смала, ляцелі камяні. Воіны-абаронцы стралялі па ворагу з лукаў, пазней — з ружжаў.



Старажытны замак з вежамі



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Нямецкія рыцары пад сценамі Навагрудскага замка

Хоць замак і належаў князю або багатаму чалавеку, але ў час небяспекі ўсе навакольныя жыхары ратаваліся ў ім. Усе разам і абаранялі яго, а значыць і свае сядзібы, сваю зямлю.

Асаблівым клопатам князя Вялікага Княства Літоўскага была абарона межаў дзяржавы. Таму самыя магутныя замкі ўзводзіліся ўздоўж граніц. Першыя замкі былі пабудаваны з дрэва. Але такія замкі доўга не існавалі. Ворагі іх падпальвалі, агонь знішчаў усё. Потым людзі пачалі будаваць замкі з каменю і цэглы. На тэрыторыі Беларусі першыя мураваныя замкі з'явіліся ў Лідзе, Навагрудку, Крэве. Гэтыя замкі непадобныя адзін да аднаго.

У ***Навагрудскага замка***, ад якога засталіся толькі руіны, было ажно сем вежаў. ***Лідскі*** і ***Крэўскі замкі***, наадварот, падобныя між сабою, як блізняты. Яны мелі форму чатырохвугольніка і па дзве вежы ў вуглах.

Таўшчыня сцен замка дасягала 3 метраў, вышыня — 12 метраў, а даўжыня сцен складала 400—500 метраў. Замкі былі акружаны ровам з вадою.

Крэўскі замак, які амаль што не захаваўся, мае надзвычай багатую гісторыю. Тут адбылося падпісанне Крэўскай уніі, якая замацавала саюз Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Мірскі замак

***Гродзенскі замак*** збудаваны яшчэ ў 12 стагоддзі. Пазней тут праводзіліся з'езды-соймы Рэчы Паспалітай — вялікай дзяржавы, у склад якой уваходзілі беларускія, польскія і літоўскія землі. Замак меў вельмі цікавую канструкцыю моста. Зараз у замку размешчаны музей. У ім захоўваецца шмат гістарычных прадметаў і матэрыялаў.

У 16 стагоддзі былі пабудаваны замкі ў Міры, Нясвіжы, Гальшанах. Кожны з іх меў сваю асаблівасць. Самым прыгожым быў ***Гальшанскі замак***. Ён захаваўся да нашых дзён, але ў разбураным стане.

***Мірскі замак*** вылучаўся суровым выглядам. У 2010 годзе адбылося адкрыццё адноўленага Мірскага замка. У яго залах можна ўбачыць узоры мэблі, калекцыі старажытных рэчаў — зброі, музычных інструментаў, прадметы побыту, а таксама карціны. Яго наведваюць шмат турыстаў, у тым ліку замежных. У ім ладзяцца розныя канцэрты, музычныя святы з удзелам гасцей з нашай краіны і замежжа.

Самым багатым і вельмі прыгожым з'яўляецца ***Нясвіжскі замак***. Ён належаў старажытнаму роду князёў Радзівілаў. Замак стаіць амаль што на востраве, між азёр. У яго пакоях і залах у розныя часы захоўваліся разнастайныя цікавыя калекцыі: рыцарская зброя, каштоўныя камяні, абразы, карціны. Бібліятэка замка налічвала 20 тысяч кніг і гістарычных дакументаў. Нясвіжскі замак зараз адноўлены і прыцягвае ўвагу мноства турыстаў. У замку ладзяцца балі, канцэрты, што прываблівае людзей, якія цікавяцца гісторыяй.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Нясвіжскі замак

Беларусь ганарыцца сваімі старадаўнімі замкамі. Мірскі і Нясвіжскі замкі, напрыклад, уключаны ў спіс ***Сусветнай спадчыны***. Гэта значыць, што яны належаць да самых велічных і каштоўных збудаванняў свету.

**1.** Для якіх мэт будаваліся замкі?
**2.** Чаму большасць замкаў узводзілася на межах Вялікага Княства Літоўскага?
**3.** У якіх гарадах Беларусі з’явіліся першыя мураваныя замкі?
**4*.** Растлумачце выраз: «Замкі — дзівосныя помнікі мінуўшчыны».
**5.** Якія замкі Беларусі ўключаны ў спіс Сусветнай спадчыны?
**6*.** Ці будуюць у наш час замкі? Паразважайце, чаму.

**1.** Разгледзьце малюнак на с. 132. Назавіце галоўныя збудаванні старажытнага замка. Раскажыце пра прызначэнне кожнага з іх з дапамогай плана:

1) запоўнены вадою роў, што акружае замак;
2) сцены і вежы замка;
3) пад’ёмны мост і вароты замка;
4) замкавы двор і воіны — абаронцы замка;
5) палац князя;
6) прызначэнне пакояў (пакоі князя, замкавая турма, сховішчы і іншыя).



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**2.** Прадоўжыце сказы.

*Найбольш магутныя замкі ўзводзіліся на (…).*
*Самы прыгожы замак быў пабудаваны ў (…).*
*(…) замак вылучаўся суровым выглядам.*
*Як блізняты, выглядаюць замкі (…).*

Знайдзіце на палітыка-адміністрацыйнай карце на форзацы вучэбнага дапаможніка месцы, дзе знаходзяцца замкі. Пакажыце, дзе размешчаны гэтыя помнікі, у наступным парадку:

а) замкі-блізняты;
б) замак з цікавым мостам;
в) самы прыгожы і багаты замак;
г) замак, ад якога засталіся толькі руіны;
д) адноўлены замак, які мае суровы выгляд.

Наведайце з бацькамі ці класам замак у Міры, Нясвіжы ці Лідзе. Раскажыце пра свае ўражанні.

**1.** З далёкіх мінулых гадоў перадаюцца паданні аб тым, што ў падземных тайніках замкаў захаваны дзівосныя скарбы. Гавораць, што замкі злучаны паміж сабой падземнымі хадамі, у якіх блукалі людзі ў пошуках багацця. Трагічная гісторыя звязана з Крэўскім замкам. Князь Вялікага Княства Літоўскага Ягайла жадаў быць адзіным гаспадаром. Таму ён падманам пасадзіў у падзямелле замка свайго стрыечнага брата — князя Вітаўта. У замку Вітаўт знаходзіўся пад аховай вартаўнікоў. Яго жонцы стала вядома, што яго могуць знішчыць гэтак жа, як і бацьку Вітаўта — князя Кейстута. Кейстут быў задушаны ў замкавай турме па загадзе Ягайлы. Жонка дапамагла Вітаўту выратавацца з няволі. Яна прыйшла да яго разам са сваёй служанкай. У час сустрэчы Вітаўт пераапрануўся ў адзенне служанкі і разам з жонкай пакінуў замак. Калі вартаўнікі ўбачылі падмену, яны ад злосці забілі дзяўчыну-служанку.

А Вітаўт тым часам імчаў па дарозе на поўдзень ад Крэўскага замка. Паданне сведчыць, што дарога прывяла Вітаўта ў лясную вёску непадалёку ад Слоніма. Тут ён схаваўся ад пагоні. А пазней у знак удзячнасці мясцовым жыхарам за дапамогу Вітаўт загадаў


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

пабудаваць у вёсцы царкву. Так з’явілася ***Сынковіцкая царква-крэпасць***. Яна была адначасова храмам і абарончым збудаваннем. Сынковіцкая царква і дагэтуль зачароўвае людзей сваёй суровасцю і прыгажосцю.

**2.** Адноўленыя сцены старажытнага замка-крэпасці ўзвышаюцца на пагорку ў горадзе Лідзе. Прасторны двор замка, падземныя сутарэнні, магутныя падмуркі, сцены і вежы з вузкімі акенцамі-байніцамі нагадваюць пра даўнія часы. Па выбітай цаглянай лесвіцы можна падняцца на адну з вежаў. З яе як на далоні бачны ўвесь горад. Гэта і зразумела: на вежы ўдзень і ўначы стаялі вартавыя. Яны пільна сачылі за тым, каб у горад не трапілі ворагі. Сёння мноства турыстаў наведваюць Лідскі замак.

А вось назва горада Ліда ніяк не звязана з жаночым імем. У даўнія часы чалавек пад пасевы збожжа і сенажаць раскарчоўваў лясныя дзялянкі. Яны называліся лядамі. Вучоныя сцвярджаюць, што назва горада пайшла ад старажытнага слова «ляда». Напэўна, так яно і было. Бо вельмі ж шанавалася тут земляробства і агародніцтва. Пра гэта сведчыць нават герб Ліды 19 стагоддзя: на зялёным фоне — сноп і серп.



Сынковіцкая царква



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Але не толькі земляробчыя прылады былі знаёмы лідчанам. Не раз ім даводзілася абараняць горад са зброяй у руках. Таму ў развілцы рэк Лідзейка і Каменка, на высокім пагорку і пабудавалі замак. Магутныя сцены гэтай крэпасці служылі надзейным сховішчам для гараджан і жыхароў навакольных паселішчаў. У 1394 годзе жыхарам давялося спаліць горад, каб ён не стаў здабычай чужаземцаў. Самі ж яны схаваліся за сценамі замка. Дарэмна ворагі хацелі ўзяць яго прыступам: усе іх атакі былі адбіты.

## 34. Беларусь — краіна майстроў



Як называліся майстры, якія выраблялі розныя рэчы, неабходныя для чалавека?

З даўніх часоў на нашай зямлі жылі выдатныя майстры-рамеснікі. Беларусь называлі краінай майстроў.

Ужо ў тыя часы людзі не маглі абыходзіцца без ткацтва. Тканыя вырабы мелі важнае значэнне ў побыце, адзенні знаці, а таксама аздабленні маёнткаў. У 18 стагоддзі найбольш магутным цэнтрам ткацтва ў Беларусі стаў Слуцк. Там была заснавана майстэрня па вырабе паясоў. Спачатку ў ёй працавалі персідскія майстры. Яны перадалі свае веды мясцовым умельцам. Таму замест назвы «персідскія паясы» пачала ўжывацца назва ***«слуцкія паясы»***. Ткаліся яны з шаўковых, залатых і срэбных нітак.



Слуцкі пояс

Паясы дасягалі ў даўжыню ад двух да чатырох з паловай метраў. Яны былі такімі тонкімі, што іх можна было працягнуць праз пярсцёнак. Слуцкія ткачы ўнеслі ў малюнак паясоў узоры, што былі найбольш блізкія і родныя іх сэрцу. Гэтыя ўзоры ніколі не паўтараліся. Слуцкія паясы былі вядомыя ў многіх краінах свету. На ражку кожнага пояса з абодвух бакоў ткалася метка: «Слуцк», «зроблена ў Слуцку».



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Шматкаляровая кафля

Сёння ў Слуцку працуе фабрыка мастацкіх вырабаў. І на сучасных паясах можна ўбачыць малюнкі колішніх славутых паясоў. Слуцкія паясы даўно сталі скарбам беларускага народнага мастацтва. Некалькі з іх захоўваюцца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі.

Пачалі вырабляцца на нашай зямлі і тканіны. Сярод іх былі розныя віды шаўковых палотнаў. Яны аздабляліся шклярусам, бліскаўкамі, вышыўкай.

Добрыя майстры па вырабе дываноў працавалі ў Беларусі. Іх дываны праславілі Слонім, Карэлічы і іншыя беларускія гарады.

У 16 стагоддзі зарадзілася майстэрства вырабу шматкаляровай ***кафлі***. Гэта гліняная плітка, якая выкарыстоўвалася для абліцоўкі пячэй. Пазней з’явілася кафля з выявамі людзей, жывёл, родавымі гербамі заможных людзей. Беларускія рамеснікі, якія выраблялі кафлю, былі вядомы ў свеце і запрашаліся ў іншыя краіны. Захаваліся імёны выдатных майстроў Ігната Максімава з Копысі, Сцяпана Іванова з Мсціслава. Кафляй часта ўпрыгожвалі фасады цэркваў, магнацкіх палацаў. Таксама яе выкарыстоўвалі ва ўнутраным іх аздабленні.

Кафля выкарыстоўваецца людзьмі і сёння.

Высока цаніліся ў Беларусі і краінах свету шкляныя вырабы беларускіх майстроў. Іх выпускалі ў Налібоках, ва Урэччы, у Гародні і іншых месцах. Нашы майстры ўмелі рабіць да ста відаў розных рэчаў. Ва Урэччы ўпершыню ў Рэчы Паспалітай пачалі вырабляць люстэркі вельмі добрай якасці. Яны набылі вядомасць у розных краінах свету.

Захаваліся імёны некаторых з майстроў. Так, кубкамі гутніка Мікалая Дубіцкага ганарыліся князі Радзівілы з Нясвіжа.

Цяперашнія шкляныя вырабы завода «Нёман», што на Гродзеншчыне, таксама вядомы ў нас і за мяжой.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Шкляныя кубкі

Шмат хто з майстроў дасягнуў значных поспехаў у сваёй справе. Сярод іх былі і ювеліры. У многіх гарадах Беларусі дзейнічалі цэхі залатароў і сярэбранікаў, а колькасць майстроў дасягала 1700 чалавек. Асноўнымі замоўцамі залатароў з'яўляліся заможныя шляхціцы і царква.

1. Чаму Беларусь называлі краінай майстроў?
2. Дзе ў Беларусі была заснавана майстэрня па вырабе паясоў?
3. Як выглядаў слуцкі пояс?
4. Калі ў Беларусі зарадзілася майстэрства вырабу шматкаляровай кафлі?
5. Чым яшчэ славіліся беларускія майстры?

Даведайцеся ў старэйшых, ці былі ў вашай мясцовасці вядомыя майстры-рамеснікі. Чым яны праславіліся?

Пабывайце разам з бацькамі ці класам у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі ў Мінску. Раскажыце пра ўбачаныя там творы беларускіх майстроў.

**1.** Віленскі ваявода князь Радзівіл заснаваў у горадзе над ракой Случ фабрыку па вырабе паясоў. Яе называлі персіярняй, бо для работы на фабрыку ў Слуцк былі прывезены майстры з Персіі і Турцыі. Але іх не хапала. Тады да ткацтва паясоў сталі далучаць мясцовых умельцаў. Іх было нямала, таму што рамяство ткача са старажытных часоў шанавалася ў народзе. Кожны беларускі пан і селянін меў пояс. Пояс лічыўся адным з галоўных прадметаў у тагачасным адзенні. Па велічыні пояса і якасці нітак вызначалі заможнасць чалавека. У сялян паясы былі простыя, з лёну ці воўны. Шляхта насіла паясы з шоўку. Шоўк для паясоў прывозілі з Персіі ці Турцыі.

Ткачоў на фабрыку набіралі часцей з прыгонных сялян. Іх надоўга разлучалі з сем'ямі, з роднымі мясцінамі. Пра маладых ткачых паэт Максім Багдановіч пісаў так:



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Ад родных ніў, ад роднай хаты*
*У панскі двор дзеля красы*
*Яны, бяздольныя, узяты*
*Ткаць залатыя паясы…*



Талеркі Свержанскай мануфактуры

**2.** У Свержані (сучасны Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці) у 1742 годзе была заснавана фаянсавая мануфактура. Стварыў яе ўладальнік мястэчка Свержань, адзін з роду князёў Радзівілаў. Першыя майстры вучыліся рамяству ў Германіі. Гэта былі і ганчары, і жывапісцы. Выраблялі пераважна сталовы посуд, аздоблены дзівоснымі вывамі. Акрамя таго, мясцовымі майстрамі быў асвоены выраб дэкаратыўных куфэркаў, шкатулак, чарніліц. Па заказах навакольнай шляхты і магнатаў, а таксама на продаж майстры выраблялі фігуркі і бюсты. Карысталіся попытам пячная кафля, фаянсавыя алтары і многае іншае. Вырабаў Свержанскай мануфактуры да нашага часу амаль не захавалася.

## 35. Батлейка і прыгонны тэатр

1. Хто такія прыгонныя сяляне?
2. Хто такі Сімяон Полацкі? Чым ён знакаміты?
3. Хто са знакамітых людзей стварыў школьны тэатр, а потым з'явіўся заснавальнікам тэатра пры двары маскоўскага цара?

Відаць, многія з вас паспелі пабываць у лялечным тэатры. А ці ведаеце вы, як ён з'явіўся? Яго ўзнікненне звязана са старадаўнім народным лялечным тэатрам. Гэты тэатр зваўся **батлейкай**[1].

Батлейка на тэрыторыі Беларусі вядома з 16 стагоддзя. Часцей за ўсё батлеечныя паказы ладзіліся на калядныя святы. Што яны сабой уяўлялі?

Рабілася двухпавярховая вялікая скрынка ў выглядзе хаткі ці вясковай царквы. На кожным паверсе меліся бакавыя дзверцы, а цэнтральнае месца займала сцэна, якая нагадвала балкон. Адначасова ствараліся лялькі. Вопратку для іх шылі з тканіны. Валасы, бровы і вусы рабілі

[1] **Батле́йка** — беларускі народны лялечны тэатр.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Батлейка

з лёну ці аўчыны. Лялька насаджвалася на драўляны або металічны шпень, які рухаўся ў проразях у падлозе. У час паказу батлеечнікі праз дзверцы выводзілі лялькі на сцэну, вымаўлялі за іх словы. Побач музыканты ігралі на дудках, цымбалах, скрыпках, бубнах ці на гармоніках.

Галоўнымі героямі выступалі Баба, Цар, Анёл, Мужык, Каза, Мядзведзь. Тут можна было пабачыць і тых, каго ніколі не шанавалі ў народзе: гультая, злодзея, хітрага гандляра. А вобраз працавітага селяніна заўсёды ўспрымаўся гледачамі з сімпатыяй.

Батлеечнікі вандравалі па ўсёй краіне. Іх сустракалі як самых дарагіх гасцей. Асабліва радаваліся дзеці. Бо ў батлеечным тэатры было столькі казачнага і таямнічага. Звычайна батлеечнікамі станавіліся таленавітыя артысты-самародкі. Нярэдка батлеечнік быў не толькі адзіным выканаўцам, але і рэжысёрам, мастаком і музыкантам. З гадамі батлейка мянялася. Праз некаторы час у паказах сталі ўдзельнічаць не лялькі, а артысты. Яшчэ пазней на змену батлейцы прыйшлі прафесійныя тэатры.

У 16—18 стагоддзях існавалі невялікія тэатры пры школах. Потым, у 18 стагоддзі, у замках і палацах заможных людзей пачалі ўзнікаць ***прыватныя тэатры***. Такіх тэатраў у 18 стагоддзі было шмат. Найбольш вядомымі сталі тэатры Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку, Сапегаў — у Ружанах, Тышкевічаў — у Свіслачы, Агінскага — у Слоніме. Так, тэатр князёў Радзівілаў у Нясвіжы ўмяшчаў каля дзвюх тысяч гледачоў. Шырокую вядомасць у тыя часы меў Слонімскі тэатр Міхала Казіміра



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Агінскага. Сцэна гэтага тэатра была падзелена на дзве часткі. Па пярэдняй частцы можна было раз'язджаць на конях. Задняя частка магла запаўняцца вадой. Калі гэта было патрэбна, на сцэну выплывалі лодкі і нават караблі.

Існавалі таксама прыватныя тэатры ў Гродне, Магілёве, Чачэрску, Шклове і іншых гарадах. Музыкантамі, спевакамі, танцорамі ў гэтых тэатрах былі ў асноўным таленавітыя прыгонныя сяляне. Таму прыватныя тэатры называюць яшчэ ***прыгоннымі***.

Прыгонных акцёраў рыхтавалі спецыяльныя школы, якія існавалі амаль пры кожным тэатры. Утрыманне прыгоннага тэатра каштавала вялікіх грошай. Іх не хапала нават у самых багатых людзей, магнатаў. Таму прыгонныя тэатры ў Беларусі з цягам часу пачалі знікаць. Замест іх з'явіліся прафесійныя тэатральныя калектывы. А многіх таленавітых прыгонных акцёраў гаспадары прадалі ў тэатры Польшчы, Расіі і іншых краін.



Беларускія народныя музычныя інструменты



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**1.** Раскажыце, што такое батлейка.
**2.** Калі батлейка з’явілася на тэрыторыі Беларусі?
**3.** У якіх гарадах Беларусі існавалі прыватныя тэатры? Як яшчэ называюць такія тэатры?
**4.** Кім былі акцёры ў прыгонных тэатрах?
**5*.** Чаму батлеечнікі вандравалі па ўсёй краіне?

**1.** Прадоўжыце сказы, карыстаючыся тэкстам.
*У 16 стагоддзі пачалі стварацца невялікія (…).*
*Адным з такіх народных лялечных тэатраў была (…).*
*У 18 стагоддзі прыватныя тэатры ўзніклі ў гарадах (…).*
*Артыстамі ў такіх тэатрах былі ў асноўным таленавітыя беларускія (…).*
**2.** Дапоўніце схему. Тэатры былі:
а) школьныя;
б) … ;
в) … .
**3.** Вызначыце, колькі прайшло стагоддзяў з часу ўзнікнення:
а) батлейкі;
б) школьных тэатраў;
в) прыватных тэатраў.
**4.** Разгледзьце малюнак на с. 143 і адкажыце на пытанні.
Як называюцца гэтыя музычныя інструменты?
Ці ёсць сярод іх такія, што зараз не ўжываюцца?
Якія сучасныя музычныя інструменты не існавалі ў мінулыя часы?

Пакажыце на карце гарады Нясвіж, Слуцк, Слонім, Магілёў. Раскажыце, чым знакамітыя гэтыя гарады.

Даведайцеся ў старэйшых, ці існуе батлейка ў наш час.

Пабывайце ў лялечным тэатры. Раскажыце пра свае ўражанні.

**1.** На беларускай зямлі жылі і стваралі многія таленавітыя людзі. Пакінуў памяць пра сябе пляменнік Міхала Казіміра Агінскага — ***Міхал Клеафас Агінскі***. Ён вядомы найперш тым, што напісаў славуты музычны твор — ***паланэз «Развітанне з Радзімай»***. На-


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Міхал Клеафас Агінскі

ват і сёння гэта адзін з самых лепшых і папулярных музычных твораў ва ўсім свеце. Чаму гэты музычны твор мае такую назву?

Міхал Клеафас Агінскі быў патрыётам сваёй Радзімы. Ён хацеў бачыць яе незалежнай і самастойнай. Таму прыняў актыўны ўдзел у паўстанні. Але яно пацярпела паражэнне, і Міхал Клеафас вымушаны быў пакінуць Радзіму, выехаць за мяжу.

Праз некаторы час ён вярнуўся на Радзіму. Жыў у мястэчку Залессе каля Смаргоні. Тут і быў створаны паланэз «Развітанне з Радзімай».

Доўгі час паланэз быў гімнам горада Слоніма. Кожны дзень а шостай гадзіне раніцы гарадскі музыка ўзнімаўся на пажарную вежу і адчыняў усе вокны. Пасля браў у рукі трубу і граў паланэз «Развітанне з Радзімай». Сваю трубу ён накіроўваў спачатку на ўсход, затым на поўдзень, поўнач і захад. Такім чынам, паланэз-гімн было чуваць па ўсёй ваколіцы. Абавязкова паслухайце гэты музычны твор.

**2.** Са старажытных часоў нашы продкі навучыліся рабіць музычныя інструменты.

Спачатку людзі ўдарамі палачак адна аб адну адбівалі рытм сваіх першых танцаў. Затым чалавек выдзеўбаў паглыбленне ў кавалку дрэва і абцягнуў яго скурай. Так узнік бубен, які выкарыстоўваўся людзьмі ў многіх выпадках.

У трубчастых костках розных памераў свідраваліся адтуліны. Так рабіліся дудкі, або жалейкі.

Пазней з’явіліся дуда, ліра, скрыпка, кантрабас.

Многія з гэтых музычных інструментаў папулярныя і сёння. Разгледзьце іх на малюнку на с. 143 з дапамогай настаўніка.

**3.** У 1672 годзе пры двары рускага цара быў створаны тэатр. Ён знаходзіўся ў царскім палацы. Удзел у яго стварэнні прымаў Сімяон Полацкі. Сярод акцёраў тэатра было нямала беларусаў-перасяленцаў, якія скончылі спецыяльныя школы. Дэкарацыі, касцюмы для спектакляў стваралі беларускія рамеснікі. Найбольш вядомыя з іх — цясляр Фёдар Юр’еў з-пад Вільні, бондар Лявон Сцяпанаў з беларускага горада Асвея. Краўцамі працавалі больш за 25 чалавек са Шклова.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Паўтарэнне і абагульненне

1. Што вывучае гісторыя?
2. З якіх крыніц мы даведваемся пра жыццё людзей у далёкім мінулым?
3. У якіх установах захоўваюцца гістарычныя рэчы?
4. Што мы маем на ўвазе, калі гаворым пра нашу краіну, што яна — наша Радзіма, Бацькаўшчына?
5. Якія «сведкі» мінулага могуць расказаць нам пра гісторыю нашай краіны, вашага краю?
6. Пакажыце нашу краіну на школьнай карце Еўропы.
7. Адкуль пайшла назва нашай краіны?
8. Што абазначае гістарычная дата? Чаму трэба ведаць гістарычныя даты?
9. На якія пытанні трэба адказаць, каб ведаць і разумець гісторыю?
10. Калі на тэрыторыі Беларусі з'явіліся першыя людзі?
11. Чым кіраваўся першабытны чалавек пры выбары месца для сваіх паселішчаў? Як яны называліся?
12. Назавіце асноўныя прылады працы першабытнага чалавека. З чаго яны вырабляліся?
13. Назавіце асноўныя заняткі першабытнага чалавека.
14. Чым адрозніваліся заняткі мужчын, жанчын і дзяцей у старажытныя часы?
15. Калі на тэрыторыі Беларусі рассяліліся ўсходнеславянскія плямёны?
16. Якія ўсходнеславянскія плямёны з'яўляюцца продкамі беларусаў?
17. Раскажыце пра веру нашых далёкіх продкаў.
18. Чаму ў далёкім мінулым існавала мнагабожжа?
19. Як і для чаго ўзнік народны каляндар?
20. На якія святы ўшаноўваюць памяць нашых продкаў?
21. Як называліся першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі?
22. Хто стаяў на чале княства?
23. Што такое даніна? Хто збіраў, а хто плаціў даніну?
24. Што такое веча і для чаго яно існавала?
25. Які горад з'яўляецца самым старажытным? Вызначыце яго ўзрост.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**26.** Што такое хрысціянства?
**27.** Чым адрозніваюцца каталікі ад праваслаўных?
**28.** Назавіце імя першага гістарычна вядомага полацкага князя.
**29.** Пра якую полацкую князёўну кажуць, што яна пражыла сваё жыццё пад трыма імёнамі? Выберыце правільны адказ:
а) Рагнеда;
б) Ефрасіння Полацкая.
**30.** Чым вядомы ў гісторыі Усяслаў Чарадзей?
**31.** Якая мураваная пабудова з'яўляецца самай старажытнай на тэрыторыі Беларусі? Як яна называецца?
**32.** Якая рака на тэрыторыі Мінска звязана з гістарычным мінулым нашай Радзімы?
**33.** Чаму памяць пра Ефрасінню Полацкую ўшаноўваюць у Беларусі?
**34.** Хто такія асветнікі? Назавіце першых асветнікаў беларускай зямлі.
**35.** Чым праславіўся Кірыла Тураўскі?
**36.** Назавіце найбольш вялікія і ўрачыстыя беларускія святы. Раскажыце пра адно з іх (на выбар).
**37.** Што ўяўляў сабой старажытны горад? Раскажыце.
**38.** Што такое дзядзінец? Як ён выглядаў?
**39.** Хто жыў у старажытным горадзе?
**40.** Назавіце даты летапісных згадак Полацка, Турава, Мінска, Віцебска, Магілёва, Брэста, Гродна. Абазначце гэтыя даты і назвы гарадоў на «стужцы часу»:




**41.** Суаднясіце гарады з найбольш верагодным паходжаннем іх назваў.

| | |
|---|---|
| Полацк | бярозавая кара (бяроста) |
| Тураў | рака Менка |
| Мінск | «магіла льва» |
| Віцебск | князь Тур |
| Магілёў | рака Віцьба |
| Брэст | рака Палата |

**42.** Як тлумачыцца назва вашага населенага пункта?
**43.** Назавіце дзяржаву, якая ўзнікла на тэрыторыі беларускіх і літоўскіх зямель. Выберыце правільны адказ:


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

а) Полацкае княства;
б) Каралеўства Польскае;
в) Вялікае Княства Літоўскае.

**44.** Хто першым стаў на чале Вялікага Княства Літоўскага?

**45.** Які горад быў першай сталіцай Вялікага Княства Літоўскага? Выберыце правільны адказ:
а) Полацк;
б) Новагародак (Навагрудак).

**46.** Хто такі князь Вітаўт? Чым ён знакаміты?

**47.** Калі адбылася Грунвальдская бітва? У чым яе значэнне?

**48.** Як ажыццяўлялася кіраванне ў Вялікім Княстве Літоўскім?

**49.** Як называўся зборнік пісаных законаў Вялікага Княства Літоўскага? Хто быў складальнікам аднаго з яго выданняў?
а) Біблія, Францыск Скарына;
б) Статут, Леў Сапега.

**50.** Чаму Вялікае Княства Літоўскае аб'ядналася з Каралеўствам Польскім? Як называлася гэта дзяржава?

**51.** Калі была ўтворана Рэч Паспалітая?

**52.** Якія войны адбыліся на зямлі Беларусі ў 16—18 стагоддзях?

**53.** Хто такія прыгонныя сяляне?

**54.** Якія павіннасці выконвалі прыгонныя сяляне?

**55.** Чаму здараліся сялянскія паўстанні? Чым яны скончваліся?

**56.** Хто з'яўляецца беларускім першадрукаром?

**57.** Чаму мы ўшаноўваем памяць Францыска Скарыны і Сымона Буднага?

**58.** Чым праславіўся Сімяон Полацкі?

**59.** Што ўяўлялі сабою гарады і вёскі Беларусі ў 18 стагоддзі? Раскажыце.

**60.** Чым шляхецкія сядзібы адрозніваліся ад сялянскіх?

**61.** Назавіце самыя вядомыя замкі Беларусі. Што вы пра іх ведаеце? Раскажыце.

**62.** З дапамогай «стужкі часу» назавіце даты асноўных падзей, якія вам запомніліся.

**63.** Як называліся дзяржавы, у якіх жылі нашы продкі ў вывучаны вамі перыяд гісторыі?

**64.** Імёны якіх гістарычных асоб вам запомніліся? Назавіце.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Абагульненне гістарычнага матэрыялу па родным краі

Для кожнага чалавека гісторыя краіны неразрыўна звязана з гісторыяй таго месца, дзе ён нарадзіўся і жыве. На працягу года вы звярталіся да краязнаўчых матэрыялаў, наведвалі музеі, пазнаёміліся з гістарычнымі і культурнымі каштоўнасцямі вашай мясцовасці. Паспрабуем абагульніць нашы веды па гісторыі роднага краю.

**1.** Пакажыце на карце, дзе знаходзяцца вашы мясціны. Назавіце вобласць, населены пункт (горад, раён, вёска), геаграфічныя аб'екты (рака, возера).

**2.** Раскажыце, як звязаны геаграфічныя аб'екты з гістарычным мінулым.

**3.** Дзе знаходзіцца бліжэйшы гістарычны і краязнаўчы музей, у якім можна даведацца пра гістарычнае мінулае вашага краю? Ці былі вы там? Раскажыце пра свае ўражанні.

**4.** Назавіце бліжэйшае гістарычнае месца вашага краю. Раскажыце, з якімі гістарычнымі падзеямі яно звязана.

**5.** Якія гістарычныя помнікі захаваліся ў вашым краі? Аб якіх гістарычных падзеях яны распавядаюць?

**6.** Якія знакамітыя гістарычныя асобы праславілі ваш край?

7. Прадоўжыце рад слоў-сінонімаў:
*Радзіма, родны кут (...).*

**8.** Падрыхтуйце сумесна з усімі вучнямі класа і настаўнікам фотагалерэю «Наш край у фотаздымках»: маляўнічыя краявіды, славутыя месцы, людзі.

**9.** На «стужцы часу» адзначце з дапамогай настаўніка асноўныя гістарычныя падзеі, звязаныя з мінулым краю.

**10.** Зрабіце абагульняльны расказ пра ваш край з дапамогай плана і апорных слоў. Пачніце апавяданне са знакамітых слоў народнага паэта Беларусі Якуба Коласа: «Мой родны кут, як ты мне мілы...»
*Першыя звесткі аб паселішчах першабытных людзей (назва мясцовасці) адносяцца да (...).*
*Гэта месца старажытнымі людзьмі было выбрана таму, што (...).*
*Племя, якое насяляла нашу мясцовасць (назва мясцовасці), называлася (...).*



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

*Старажытныя людзі нашай мясцовасці (назва мясцовасці) займаліся (...).*
*Для заняткаў (пералік заняткаў) старажытныя людзі выкарыстоўвалі (пералік прылад працы і зброі).*
*З даўніх часоў у нашых мясцінах (назва мясцовасці) захаваліся «маўклівыя сведкі мінуўшчыны». Гэта (пералік).*
*Землі нашай мясцовасці (назва мясцовасці) уваходзілі ў княства (...).*
*Самым галоўным горадам княства быў (...).*
*Сёння гэты горад з'яўляецца (...).*
*Вядомы імёны князёў, што правілі на нашай зямлі. Гэта (...).*
*Наша мясцовасць (назва мясцовасці) у старажытныя часы мела наступныя збудаванні: (пералік).*
*Насельніцтва (назва мясцовасці) займалася (...).*
*Асаблівасцямі нашай мясцовасці (назва мясцовасці) з'яўляюцца (пералік: напрыклад, замак і г. д.).*
*Назва мясцовасці пайшла ад (...).*
*Праз нашу мясцовасць (назва населенага пункта) прайшлі (...) войны.*
*На гербе нашай мясцовасці (назва населенага пункта) адлюстравана (...).*
*Наша мясцовасць (назва населенага пункта) славутая знакамітымі людзьмі: (...).*
*Свой родны край (назва мясцовасці) я люблю і ганаруся ім.*

**11.** Падрыхтуйце паведамленне пра ваш сямейны радавод.

## Да вучняў

Вы загарнулі апошнюю старонку вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі». З яго дапамогай вы пазнаёміліся з найбольш аддаленым ад нас перыядам гісторыі нашай Радзімы. Пра тое, што было ў гісторыі Беларусі далей, вы даведаецеся ў наступных класах. Спадзяёмся, што вам спадабалася гэтая кніга і вы зацікавіліся новай для вас навукай — гісторыяй.

Не толькі вучоныя-гісторыкі, але і вы, вучні, можаце ўнесці ўклад у гэту цікавую навуку. Ці ведаеце вы гісторыю сваёй сям'і? Дзе і кім працуюць вашы бацькі, бабулі і дзядулі? А кім былі, як і дзе жылі бацькі вашых бабуль і дзядуляў? А хто былі і чым займаліся вашы больш


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

далёкія продкі? Гэта ж гісторыя вашай сям'і! Яе трэба ведаць і перадаваць будучым пакаленням. Так нашы нашчадкі змогуць даведацца пра час, у які зараз мы з вамі жывём.

Цікаўцеся таксама мінулым сваёй краіны, свайго роднага краю. Вы ўжо ўпэўніліся, што беларускі народ можа ганарыцца сваёй гісторыяй. Але ці ўсё мы ведаем з мінулага нашай Радзімы?

## ГІСТАРЫЧНЫ СЛОЎНІК

**Абра́д** — дзеянні людзей, у якіх выяўляюцца іх вераванні.

**Абра́з (іко́на)** — выява Бога, Маці Божай ці святых, якая служыць прадметам пакланення хрысціян.

**Анёл** — уяўны служыцель Бога, праз якога ён абвяшчае людзям сваю волю.

**Археало́гія** — навука, якая вывучае жыццё старажытных людзей па рэчавых рэштках іх жыцця і дзейнасці.

**Археóлагі** — вучоныя, якія вывучаюць жыццё старажытных людзей па прадметах побыту, знойдзеных у час раскопак.

**Асвéтнік** — чалавек, які займаецца пашырэннем адукацыі, пісьменнасці, кніжнай справы ў грамадстве.

**Аўтабіягра́фія** — апісанне чалавекам свайго жыцця.

**Барана́-сукава́тка** — прылада працы старажытнага чалавека.

**Батлéйка** — беларускі народны лялечны тэатр.

**Ба́цькаўшчына** — для кожнага чалавека краіна, дзе нарадзіўся ён сам і яго продкі.

**Бі́блія** — кніга, якая з'яўляецца Свяшчэнным Пісаннем для хрысціян.

**Бо́ндар** — рамеснік, які вырабляў бочкі, вёдры, дзежкі і разнастайны драўляны посуд.

**Бо́ртніцтва** — развядзенне пчол з мэтай атрымання мёду.

**Валу́н** — камень вялікіх памераў.

**Ве́жа** — высокае і вузкае абарончае збудаванне з дрэва ці цэглы.

**Ве́ча** — старажытны народны сход, які збіраўся для вырашэння важных пытанняў.

**Во́лат** — надзвычай дужы і высокі чалавек.

**Востраканéчнік** — каменная прылада працы з завостраным канцом.

**Вялі́кдзень** — свята Уваскрэсення Хрыста (Пасха).

**Гандля́р** — чалавек, які прадае розныя рэчы.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Гарадзі́шча** — старажытнае ўмацаванае паселішча.
**Гарпу́н** — востры зубчасты наканечнік.
**Герб** — распазнавальны знак дзяржавы, горада, роду або асобы.
**Гістары́чны музе́й** — установа, дзе захоўваюцца і выстаўляюцца для агляду розныя гістарычныя рэчы.
**Гісто́рыя** — навука, якая расказвае пра жыццё і справы нашых продкаў.
**Го́рад** — у старажытнасці вялікае паселішча, умацаванае валамі, равамі і сценамі.
**Гумно́** — памяшканне для захавання збажыны і сена.
**Дані́на** — падатак, які збіраўся князем з насельніцтва.
**Да́та** — час, калі адбылася падзея.
**Дзі́да (кап'ё)** — зброя старажытнага чалавека.
**Дзядзі́нец** — умацаваны цэнтр старажытнага горада.
**Дзяды́** — дзень шанавання памяці продкаў, які адзначаецца восенню.
**Дзяржа́ва** — саюз грамадзян, утвораны з мэтай абароны іх жыцця, свабоды, маёмасці.
**Дружы́на** — асабістае войска князя.
**Дрыгавічы́** — племя ўсходніх славян.
**Дубі́на** — старажытная зброя.
**Жывёлагадо́ўля** — гадаванне чалавекам свойскай жывёлы.
**Зако́ны** — дакументы, якія рэгулююць адносіны паміж дзяржавай і грамадзянамі або людзей паміж сабой.
**Збіра́льніцтва** — здабыванне старажытным чалавекам гатовых дароў прыроды.
**Земляро́бства** — апрацоўка зямлі і вырошчванне чалавекам культурных раслін.
**Кава́ль** — рамеснік, які вырабляў рэчы з металу (жалеза).
**Каля́ды** — зімовае беларускае народнае свята.
**Каме́нныя жо́рны** — прылада з двух абчэсаных камянёў для памолу мукі.
**Карале́ўства** — дзяржава на чале з каралём.
**Карчма́** — дом, прызначаны для харчавання, адпачынку і начлегу падарожнікаў.
**Ка́фля** — гліняны выраб для абліцоўкі і ўпрыгожвання печаў.
**Ке́лля** — асобнае памяшканне для манаха (манашкі).
**Клець** — памяшканне ў сялянскай сядзібе для захоўвання прадуктаў.
**Князь** — кіраўнік спачатку племені, а потым — княства.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Кня́ствы** — першыя дзяржаўныя ўтварэнні на чале з князем.

**Краязна́ўчы музе́й** — установа, дзе захоўваюцца і выстаўляюцца для агляду розныя гістарычныя рэчы таго краю, у якім яна знаходзіцца.

**Кро́сны** — ткацкі станок.

**Крывічы́** — племя ўсходніх славян.

**Крэ́мень** — карысны выкапень, які выкарыстоўваўся для вырабу прылад працы.

**Ку́зня** — майстэрня, дзе выраблялiся рэчы з жалеза.

**Культу́ра** — матэрыяльныя і духоўныя дасягненні людзей.

**Купа́лле** — летняе беларускае народнае свята.

**Купе́ц** — чалавек, які займаўся перапродажам розных тавараў.

**Курга́н** — земляны насып над старажытным пахаваннем.

**Ку́рная ха́та** — хата, якая абагравaецца печчу без коміна.

**Ку́фар** — драўляная скрыня.

**Ла́пці** — абутак, сплецены з лазовай ці ліпавай кары.

**Ледаві́к** — велізарныя рухомыя масы лёду.

**Ле́тапіс** — рукапісная кніга, у якой запісваліся звесткі пра гістарычныя падзеі па гадах.

**Лук** — старажытная зброя для палявання.

**Магна́т** — прадстаўнік найбольш багатай шляхты.

**Ма́мант** — вымерлая буйна́я жывёла, падобная да сучаснага слана.

**Манасты́р** — месца, дзе жывуць манахі або манашкі.

**Мана́х** (або **мана́шка**) — чалавек, які служыць Богу.

**Мнагабо́жжа** — вера ў шматлікіх багоў.

**Музе́й** — установа, дзе назапашваюцца, захоўваюцца і выстаўляюцца для агляду розныя прадметы (экспанаты).

**Мястэ́чка** — вялікая вёска з рысамі горада.

**Паві́ннасці** — праца ў панскай гаспадарцы за карыстанне зямлёй.

**Пада́нне** — апавяданне пра справы і ўчынкі старажытных людзей, пра заняткі нашых продкаў.

**Пада́так** — прадукты харчавання ці грошы, якія прыгонныя сяляне аддавалі свайму пану.

**Пакро́вы** — старажытнае свята заканчэння працы ў полі.

**Пала́ц** — вялікі шыкоўны будынак.

**Па́ншчына** — праца селяніна на панскім полі.

**Патрыёт** — чалавек, які любіць сваю Радзіму.



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Пле́мя** — аб’яднанне некалькіх родаў, якія жылі ў адной мясцовасці.
**Про́дкі** — людзі, ад якіх мы вядзём сваё паходжанне.
**Прыго́нны селяні́н** — чалавек, які трапіў у залежнасць ад гаспадара (пана).
**Пяру́н** — старажытны бог грому і маланкі.
**Ра́да** — вышэйшы дзяржаўны орган улады ў Вялікім Княстве Літоўскім.
**Ра́даўніца** — дзень шанавання памяці продкаў, які адзначаецца вясной.
**Радзі́ма** — месца, дзе нарадзіўся чалавек.
**Радзі́мічы** — племя ўсходніх славян.
**Раме́снік** — чалавек, які ўручную займаўся вырабам прылад працы, посуду, зброі і іншага.
**Ра́туша** — будынак, дзе размяшчаліся органы гарадскога самакіравання.
**Ро́давая абшчы́на** — група блізкіх сваякоў, якая вяла агульную гаспадарку і займала асобнае паселішча.
**Ры́цар** — чалавек, які належаў да землеўладальнікаў і займаўся ваеннай справай.
**Рэспу́бліка Белару́сь** — незалежная і самастойная дзяржава, якая абвешчана ў 1991 годзе.
**Сабо́р (храм)** — галоўная царква горада.
**Саха́** — прылада для апрацоўкі зямлі.
**Серп** — прылада працы для збору ўраджаю.
**Сі́мвал** — выява, якая служыць абазначэннем чаго-небудзь.
**Скрэ́бла, скрабо́к** — прылады працы першабытнага чалавека, якія выкарыстоўваліся для рэзання і скрабення.
**Сойм** — вышэйшы дзяржаўны орган улады ў Вялікім Княстве Літоўскім.
**Старэ́йшына** — кіраўнік роду.
**Стату́т** — збор законаў у Вялікім Княстве Літоўскім.
**Стая́нка** — неўмацаванае паселішча першабытных людзей.
**Сяля́нскае паўста́нне** — узброенае выступленне сялян супраць прыгнёту землеўладальнікаў.
**Усхо́днія славя́не** — плямёны, ад якіх пайшлі беларусы, украінцы, рускія.
**Фарфо́р** — посуд і іншыя вырабы з белай гліны.
**Фрэ́ска** — насценны роспіс.
**Хару́гва** — падраздзяленне войска ў Вялікім Княстве Літоўскім.
**Хрысція́нства** — вера ў адзінага Бога Ісуса Хрыста.
**Ца́рства** — дзяржава на чале з царом.
**Шля́хта** — частка заможнага насельніцтва Вялікага Княства Літоўскага.
**Э́ра** — вялікі гістарычны перыяд, які карэнным чынам адрозніваецца ад папярэдняга.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

# АСНОЎНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАТЫ

| | |
|---|---|
| **Больш за 30 тысяч гадоў назад** | З’яўленне на тэрыторыі Беларусі першабытных людзей |
| **9—12 стагоддзе** | Утварэнне Полацкага княства |
| **862 год** | Першая летапісная згадка Полацка |
| **10 стагоддзе** | Прыняцце хрысціянства |
| **974 год** | Першая згадка Віцебска ў летапісе |
| **980 год** | Першая летапісная згадка князя Рагвалода |
| **980 год** | Першая згадка Турава ў летапісе |
| **11 стагоддзе** | Княжанне Усяслава Чарадзея |
| **11 стагоддзе** | Будаўніцтва ў Полацку Сафійскага сабора |
| **1019 год** | Першая згадка Брэста ў летапісе |
| **Сакавік 1067 года** | Бітва на рацэ Нямізе. Першыя звесткі ў летапісе пра Мінск |
| **12 стагоддзе** | Жыццё і дзейнасць Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага |
| **1127 год** | Першая згадка Гродна ў летапісе |
| **1142 год** | Першая згадка Гомеля ў летапісе |
| **1161 год** | Выраб майстрам Лазарам Богшам крыжа Ефрасінні Полацкай |
| **13 стагоддзе** | Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага |
| **1237 год** | Згадка ў летапісах першага гістарычна вядомага навагрудскага князя Ізяслава |
| **1267 год** | Заснаванне Магілёва |
| **1323 год** | Перанясенне Гедымінам сталіцы княства з Навагрудка ў Вільню |



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

| | |
|---|---|
| **1345 год** | Пачатак кіравання Альгерда ў Вялікім Княстве Літоўскім |
| **1385 год** | Падпісанне Крэўскай уніі |
| **1390 год** | Атрыманне Брэстам права на самакіраванне |
| **1392 год** | Пачатак кіравання Вітаўта ў Вялікім Княстве Літоўскім |
| **15 ліпеня 1410 года** | Грунвальдская бітва |
| **1468 год** | Выданне Судзебніка |
| **1490 год** | Нараджэнне Францыска Скарыны |
| **6 жніўня 1517 года** | Выхад першай кнігі Францыска Скарыны. Пачатак кнігадрукавання ў Беларусі |
| **1529 год** | Прыняцце Першага Статута Вялікага Княства Літоўскага |
| **1558 год** | Пачатак Лівонскай вайны |
| **1562 год** | Выхад «Катэхізіса», надрукаванага Сымонам Будным у друкарні ў Нясвіжы |
| **1566 год** | Прыняцце Другога Статута Вялікага Княства Літоўскага |
| **1569 год** | Заключэнне Люблінскай уніі і ўтварэнне Рэчы Паспалітай |
| **1588 год** | Выхад у свет Трэцяга Статута Вялікага Княства Літоўскага |
| **1629 год** | Нараджэнне Сімяона Полацкага |
| **1654—1667 гады** | Вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай |
| **1700 год** | Пачатак Паўночнай вайны |


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## Змест

ПРАДМОВА ........ 3

УВОДЗІНЫ ........ 5
1. Гісторыя — навука пра мінулае ........ 5
2. Лічэнне гадоў у гісторыі ........ 9
3. Наша Радзіма на гістарычнай карце ........ 13

ПЕРШАБЫТНЫЯ ЛЮДЗІ НА БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ ........ 19
4. Першыя пасяленцы ў Беларусі ........ 19
5. Асаблівасці жыцця першабытных людзей ........ 22
6. Асноўныя заняткі першабытных людзей ........ 26
7. Рассяленне ўсходнеславянскіх плямён на тэрыторыі Беларусі ........ 30
8. Старажытныя вераванні ........ 37
9. Камяні і курганы — «маўклівыя сведкі мінуўшчыны» ........ 39

ПОЛАЦКАЕ І ТУРАЎСКАЕ КНЯСТВЫ ........ 44
10. Першыя дзяржаўныя аб’яднанні — княствы ........ 44
11. Полацк — самы старажытны горад Беларусі ........ 47
12. Прыняцце хрысціянства ........ 49
13. Славутыя імёны Полацкай зямлі. Князёўна Рагнеда ........ 53
14. Усяслаў Чарадзей ........ 56
15. Ефрасіння Полацкая ........ 60
16. Асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага ........ 64

СВЯТЫ Ў БЕЛАРУСІ ........ 69
17—18. Народны каляндар і паходжанне беларускіх святаў ........ 69

СТАРАЖЫТНЫЯ ГАРАДЫ БЕЛАРУСІ ........ 78
19. Узнікненне старажытных гарадоў, іх выгляд ........ 78
20. Жыццё і заняткі гараджан ........ 80
21. Адкуль пайшлі назвы беларускіх гарадоў ........ 83

ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ ........ 91
22. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага ........ 91
23. Вялікі князь Вітаўт. Грунвальдская бітва ........ 95
24. Статуты Вялікага Княства Літоўскага ........ 99



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

25. Утварэнне Рэчы Паспалітай ............................................. 102
26. Жыццё прыгонных сялян ................................................... 105
27. Войны на зямлі Беларусі, іх вынікі......................................... 108

**ПЕРШЫЯ ДРУКАВАНЫЯ КНІГІ ЯК ПОМНІКІ БЕЛАРУСІ**....... 111
28. Пачатак кнігадрукавання ў Беларусі. Францыск Скарына і Сымон Будны ................................................... 111
29. Развіццё адукацыі і мастацтва. Вучоны і асветнік Сімяон Полацкі.................................................................... 116

**ПАСЕЛІШЧЫ І ЖЫЦЦЁ СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСАЎ** .......... 119
30. Гарады і вёскі Беларусі ........................................................ 119
31. Сядзібы сялян, шляхты і гараджан ....................................... 124
32. Ежа, посуд і адзенне беларусаў у даўнія часы ...................... 127
33. Замкі Беларусі — дзівосныя помнікі мінуўшчыны .............. 131
34. Беларусь — краіна майстроў ................................................ 138
35. Батлейка і прыгонны тэатр ................................................... 141

**Паўтарэнне і абагульненне** ....................................................... 146

**Абагульненне гістарычнага матэрыялу па родным краі**........................ 149

**Да вучняў**........................................................................................ 150

**ГІСТАРЫЧНЫ СЛОЎНІК** ............................................................ 151

**АСНОЎНЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАТЫ** ......................................... 155



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

(Назва і нумар установы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Малчанава, Г. У.**
М20 Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. для 8-га кл. 1-га аддз-ня дапам. шк. з беларус. мовай навучання / Г. У. Малчанава ; пад рэд. В. А. Фядосіка. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2015. — 158 с. : іл.
ISBN 978-985-553-251-5.

**УДК 94(476)(075.4)**
**ББК 63.3(4Беи)я72**

Вучэбнае выданне

**Малчанава** Галіна Уладзіміраўна

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**

Вучэбны дапаможнік для 8 класа першага аддзялення дапаможнай школы
з беларускай мовай навучання

Рэдактары *Н. Б. Кучмель, Н. Г. Шчарбакова*
Дызайн вокладкі *Л. І. Мелава*
Мастакі *А. Г. Бушкін, Ю. В. Качаргіна*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка *Н. Я. Бацюковай*
Карэктары *Т. М. Булатава, В. М. Іваноў*

Падпісана ў друк 04.03.2015. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная № 1.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,41+0,29 форз. Ул.-выд. арк. 7,57+0,33 форз. Тыраж 787 экз. Заказ 58.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/159 ад 27.01.2014, № 2/63 ад 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

## ПАЛІТЫКА-АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ КАРТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

